І. Р. Вуглік

# Матэрыяльная культура і быт беларусаў у XVII–XVIII стст.



Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка»

***І. Р. Вуглік***

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І БЫТ БЕЛАРУСАЎ XVII—XVIII стст.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Мінск 2005

**УДК 392(476)**
**ББК 82(4.Беи)**
**В88**

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 6 ад 27.04.04)

*Рэцэнзент*
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі *А. І. Лакотка*

**Вуглік, І. Р.**
В88 Матэрыяльная культура і быт беларусаў XVII – XVIII стст. : вучэб.-метад. дапаможнік / І. Р. Вуглік. — Мн. : БДПУ, 2005. — 114 с.
ISBN 985-435-955-7.

У дапаможніку разглядаецца матэрыяльная культура і быт беларусаў часоў існавання Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай да яе падзелаў у канцы XVIII ст.

Дапаможнік уяўляе цікавасць для студэнтаў гістарычных факультэтаў, выкладчыкаў гісторыі, а таксама для ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі роднай культуры.

**УДК 392(476)**
**ББК 82(4.Беи)**

**ISBN 985-435-955-7**

© Вуглік, І. Р., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

# УВОДЗІНЫ

У дапаможніку разглядаецца матэрыяльная культура і быт беларусаў часоў існавання Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай да яе падзелаў у канцы XVIII ст. Храналагічна дадзены перыяд уяўляе сабой гістарычны этап, які характарызуецца тыпалагічна адметнымі кампанентамі палітычнага, эканамічнага, мастацкага, рэлігійнага і культурнага жыцця, што дае магчымасць ажыццявіць комплексны падыход да вывучэння гэтай эпохі. Метадалагічна гэты падыход увасоблены ў інтэрпрэтацыі матэрыялу ў кантэксце глабальных інтэграцыйных працэсаў у Беларусі і Еўропе, у культурную супольнасць якой уваходзіла культура айчынная, стыляў Рэнесансу, барока, ракако, Асветніцтва, сацыяльных, эканамічных адносін.

Згодна з гістарычнай і этналагічнай класіфікацыямі, матэрыяльная культура разглядаецца ў трох асноўных відавых праявах: жыллё, адзенне, ежа, а быт — у сямейным і грамадскім аспектах. За аснову падачы матэрыялу ўзяты менавіта формы матэрыяльнай культуры і быту, што дае магчымасць скласці ўяўленне аб іх характарыстыках у асноўных слаях тагачаснага грамадства: шляхты, сялянства, гараджан, местачкоўцаў.

Пад матэрыяльнай культурай разумеюцца матэрыяльна апрадмечаныя формы жыццезабеспячэння. Пад бытам — сфера пераважна будзённага, стабілізаванага жыцця. Сацыяльна апрабіраваныя, легітымныя формы быту называюцца бытавой культурай. Па сутнасці, быт — гэта комплекснае паняцце, якое ўключае не толькі кампанент пазавытворчай дзейнасці, але і святочнае жыццё, шэраг пераходных ад вытворчасці да быту з'яў, напрыклад хатнюю вытворчасць.

У даследуемы перыяд складана вылучыць «чысты» тып уласна бытавых паводзін. Так, жыццё вяскоўца было ў значнай ступені скіравана на вытворчую працу, нават у хаце было шмат працоўных заняткаў; уласна пазапрацоўнай сферай жыцця былі пераважна святы. Таму пры вывучэнні сялянскага быту ў асобным раздзеле даследуюцца традыцыйныя звычаі і абрады. Жыццё шляхціца, асабліва новай фармацыі — прыкладна з XVIII ст.,— наадварот, усё болей аддалялася ад вытворчай сферы, пераходзячы ў вобласць пачуццёва-забаўляльнага правядзення часу. Новая бытавая стылістыка вяла да рэзкага звужэння непасрэдна індывідуальна-працоўнага кола дзейнасці, калі бытавая культура рабілася культурай непасрэдна жыццёвай. І наадварот, павышэнне інтэлектуальных памкненняў шляхецкага жыцця на плыні Асветніцтва пераўтварала быт у перыяд творчай, асветніцкай, вытворчай працы, дзе вытворчае, творчае і бытавое знаходзіліся ў сімбіёзе. Спалучэнне матэрыяльнай культуры і быту тлумачыцца іх тыпалагічным адзінствам: быт з'яўляецца формай існавання сацыяльнай матэрыі і ўваходзіць у паняцце матэрыяльнай культуры.

Грамадства XVII—XVIII стст. было сацыяльна размежаваным, як і культуры шляхты, сялян, гараджан, якія мелі істотныя сістэмныя, якасныя адрозненні. Культуры шляхты і гараджан знаходзіліся ў кантэксце, адлюстроўвалі змены ў культурным жыцці Еўропы. Сялянская культура існавала ў рэчышчы традыцыяналізму, таго, што мы называем традыцыйнай культурай,— гістарычна кансерватыўнай, той, якая перадаецца ўнутры замкнёнага кола людзей у вуснай форме. Змены ў ёй адбываюцца павольна, пераважна ў сацыяльнай, канфесіянальнай абласцях, што адлюстравана ў дадзенай працы.

Дапаможнік ахоплівае дысцыплінарныя намінацыі гісторыі беларускай культуры, гісторыі Беларусі, культуралогіі.

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА

## 1. ЖЫЛЛЁ

### 1.1. Шляхецкае жыллё

Шляхецкае жыллё ў сваім культурным значэнні выходзіла за межы ўласна месцапражывання, дзе шляхціц і яго сям'я спалі, харчаваліся, бавілі час. Нягледзячы на тое, што шляхціц быў пераважна грамадскай асобай, жыллё займала ў яго жыцці асаблівае месца. Па-першае, як і ў еўрапейскіх дваран, яно было сімвалам асабістай недатыкальнасці і незалежнасці — дастаткова ўспомніць, што першыя віды заможнага феадальнага жылля былі ўмацаваныя — данжоны, замкі. Замкі, апошняя мяжа распаўсюджвання якіх праходзіла па ўсходніх межах Вялікага княства Літоўскага, сімвалізавалі ўласцівую для еўрапейскіх краін павагу да асобы феадальнага ўласніка, яго свабоду і недатыкальнасць, якія ў дачыненні да шляхецкага двара абараняліся каралеўскімі прывілеямі, артыкуламі Статута. Яшчэ адна культурная функцыя жылля — яго радавая рэпрэзентатыўнасць — г. зн. яно павінна было даваць уяўленне аб шляхетнасці ўладара, яго радаводзе, што здзяйснялася праз выявы продкаў на сармацкіх партрэтах, гербах, а таксама для тых, хто мог сабе дазволіць, на габеленах. Жыллё старабеларускай (ліцвінскай) шляхты знаходзілася ў кантэксце асноўных еўрапейскіх стыляў, архітэктурных і мастацкіх кірункаў. Разам з тым яно мела свой асаблівы каларыт, які адрозніваў яго ад жылля еўрапейскага дваранства. Яго ўнутранае аздабленне ў XVII—XVIII стст. (за выключэннем канца гэтага перыяду) не было падкрэслена шыкоўным, дамы не ператвараліся ў мастацкія музеі, як гэта было ў Францыі, Італіі, у пэўнай ступені ў Польшчы. Падаецца, што яно ўяўляла сінтэз паміж прагматычным функцыяналізмам і жыллёвай эстэтыкай.

У часы Рэчы Паспалітай адбыліся істотныя змены ў шляхецкім жыллі, звязаныя з павышэннем яго камфортнасці і паслабленнем абарончых функцый. З халодных абарончых збудаванняў феадалы перасяляліся ў пабудаваныя ўнутры іх ці нанава палацы, планіроўка і аздабленне якіх рабіліся больш камфортнымі. Асноўныя віды шляхецкага жылля той эпохі былі разнастайнымі і залежалі ад сацыяльнага статусу ўладальніка. Разам з тым у іх прасочваюцца агульныя рысы, якія адпавядалі агульнай еўрапейскай метакультурнай стылістыцы. Асноўныя тыпы жылля шляхціцаў — замкі (гэта старажытны тып жылля), а таксама палацы і сядзібы, якія разам з паркамі, гаспадарчымі, культавымі пабудовамі ўтваралі асобныя комплексы. Жыллё магло быць размешчана ў горадзе, побач з ім (замкі, палацы), сельскай мясцовасці (палац, сядзіба), мястэчку.

Гістарычна феадальнае жыллё часоў Рэчы Паспалітай можна падзяліць на перыяды: да першай паловы XVII ст., да першай паловы XVIII ст. і ад другой паловы гэтага стагоддзя; яго дынамічныя характарыстыкі звязаны з еўрапейскімі гісторыка-культурнымі стылямі: готыка, Рэнесанс, барока, класіцызм, у меншай ступені — ракако.

### 1.1.1. Замкі

У XVI ст. флагманам рэпрэзентатыўнага феадальнага жылля былі замкі — у першую чаргу прыватнаўласніцкія,— па-сутнасці ўмацаваныя магнацкія рэзідэнцыі, палацава-замкавыя ансамблі, неабходнасць у якіх была выклікана актыўнымі вайсковымі дзеяннямі, а таксама спецыфічным феадальным прыватнаўласніцкім менталітэтам. Жылыя памяшканні былі прадстаўлены размешчанымі ўнутры замкавых умацаванняў палацамі; як і ў старадаўнія часы, для жылля выкарыстоўваўся пэўны ярус замкавай вежы (Навагрудак, Любча). Замак феадала мог быць размешчаны ў горадзе і цэментаваць сістэму яго абароны, як гэта было з пачатку XVII ст. у Старым Быхаве, Магілёве, Гародні. Рэзідэнцыя феадала была адным з галоўных цэнтраў старажытнага беларускага горада. Таксама замкі будаваліся побач з горадам, утвараючы асобны абарончы комплекс, слаба, але звязаны з ім (як гэта было ў Любчы, Нясвіжы), ці лакалізаваліся асобна (Мір, Геранёны). Калі замкі размяшчаліся ў невялікіх прыватнаўласніцкіх гарадах, пояс абарончых збудаванняў вакол горада мог адсутнічаць (Ляхавічы, Слонім). Замкі мелі традыцыйную адначасткавую планіровачную сістэму, ці складаліся з некалькіх частак — Верхняга і Ніжняга замкаў, як у Полацку, Слуцку, ці Віцебску, які ўвогуле меў тры замкавыя комплексы. Замкі гэтага часу былі пераважна драўлянымі (гэта тычылася перш за ўсё ўсходняй часткі Беларусі), але ўсё часцей іх канструкцыі спалучалі камень і дрэва, ці першы цалкам замяшчаў другое. Сярод старажытных драўляных замкаў XVI—XVII стст. можна адзначыць Барысаўскі, Верхні ў Полацку, Радашковіцкі. Яны мелі рэгулярныя планы, у Барысаве меўся палац. Каменнае абарончае дойлідства мае старажытныя традыцыі на захадзе Беларусі. Найбольш старажытныя з умацаванняў — Лідская (жылыя пабудовы былі зроблены ўнутры з дрэва), Крэўская, Навагрудская (жылыя пабудовы былі ўнутры, таксама, магчыма, у галоўнай вежы) крэпасці. Асобна трэба адзначыць Стары замак у Гародні, дзе да перабудовы канца XVI ст. меўся гатычны двухпавярховы палац. Пасля істотнай перабудовы ў стылі Рэнесанс па праекце італьянца Скота замак ператварыўся ў дварцова-палацавы комплекс, у цэнтры якога размяшчаўся двухпавярховы каралеўскі палац з асіметрычным планам памяшканняў і каралеўскімі пакоямі, аздобленымі шліхтаваным гіпсам, а таксама кафляй. Адзін з найбольш значных замкава-палацавых комплексаў — Мірскі — увасабляе базавую мадэль гэтага тыпу пабудоў — магутныя ўмацаванні спалучаюцца з камфартабельным трохпавярховым палацам. Замак спа-

лучае архітэктуру готыкі і пазнейшую, рэнесансную, у якой пабудаваны і палац. Ухіл у абарончую моц — крэпасць з валамі і вежамі — дэманструе дварцова-замкавы комплекс XVI ст. у Геранонах. У 1583 г. пачалося будаўніцтва мураванага замка ў Нясвіжы, якое вёў італьянец Джавані Марыя Бернардоні. Пабудаваны ў тагачаснай сістэме новаітальянскай фартыфікацыіі, замак спалучаў стылістыку позняга рэнесансу і ранняга барока. У замку адсутнічалі знешнія сцены і вежы, што спрыяла яго развіццю ў напрамку палаца і адпавядала галоўнай тэндэнцыі тагачаснай дынамікі замкавага будаўніцтва. Асобна трэба адзначыць дом-крэпасць у Гайцюнішках (Гродзеншчына), пабудаваны галандцамі Пятром Нонхартам і Ван Додэнам у пачатку XVII ст. Жылыя памяшканні ўладара размяшчаліся на другім паверсе, а таксама ў ярусе цэнтральнай вежы. Адносна невялікія па памерах і моцы сцены і вежы меў замак першай паловы XVII ст. у Гальшанах (Гродзеншчына). Жылыя памяшканні ішлі ўздоўж унутранага боку сцен. Такім чынам, у XVIII ст. замак як умацаванне, абарончая пабудова саступае месца палацу, палацаваму комплексу, дзе на першае месца выходзяць не абарончыя, а жыллёва-камфартабельныя, эстэтычныя патрабаванні. Пераемнасць паміж імі хіба ў тым, што палацы будаваліся на месцы старых замкаў — як у гарадах, так і за іх межамі. Як і раней, палацы і сядзібы размяшчаліся як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці.

### *1.1.2. Палацы і вялікія сядзібы*

Шляхецкае жыллё рознілася па відах у залежнасці ад заможнасці гаспадара: гэта мог быць вялікі мураваны палацавы комлекс, палац параўнальна невялікіх памераў, які ў асноўным будаваўся з дрэва, сядзіба з невялікай колькасцю памяшканняў, жыллё малазаможнага шляхціца. У XVII—XVIII стст. гэтая дыферэнцыяцыя паглыбілася ў сувязі з працэсам маёмаснага расслаення шляхты — жорсткай дыферэнцыяцыі магнатэрыі, заможнай, сярэднезаможнай і беднай, шарачковай шляхты. Акрамя гэтага, пашырыўся функцыянальны дыяпазон маёнткаў: гэта магло быць месца сталага, асноўнага пражывання гаспадара і яго сям'і, а таксама адна з рэзідэнцый магната ці гаспадарчы, адміністрацыйны цэнтр уладання (у тым ліку і гарадскі), якія пачалі хутка множыцца ў сувязі з усталяваннем фальварачнай сістэмы, а таксама развіцця буржуазнай вытворчасці. Увогуле для XVII і асабліва XVIII ст. было характэрна паступовае нарастанне будаўнічай актыўнасці, што было звязана з агульнай інтэнсіфікацыяй культурнага жыцця Рэчы Паспалітай пад уплывам еўрапейскіх плыней асноўных гісторыка-культурных стыляў той эпохі — барока і класіцызму. У гэты час былі пабудаваныя такія выдатныя помнікі палацавай архітэктуры, як каралеўскі палац (Новы замак) у Гародні (1740—50 гг.), палац А.Тызенгаўза ў Гародні (1760—70 гг.), палац у Ружанах (Брэстчына, другая палова XVIII ст.), у гэты час быў дабудаваны славуты Нясвіжскі замак і г. д. У архітэктуры і мастацтве Беларусі XVII —

першай палове XVIII ст. дамінуючым кірункам у архітэктуры было барока, з другой паловы XVIII ст. яно пачало саступаць месца класіцызму. Для розных тыпаў шляхецкіх сядзіб і ў першаю чаргу палацаў асноўныя мадэльныя планіровачныя прынцыпы вызначаў стыль барока. Пабудовы рабіліся П-падобнымі ў плане, для іх была ўласціва анфіладная ўнутраная планіроўка, галоўны акцэнт рабіўся на вылучэнні цэнтральнага аб'ёму, згодна з эстэтыкай барока іх дахі былі складанай формы, фасады дэкаратыўна аздобленыя. Будынак фарміраваўся вакол адкрытага параднага двара — курданера. Бакавыя крылы размяшчаліся як перпендыкулярна ў адносінах да асноўнага корпуса, як гэта было ў палацах у Ружанах, Шчорсах (Гарадзеншчына), Новым замку ў Гародні, так і пад вуглом, як у палацах Бутрымовіча ў Пінску, Тызенгаўза ў Гародні. Паўсюднае развіццё атрымалі ў гэты час, спачатку ў манументальных палацах, а потым шырока ў драўляных сядзібах і палацах, алькежы — бакавыя вуглавыя прыбудовы, якія маглі быць аздоблены вежамі. Разам з тым паступова ў мураваным палацавым дойлідстве іх замянілі флігелі, з якімі асноўны корпус злучаўся галерэямі з каланадамі, аркадамі, як гэта было ў палацах у Свяцку (каля Гародні), Ружанах. Яшчэ адной разнавіднасцю барочнай планіроўкі з курданерам была наяўнасць асобна размешчаных, вынесеных наперад двух флігеляў, не злучаных з асноўным корпусам, — сядзібы ў Дзярэчыне, Варнянах, Станіслававе, Аўгуставе (Гарадзеншчына), Дуброўне, Леанпалі (Віцебшчына), Петрыкаве (Гомельшчына) і інш. Франтальная вобласць палацаў звычайна аздаблялася рызалітамі — часткамі будынкаў, што выступалі за мяжу фасада на ўсю яго вышыню. Звычайна фасад асноўнага аб'ёму меў тры рызаліты — высокі цэнтральны і два бакавых (палацы ў Дзярэчыне, Гануці на Міншчыне, Леанпалі) ці, радзей, адзін цэнтральны (сядзіба Татары на Магілёўшчыне). Рызаліты мелі прамавугольную форму, аднак маглі быць паўкруглымі ці гранёнымі — сядзіба Шчорсы, Кахановічы (Віцебшчына), Станіслававa. У кампазіцыйным цэнтры будынка знаходзіўся франтон — завяршэнне фасада будынка, рызаліт, які размяшчаўся вышэй карніза і па-барочнаму пышна ўпрыгожваўся ляпнінай — картушамі, геральдычнай сімволікай. Яшчэ адзін элемент фасада, які акцэнтаваў яго цэнтральную частку, — балкон ці порцік (частка будынка, якая ўтвараецца з дапамогай калон, слупоў, арак, што трымаюць на сабе перакрыцце). Для палацаў і сядзіб Беларусі былі характэрны як дэкаратыўныя, так і функцыянальныя балконы і порцікі, неабходнасць якіх тлумачылася наяўнасцю на другім паверсе вялікай залы. Палацы звычайна былі двух- ці трохпавярховыя, і гэты падзел на паверхі падкрэсліваўся архітэктурнымі элементамі. Дах вырашаўся ў стылістыцы барока — меў тыповы мансардны злом. У палацы ўваходзілі па вялікай прыгожа аздобленай лесвіцы. Абавязковай часткай будынка былі падвальныя складскія, гаспадарчыя памяшканні. Да пачатку XVIII ст. драўляныя дамы (і гаспадарчыя пабудовы) розных па заможнасці шляхціцаў будаваліся на падклецці — ніжнім нежылым паверсе, але потым яно змянілася скляпамі і

падмуркамі. Унутраная планіроўка мела цэнтрычна-восевую кампазіцыю, цэнтрам якой былі вестыбюль, парадная лесвіца і цэнтральная зала часцей за ўсё авальнай (Новы замак у Гародні, палацы ў Нясвіжы, Пінску) ці круглай, а таксама шматграннай формы. Вялікія палацы мелі некалькі залаў, кожная з якіх мела сваё тэматычнае аздабленне. Так, у Нясвіжскім замку было дванаццаць вялізных залаў, дзе размяшчаліся партрэтная і карцінная галерэі, бібліятэка, калекцыі еўрапейскай, а таксама ўсходняй (кітайскай, японскай, арабскай) зброі, манет, медалёў, багатая мэбля. Пакоі размяшчаліся па анфіладнай сістэме — г. зн., яны прылягалі адзін да аднаго, а іх дзверы знаходзіліся на адной восі і, такім чынам, пры адчыненых дзвярах утваралася скразная, барочная перспектыва інтэр'ераў будынка. Палацы ўяўлялі сабой адзіныя комплексы жылых і гаспадарчых памяшканняў, якія да канца XVIII ст. адасабляліся яшчэ параўнальна слаба. Галоўнае месца займаў другі паверх, дзе размяшчаліся парадная зала, жылыя і гаспадарчыя памяшканні. Апошнія былі адасоблены ад цэнтральнага аб'ёму і размяшчаліся ў бакавых флігелях — афіцынах.

Істотная ўвага надавалася інтэр'еру, у першаю чаргу прадстаўнічых памяшканняў — парадных залаў. Іх асноўныя прынцыпы зыходзілі з ідэі шляхецкага гонару, культу рода, а таксама спалучаліся з эстэтыкай барока, з яе ідэяй сінтэзу мастацтва, спалучэння жывапісу, каларызму з пластыкай, архітэктурай. Адсюль яскравая каларыстычная гама, якая забяспечвалася маляўнічай апрацоўкай сцен і столі. Сцены звычайна абцягваліся каштоўным палатном розных колераў — адамаскам, аксамітам, вялюрам. Таксама выкарыстоўваліся шаўковыя, палатняныя шпалеры, габелены. Дамінуючымі колерамі былі блакітны, жоўты, зялёны, а таксама змешана-пераходныя: перламутравы, пастэльны. Гэтая каларыстычная гама дапаўнялася фрэскамі, жывапіснымі малюнкамі, карцінамі ў барочных рамах. Акрамя сцен, жывапісна афармляліся плафоны. Шырокае выкарыстанне жывапісу мела месца ў палацы Тызенгаўза і Новым замку ў Гародні, палацах у Свяцку, Бяльмонтах (Віцебшчына). Арнаментыка мела ў асноўным раслінны характар. Таксама шырока ўжывалася пластыка — скульптура, ляпніна, разьба. Для набыцця барочных эфектаў выкарыстоўваліся люстэркі, мармур, крышталь у спалучэнні з пазалотай. Асобна трэба адзначыць аздабленне пячэй, для якіх выкарыстоўвалася спецыяльная славутая беларуская паліваная кафля. Печы былі досыць вялікіх памераў, на іх маглі размяшчацца гербы ўладароў. Акрамя пячэй, шчодра ўпрыгожваліся і каміны. Дапаўнялі барочны інтэр'ер вялікія вертыкальныя прамавугольныя вокны з белым шклом. У выніку інтэр'ер уяўляў сабой каларыстычна насычаную сінтэтычную барочную кампазіцыю, дзе часта ў ілюзорнай перспектыве злучаліся жывапіс і пластыка. Мэбля была стылістычна звязаная з культурамі рэнесансу, барока і, з канца XVIII ст.,— класіцызму і ампіру. Сярод яе відаў можна адзначыць розныя па памерах сталы, крэслы, канапы, стулы, лавы, зэдлі, куфры, шафы, ложкі. Паступова адыходзілі лавы,

таксама куфры замяняліся шафамі, уваходзілі ў моду табурэткі, буфеты для посуду. Асноўны кірунак гэтай эпохі — барока вызначаў для мэблі выгнутыя, мяккія формы, асабліва ножак; яна робіцца больш утульнай, мэбля для сядзення часта аббіваецца дарагімі тканінамі, з'яўляюцца гарнітуры як комплекс прадметаў, што стасуюцца адзін да аднаго. Цэнтральнае месца ў інтэр'еры займаў ложак, які ператвараўся ў пышна драпіраваны шацёр. На ранніх іканапісных выявах XVII—XVIII стст. з беларускіх зямель мы бачым вялікія рэнесансныя прамавугольныя ложкі з прыступкамі і балахонамі, пазней прыступкі знікаюць, над ложкам з'яўляецца папулярны ў Еўропе ламбрэкен — цяжкі папярочны падвес. Узгалоўе ложкаў высокае, прамое. Шырока распаўсюджваюцца падушкі, пярыны. Пакоі асвятляліся люстрамі — падвешанымі да столі і, пазней, насценнымі з люстэркамі, падсвечнікамі. З XVII ст. часткай інтэр'ера пачалі рабіцца гадзіннікі. Абавязковым элементам аздаблення сцен былі сармацкія партрэты гаспадароў і іх продкаў, для якіх магла вылучацца асобная зала. Прыкладна з другой паловы XVIII ст. побач з радавымі партрэтамі распаўсюдзілася мода на партрэты славутых, каранаваных асоб.

Як ужо адзначалася, асноўныя гаспадарчыя пабудовы размяшчаліся ў бакавых флігелях — афіцынах. Там былі кухня, амбар, адміністрацыйныя памяшканні, канюшні, аранжэрэі. Акрамя гэтага, меўся комплекс асобных гаспадарчых пабудоў, сярод якіх вылучаліся разнастайныя тыпы амбараў — яны служылі для захоўвання маёмасці, харчавання, мелі жылыя памяшканні і называліся лямусамі, свірнамі, клецямі, спіхлерамі. Шырока распаўсюджаны былі лямусы, дзе захоўваліся прадукты, каштоўная маёмасць, зброя і дзе жылі летам. Гэта былі вялікія па памерах, звычайна двухпавярховыя будынкі (былі адна- і трохпавярховыя) з арачнымі слупавымі галерэямі. Яны мелі прамавугольны ці квадратны план і адпаведна франтальную (уздоўж адной са сцен) ці абходную (уздоўж усяго лямуса) галерэю. Два паверхі, таксама ганак і галерэю мог мець і свіран — памяшканне, дзе захоўвалася пераважна збожжа, а таксама вялікі свіран — спіхлер. Больш шматфункцыянальнай у параўнанні са свірнам была клець. Акрамя гэтых гаспадарчых пабудоў, можна вылучыць варыўні — будынкі для зімовага захоўвання садавіны, гародніны, малочных прадуктаў; шопы, дзе захоўваліся сена, дровы, інвентар; хлявы, стайні (там стаялі коні), звычайна з вазоўнямі для экіпажаў, маштарнямі (памяшканнямі для конюхаў і рамонту экіпажаў); гумны (стадолы), клуні (невялікія гумны); адрыны для захавання сена, саломы, пуні (маленькія адрыны); бровары (там рабілі піва, іншыя хмяльныя напоі, радзей гарэлку); капцільні, кузні, алейні, лазні, а таксама ветраныя ці вадзяныя млыны і іншыя пабудовы.

Уязджалі ў палац праз вароты, якія размяшчаліся насупраць цэнтральнага аб'ёму (Ружаны, Шчорсы, Новы замак у Гародні) і маглі суправаджацца загародамі. Вароты маглі ўяўляць сабой пілоны (масіўныя слупы, якія стаялі абапал уезда), як гэта было ў Новым замку ў Гародні, палацах у Альбе (каля Нясвіжа), Свяцку, Шчорсах, Давід-Гарадку.

Пераважна ў старажытныя замкі ўваходзілі праз браму (Нясвіж, Петрыкаў, Ніжні замак у Слуцку). Дарога да палаца звычайна абсаджвалася дрэвамі.

З другой паловы XVIII ст. пад уплывам класіцызму, а таксама агульных тэндэнцый да паляпшэння камфортнасці будынка, яго функцыянальнасці ў яго архітэктуры адбываюцца пэўныя змены. Гэта праявілася ў палацах Агінскага ў Слоніме, Сапегі ў Дзярэчыне (Гарадзеншчына), Валіцкага ў Гародні. Для іх было ўласціва выкарыстанне архітэктуры класіцызму, а таксама ампіру— ясных, лаканічных форм і аб'ёмаў. Усё часцей усе асноўныя аб'ёмы будынка — цэнтральны, флігелі, галерэі — будуюцца ў адну лінію — кампазіцыя робіцца адчыненай, а план будынка — прамавугольным. Абавязковым прыёмам выдзялення галоўнага аб'ёму з'яўляўся порцік з каланадай дарычнага ці тасканскага, у меншай ступені — іянічнага і карынфскага ордэраў. Мяняецца і форма даху — мансардны дах з заломам замяняецца простым двухсхільным. Флігелі часцей будуюцца асобна, выносяцца наперад. Па-іншаму пачынае афармляцца і прастора двара — у цэнтры яго робіцца адкрыты газон. У планіроўцы назіралася спалучэнне анфіладнай і калідорнай сістэм, а таксама больш істотны падзел на жылыя і падсобныя памяшканні, прычым відавая колькасць апошніх пашырылася: узніклі кафейная, гардэроб, алькоў, лакейская і інш. Часам парадную залу пераносілі на першы паверх. З другой паловы XVIII ст. пры палацах і сядзібах пачалі будаваць хатнія часоўні, як гэта было ў сядзібах Дудзічы, Людвінава, Высокае (Брэстчына) і інш. Памяняліся і склад, і лакалізацыя гаспадарчых будынкаў. Пад уплывам развіцця буржуазных адносін пры маёнтках пачалі будавацца мануфактуры, заводы; гаспадарчыя будынкі ўсё часцей адасабляюцца ў асобны ад асноўнага корпуса палаца ці сядзібы комплекс.

### *1.1.3. Сядзібы*

Эпахальныя стылістычныя змены, якія яскрава адбіліся на абліччы магнацкіх палацаў, параўнальна слаба закранулі сядзібы сярэдне- і малазаможных шляхціцаў. Яны традыцыйна рабіліся з дрэва і ўключалі асноўны будынак — жылы дом (вялікі дом называўся рум), свіран, клець (пазней яны пачалі выносіцца наперад), лазню, з імі побач — двор, а таксама асобны гаспадарчы комплекс. Як ужо адзначалася, усё будавалася з дрэва, за выключэннем падмуркаў і скляпоў асноўнага дома. Сцены дома абшываліся дошкамі, маглі абмазвацца глінай; з канца XVIII ст. атрымала распаўсюджанне імітацыя каменнай кладкі драўлянай разьбой. Страха крылася дранкай (колатай дошкай), гонтам (спецыяльнымі дошчачкамі). У XVI — пачатку XVII ст. кожная частка, зруб дома маглі мець свой дах, і дом, такім чынам, быў шматдахавы. Па форме дах быў двухсхільны, чатырохсхільны, з XVIII ст. з'явіліся характэрныя заломы. Перад уваходам быў ганак на слупах, з двухсхільным дахам. З другой паловы XVIII ст. пад уплывам класіцызму амаль паўсюдна ўваход выдзяляўся

порцікам, звычайна з чатырма калонамі. З XVII ст. актыўна пачалі распрацоўвацца верхнія паверхі дамоў, дзе рабіліся капліцы, жылыя памяшканні, нават залы. Планіроўка дома ішла ад старажытнага двухкамернага жылля да трохкамернага з сенцамі ў цэнтры і дзвюма ізбамі абапал да больш складаных планіровак праз далейшае дзяленне і ўскладненне гэтых асноўных частак. Жылыя цёплыя памяшканні-святліцы робяцца заламі, спальнямі, пры іх утвараюцца бакавыя каморы, алькежы, аддзяляюцца туалеты. Сенцы і жылыя памяшканні дзеляцца на каморы, пякарню (месца, дзе выпякалі ў глінабітнай печы хлеб), кухню. У выніку ўтвараліся асіметрычныя ці сіметрычна-анфіладныя планіроўкі пакояў, якія пераважалі ў дадзены перыяд. Асіметрычныя планіроўкі звязаны з падзелам памяшкання на парадную і жылую, гаспадарчую і жылую часткі. Дзверы былі пераважна сталярнага вырабу з жалезнымі завесамі, зашчэпкамі, часта замкамі, маглі аздабляцца разьбой, роспісам. Вокны былі заўсёды са шклом, часта на жалезных завесах, з двухстворкавымі стаўнямі. Паступова алавяныя, жалезныя, свінцовыя рамкі замяняліся больш таннымі драўлянымі. Сцены вычэсваліся, абклейваліся палатняным з роспісам або рознакаляровым сукном, шпалерамі ці проста бяліліся. Папяровыя шпалеры, як больш танныя, увайшлі ў моду пазней, у адносна заможных гаспадароў яны ўжываліся ў падсобных памяшканнях. Падлога даглядалася, у XVIII ст. яе васкавалі. Панэлі ці столь маглі быць разнымі. На сценах віселі падвесныя паліцы — ліштвы. Ацяплялі жылыя пакоі высокія кафляныя печы, часта паліхромнай ці рэльефнай кафлі пераважна зялёнага колеру. Мэбля складалася з лаў, сталоў, зэдляў, крэслаў, шафаў, куфраў.

У цэнтры гаспадарчага ці гаспадарчых комплексаў знаходзілася гумно, а таксама абора — шэраг хлявоў. Каля гумна і ў ім былі пабудовы, звязаныя з сушкай, малацьбой, захоўваннем прадуктаў апрацоўкі збожжа: асець (ёўня), азяроды, ток, адрына, пуня, плеўнікі (для захоўвання мякіны) і інш. У суседні комплекс уваходзілі шопы, малыя клеці, пуні і інш. Асобна маглі рабіцца паляўнічыя двары, комплексы, звязаныя з бровaрам, млынам. З канца XVI ст., пасля правядзення валочнай рэформы, гаспадарчы комплекс канчаткова вылучыўся ў фальварак, дзе жылі дваровыя працаўнікі. Двор акружаўся разнастайнай па відах агароджай — заметамі, агароджамі з дыляў (расколатых уздоўж бярвенняў), жэрдак і інш. Цэнтральны ўезд, размешчаны насупраць дома, а таксама, калі меліся, іншыя адзначаліся варотамі ці брамамі. Каля дома былі невялікія агароды, раслі дрэвы, што маглі ўтвараць алеі.

### *1.1.4. Садова-паркавае мастацтва*

З канца XVII ст. у Беларусі пачало актыўна развівацца садова-паркавае мастацтва і шляхецкія маёнткі пераўтвараліся ў сядзібна-паркавыя комплексы. Пад уплывам пераважна французскага паркавага мастацтва на нашых землях распаўсюдзіўся тыповы для Еўропы рэгулярны

«французскі» парк, узорам якога быў палацава-паркавы комплекс у Версалі. Для парку гэтага тыпу ўласціва строгая геаметрычная планіроўка — прамыя алеі арганізаваны па веерным ці прамавугольным прынцыпе, геаметрычна апрацаваная прырода — падстрыжаныя ў прамавугольнай, шарападобнай ці пірамідальнай форме расліны. Усё гэта адпавядала, нібы працягваючы, анфіладнай планіроўцы пакояў палацаў і сядзіб. Гэты геаметрызм спалучаўся з водным асяроддзем — фантанамі, басейнамі, а таксама скульптурамі, трэльяжнымі альтанкамі, складанымі кветнікамі. У парках меліся аранжэрэі, цяпліцы, фруктовыя сады. З будынкаў былі часоўні, абеліскі. Вялікая роля ў беларускіх рэгулярных парках надавалася вадаёмам, якія рабіліся на аснове прыродных водаў, іншым разам з дабаўленнем штучных каналаў. Французскія паркі былі ў Кобрыне (часткова захаваўся), Дзярэчыне, Волчыне (Брэстчына), Леанпалі, Ружанах, Слоніме, Бачэйкаве (Віцебшчына, часткова захаваўся), Скоках (Брэстчына, часткова захаваўся), Гародні (часткова захаваўся), Вялікім Мажэйкаве (Гарадзеншчына, адносна добра захаваўся), Дубое (Піншчына, часткова захаваўся), Бялынічах (Магілёўшчына, часткова захаваўся), іншых маёнтках. Характэрнай рысай беларускіх паркаў было параўнальна невялікае выкарыстанне фантанаў, скульптуры і багатых раслінных узораў з кветак (хаця апошнія меліся, напрыклад, у Вялікім Мажэйкаве), а таксама наяўнасць у канцы парку спецыяльнай альтанкі для агляду наваколля.

Акрамя французскага рэгулярнага парку, у Беларусі атрымаў распаўсюджанне, пераважна ў перасечанай мясцовасці, тэрасавы парк, які ўзнік у Італіі ў XVI ст. і прыйшоў да нас у XVIII ст. Прынцыпамі яго пабудовы былі наяўнасць кампазіцыйна выразных рознаўзроўневых тэрас, адкрытай прасторы. Тэрас звычайна было тры ці чатыры, каля самай ніжняй з іх быў вадаём, каля самай высокай — панскі дом. Італьянскіх паркаў было адносна няшмат, аднак рэшткі іх захаваліся да нашых дзён. Гэта паркі ў маёнтках у Прылуках, Анопалі (Міншчына), Руткевічах, Свіслачы (Гарадзеншчына), Бярэзінскім (Маладзечаншчына) і інш.

У канцы XVIII ст. пачаўся новы этап паркавага мастацтва ў Беларусі. Сюды прыйшоў папулярны ў Еўропе пейзажны парк, які склаўся пад значным англійскім уплывам. Яго ідэалагема і эстэтыка зыходзяць з культу натуральнай прыроды, ідэі сінтэзу прыроднага і культурнага. Гэта праявілася ў вольнай кампаноўцы алей, маляўнічых груп дрэў як асновы эстэтычнага афармлення парку, адсутнасці агароджаў і пераходзе парку ў натуральны ландшафт ці ўвогуле арганізацыі парку ў сінтэзе з ім, уключэнні ў парк прыродных вадаёмаў, іншы раз са штучнымі выспамі, наяўнасці вальераў з разнастайнымі жывёламі, а таксама малых архітэктурных форм — альтанак, павільёнаў, пазней — імітацый на тэму сярэднявечча, готыкі (брамы, башні, замкі, часоўні, млыны і інш.), а таксама скульптур. З'яўленню гэтага тыпу паркаў папярэднічала наяўнасць пераходных форм, якія спалучалі рэгулярнасць і пейзажнасць (Навадзявяткавічы на Слонімшчыне, Дабраўляны на Смаргоншчыне, Лынтупы

на Пастаўшчыне і інш.); разам з тым некаторыя беларускія паркі ўвогуле працягвалі рабіцца з элементамі рэгулярнай планіроўкі (парк у Гомелі, Грушаве, Грымячы на Брэстчыне). Пейзажныя паркі часткова захаваліся да нашых дзён у мясцовасцях Свяцк, Варняны (Гарадзеншчына), Шчорсы, Усялюб (Навагрудчына), Дзятлава, Жылічы (Магілёўшчына), Лагойск, Лынтупы, Горкі (Случчына), Асвея, Бяльмонт (Браслаўшчына), Туганавічы (Брэстчына) і інш.

## 1.2. Сялянскае жыллё

### *1.2.1. Генезіс характэрных рыс традыцыйнага жылля*

Жыллё, побач з прыладамі працы,— найбольш старажытны з помнікаў матэрыяльнай культуры Беларусі, — яго першыя рэшткі паходзяць з верхнепалеалітычных стаянак Бердыж і Юравічы на ўсходнім Палессі. У далейшым, у часы бронзавага і жалезнага вякоў, у Беларусі існавалі розныя тыпы жылля — пераважна балцкія доўгія шматкамерныя прамакутныя і радзей квадратныя дамы слупавой і змешанай канструкцыі культуры штрыхаванай керамікі на поўначы Беларусі, невялікія круглыя ці блізкія да квадрата напаўзямляначныя хаты мілаградскай культуры, наземныя слупавыя і зрубныя пабудовы ( аднакамерныя зрубы) зарубінецкай і іншых культур Паўднёвай Беларусі. Як этнаспецыфічную з'яву старажытнага жылля на нашых землях можна ўзгадаць яго пераважна слупавую канструкцыю, г. зн., што сцены хаты складаліся з вертыкальных бярвён-слупоў ці паміж імі гарызантальна закладаліся сцены з бярвення. Гэтая канструкцыйная асаблівасць звязваецца даследчыкамі з балцкім этнасам, які займаў пераважную большасць беларускіх земель у той час. Славяне, што пачалі масавую каланізацыю Беларусі з другой паловы I тысячагоддзя да н. э., прынеслі іншы тып жылля — паўзямляначную ці зямляначную пабудову з печкаю з гліны ці камення ў куце, дзе больш значнае месца займалі зрубныя канструкцыі, хаця слупы і заставаліся па кутах. З часоў славянскай каланізацыі на нашых землях паступова распаўсюдзіўся вядомы па раскопках помнікаў XI—XIV стст. асноўны тып старабеларускай вясковай пабудовы — невялікія зрубы з каменнямі пад ніжнімі вянцамі, пераважна землянымі або глінабітнымі ці, радзей, зробленымі з дошак падлогамі, як можна меркаваць, двухсхільнымі стрэхамі, глінабітнымі печкамі на драўляных каркасах ці на гліняна-каменнай аснове. Паступова жыллё зрабілася цалкам наземным, хаця існавалі і зямляначныя і паўзямляначныя хаты (хутчэй за ўсё — праява славянскай этнічнай спецыфікі), якія з часам сышлі, саступіўшы месца больш функцыянальна дасканаламу вырашэнню. Старажытныя сельскагаспадарчыя пабудовы не вылучаліся разнастайнасцю і размяшчаліся каля хаты. Гэта — невялікія драўляныя пабудовы, якія далучаліся да жылля, таксама асобныя пабудовы на падмурках з печкамі-каменкамі, ямы-скляпы. Славяне прынеслі і новы тып пасялення —

неўмацаванае, адчыненае селішча, якое звычайна знаходзілася на беразе вадаёма. Побач з ім ці ўнутры магло размяшчацца невялікае добра ўмацаванае гарадзішча, дзе бараніліся жыхары падчас ваеннай пагрозы. Планіроўку селішча прасачыць досыць складана, фрагментарныя матэрыялы сведчаць, што яна была двухрадная, — г. зн. хаты размяшчаліся двума паралельнымі радамі, аднарадная, а таксама кучкавая ці бессістэмная. Характэрна, што гэтыя віды планіроўкі захавалі сваю прынцыповую сістэмную спецыфіку ў планіроўцы пасяленняў традыцыйнага беларускага жылля XIX — пачатку XX ст., дзе аналагі са старажытнай культурай маюць вулічная і бессістэмная планіроўкі. Што да памераў старажытных славянскіх пасяленняў, дык відавочная тэндэнцыя да памяншэння іх памераў ад плошчы ў некалькі дзесяткаў квадратных гектараў у IX — X стст. да невялікіх — ад некалькіх да паўтара дзесятка хат. Са славянскіх старажытных пісьмовых крыніц паходзяць і назвы пасяленняў. Гэта — сяло, сяльцо, дзярэўня, весь, пагост. Найбольш старажытная назва пасяленняў на нашых землях — сяло — вызначэнне адносна значнага па памерах неўмацаванага пасялення, дзе жылі вяскоўцы. Традыцыйная для Беларусі назва «дзярэўня» — вёска — шырока распаўсюдзілася пазней — з XIУ ст. Невялікае пасяленне магло называцца «весь». Пагостам у старажытнасці называліся адміністрацыйныя цэнтры пэўных акругоў, дзе ладзіліся агульныя сходы, праходзілі суды, былі размешчаны храмы, агульныя могілкі. Дваром, домам, градам называліся месцы, дзе размяшчаліся феадальныя маёнткі; магчыма, сяло таксама магло значыць княжацкае пасяленне з сядзібамі вяскоўцаў. Такім чынам, структурныя элементы традыцыйнага беларускага жылля скляліся да XIV ст. і былі звязаны з усталяваннем на нашых землях славян і ўнутраным развіццём іх культуры.

### *1.2.2. Пасяленні і сядзібы*

Пасля ўтварэння беларускага этнасу вызначыўся асноўны тып і, у яго межах, разнавіднасці традыцыйнага жылля, якое мела комплекс характэрных рыс. У Беларусі склаўся пэўны характэрны комплекс сельскіх пасяленняў. Іх асноўныя назвы — вёска, сяло, слабада, аколіца, засценак, мястэчка. Вёска (слова ўзнікла ад старажытнаславянскага «весь») — асноўны тып вясковага пасялення, — так называлася, незалежна ад памераў, кампактнае пасяленне сялян. Звычайна вёска не мела вялікіх сакральных, адміністрацыйных пабудоў; акрамя сялянскіх сядзіб, там магла размяшчацца карчма. Сяло да пачатку XIX ст. было досыць пашыранай назвай сельскага пасялення. Ад вёскі яно адрознівалася больш буйнымі памерамі, а таксама наяўнасцю адміністрацыйных устаноў, храмаў, адносна буйных рынкаў. Пасля правядзення ў XVI ст. валочнай рэформы колькасць пасяленняў з назвай сяло (хаця там магло не быць адміністрацыйна-культавых устаноў) значна павялічылася,— рэформа была зарыентавана на ўтварэнне вялікіх планава дасканалых

вулічных пасяленняў, што называліся сёламі. У XVIII ст., у сувязі з неабходнасцю засялення новых зямель пасля спусташальных войнаў XVII і пачатаку XVIII ст., колькасць новазаснаваных пасяленняў з такой назвай рэзка вырасла. Разам з тым пасля далучэння да Расіі сёлы паступова страчвалі свае старажытныя тыпалагічныя прыкметы і на нашых землях пачала дамінаваць такая назва, як вёска. Слабадамі называліся пасяленні, жыхары якіх у XVII—XVIII стст. пазбаўляліся на пэўны час ад выплаты падаткаў, мелі льготы ў выкананні павіннасцей з нагоды дрэннай якасці зямель (адсюль, магчыма, этымалогія слова слабада — паслабленні). Пазней слабадамі сталі называцца пасяленні каля гарадоў рамеснікаў розных спецыяльнасцей, якія адышлі ад сельскай гаспадаркі, але не зрабіліся гараджанамі. Характэрнай асаблівацю беларускіх сельскіх пасяленняў з'яўляюцца аколіцы — невялікія пасяленні дробнай шляхты (там маглі жыць і зямяне, баяры — пераходныя групы паміж шляхтай і сялянамі), звычайна агароджаныя плотам, якія размяшчаліся каля вёсак і шырока распаўсюдзіліся з XVII ст. Да аколіцы быў падобны засценак — пасяленне, якое ўзнікла ў выніку правядзення «Уставы на валокі» за межамі, «сценамі» зямлі, спецыяльна падзеленай паміж сялянамі. Такія кавалкі звычайна аддаваліся ў арэнду дробнай шляхце. Аколіцы і засценкі з цягам часу пераўтварыліся ў вёскі ці зніклі. Прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай займала мястэчка — адносна вялікае пасяленне, вядомае на нашых землях з XV ст., заснаванае па каралеўскай прывілеі ці ўзнікшае стыхійна, пераважна ў першай палове XVII ст. з абавязковымі таргамі, ярмаркамі, часта адміністрацыйнымі, культавымі ўстановамі, сядзібай феадала. Насельніцтва мястэчка складалі гандляры, рамеснікі, сяляне. Колькасць мястэчкаў у старажытнай Беларусі была даволі значнай: у канцы XVIII ст. іх лічба падыходзіла да 300. У XIX ст. мястэчкі былі пераведзены ў статус гарадоў ці вёсак. Адзначым, што сярод традыцыйных беларускіх пасяленняў да канца XIX ст. не было хутароў, якія мелі шырокае распаўсюджванне ў суседзяў — напрыклад, украінцаў у XIX ст.

Рэгіянальныя адрозненні былі ўласцівы для памераў пасяленняў. Там, дзе была ажыццёўлена валочная рэформа, — г. зн. у заходніх і цэнтральных частках беларускіх зямель, вёскі вызначаліся адносна буйнымі памерамі ў параўнанні з вёскамі паўночнага ўсходу, дзе рэформа не была праведзена цалкам.

Істотныя рэгіянальныя адрозненні маюцца і ў планіроўцы пасяленняў. Увогуле, для беларускага жылля ўласцівая наяўнасць лінейнага, вулічнага, а таксама хаатычнага, бессістэмнага тыпаў планіроўкі пасяленняў. Істотны ўплыў на характар планіроўкі зрабіла валочная рэформа, дзякуючы якой на паўднёвым захадзе і часткова на паўночным захадзе і ў цэнтральнай Беларусі атрымалі распаўсюджванне вёскі вулічнай планіроўкі, дзя сядзібы ішлі ўздоўж адной вялікай вуліцы ў адзін рад, насупраць ставіліся гаспадарчыя пабудовы (так было, калі валоку трымаў адзін гаспадар) ці хаты ставіліся ўздоўж вуліцы насупраць адна

адной. На паўночным усходзе і ўсходзе вёскі былі параўнальна невялікімі, а іх планіроўка — аднарадная — уздоўж берагоў шматлікіх рэк і азёр, а таксама бессістэмная. Разам з тым мелася і вулічная планіроўка, калі аднарадная забудова паступова пераўтваралася ў двухрадную, перад дварамі ўтваралася вуліца, і яны пачыналі будавацца насупраць адзін аднаго, а таксама, калі вёска будавалася абапал шляху, дарогі.

Планіроўка сядзібы таксама мела істотныя рэгіянальныя адрозненні, тыпалагічна і генетычна звязаныя з папярэднімі асаблівасцямі. Увогуле ў Беларусі вылучаюцца наступныя яе тыпы: пагон — калі ўсе будынкі ставяцца ў адзін рад (пагон бывае аднарадны, двухрадны, трохрадны), вяночны (двор утварае замкнёную прастору), Г-падобны, свабодны, з нязвязанымі пабудовамі. У Цэнтральнай Беларусі, Панямонні, на Палессі — там, дзе была праведзена валочная рэформа, — бытаваў пагон, які прадпісваўся палажэннем рэформы, калі сядзіба павінна была размяшчацца побач з замацаванай валочнай зямлёй. Даўжэзныя пагоны, што месціліся ў шэраг адзін за адным уздоўж прамой доўгай вуліцы, складалі істотную асаблівасць традыцыйнай сельскай забудовы адзначаных беларускіх рэгіёнаў. Двухрадны пагон, калі будынкі сядзібы ішлі двума паралельнымі радамі, быў у большай ступені распаўсюджаны ў паўночна-заходніх раёнах Беларусі. На паўночным усходзе панаваў вяночны тып забудовы, які адзначаны даследчыкамі ў канцы XVIII ст. у Полацкім намесніцтве і Крычаўскім графстве. Наяўнасць на досыць вялікіх абшарах — цэнтральных і заходніх землях Беларусі — кампактнага кангламерату адносна вялікіх вёсак з вулічнай планіроўкай і пагонным планіровачным тыпам сядзібы істотна адрознівала па гэтым кампаненце дадзены рэгіён ад этнічных суседзяў — у першую чаргу украінцаў, у якіх у XVIII ст. пануючым быў хутарскі тып сельскіх пасяленняў, і ўтварала ў дадзеным выпадку этнічную спецыфіку беларускага жылля.

Тыповы набор гаспадарчых пабудоў таксама вылучаўся рэгіянальнымі і этнаспецыфічнымі характарыстыкамі. У яго ўваходзілі хата, да якой прымыкалі камора ці варыўня, клець (на захадзе яна называлася свіран), хлявы (хлеў для коней — стайня), павець, адрына ці пуня — будова для захавання сена, пограб (склеп), гумно з сушылкай (ёўняй, асеццю) ці без яе, лазня, калодзеж ( студня ) (меней быў распаўсюджаны побач з вадаёмамі, а таксама там, дзе грунтавыя воды залягалі глыбока — тады ў вёсцы было некалькі грамадскіх калодзежаў); двор быў абгароджаны плотам, заметам. У XVII—XVIII стст. меліся і спецыяльныя ямы-сховішчы, дзе паводдаль ад вёскі, у глухіх месцах хавалі ежу і прадметы хатняга ўжытку — асабліва падчас ваенных дзеянняў. Сярод гаспадарчых пабудоў за межы сядзібы выносілася гумно — яно часта стаяла праз вуліцу насупраць хаты, пуня, калодзеж (мог размяшчацца побач з пуняй). Разам з тым поўны набор гаспадарчых пабудоў у сядзібе ў рэчаіснасці не меў усеагульнага распаўсюджвання; акрамя гэтага, яго набор быў абумоўлены рэгіянальнай спецыфікай. Так, сушыльні пры гумне

былі распаўсюджаны на Усходзе і Паўночным Усходзе Беларусі, дзе яны размяшчаліся ў гумне ці стаялі асобна. Спецыяльныя прыстасаванні для сушкі зерня — азяроды (канструкцыя з гарызантальных слупоў, замацаваных гарызантальнымі жэрдкамі, паміж якімі замацоўваліся снапы) былі распаўсюджаны ў Цэнтральнай Беларусі, на Усходнім Палессі. Лазні не былі распаўсюджаны ў заходніх раёнах Беларусі — там мыліся ў хатніх печах, вялікіх карытах, улетку — у вадаёмах. Для мыцця маглі выкарыстоўваць і ёўню — там была печ для сушкі збожжа. Адсутнасць лазні ў дадзеным рэгіёне набліжала яго да зямель памежнай Украіны і супрацьпастаўляла паўночна-ўсходнім абласцям, якія па гэтай прыкмеце набліжаліся да рускіх зямель.

### *1.2.3. Хата*

Цэнтральнае месца ў сядзібе займала хата (ізба, дом — добрая хата, халупа — дрэнная). Найбольш старадаўняя хата — аднакамерны будынак, да якога потым дадалі сенцы, — так утварыўся двухкамерны будынак. Далейшая эвалюцыя хаты ішла праз ускладненне планіроўкі. Хутчэй за ўсё першым трохкамерным будынкам быў у старажытнасці такі, які меў планіроўку хата + сенцы + клець. Потым, за выключэннем пагонных двароў і рэгіёнаў Цэнтральнай Беларусі, клець выдзелілася ў асобнае памяшканне, а хата зрабілася двухкамернай: хата + сенцы, прычым у пэўных рэгіёнах у сенцах маглі спаць. Далейшая эвалюцыя планіроўкі жылля звязана з пераходам да трохкамернай планіроўкі: хата+сенцы+камора. Трохкамерная планіроўка магла ўзнікнуць як у выніку будаўніцтва пераходу паміж хатай і клеццю, як гэта было ў старажытнасці, ці праз прыбудову да сенцаў яшчэ аднаго памяшкання, ці праз выдзяленне ў сенцах асобнага закутка, які пераўтварыўся з цягам часу ў асобнае памяшканне — камору, дзе захоўвалі збожжа, прадукты, каштоўныя рэчы, стаялі жорны; у зімовы час размяшчалася жывёла. Прыбудаванае памяшканне магло быць меншых памераў, чым асноўны аб'ём, мець сваю страху. У адносна заможных сялян камора рабілася асобна ў якасці клеці, свірна. У паўночных раёнах камору замяняла варыўня. Падаецца, што пераход да трохкамернага жылля адбываўся на працягу XVII—XVIII стст.— ужо ў канцы XVIII ст. на тэрыторыі Полацкага намесніцтва будаваліся трохкамерныя хаты з «каморкай». Разам з тым, як адзначаў А. Мейер пры апісанні Крычаўскага графства ў канцы XVIII ст., хаты былі па большай частцы без сенцаў. Ускосна аб характары планіроўкі можа сведчыць наяўнасць ці адсутнасць у дварах клецей (свірнаў) — там, дзе яны прыгадваюцца, хутчэй за ўсё камор не было і, наадварот, — там, дзе свірны не прыгадваюцца як асобныя будынкі, яны, магчыма, складалі адзінае цэлае з хатай. Так, згодна з вопісам 1786 г. уладання Радзівілімонты (зараз — Клецкі раён, Міншчына), са 186 сядзіб свіран адсутнічаў у 116 дварах (62,4%).

Сама хата будавалася выключна з дрэва (цвікі таксама былі драўляныя) — елкі, сасны, для ніжніх вянцоў выкарыстоўвалі дуб. Пад вуглы, а таксама, радзей, пад сярэдзіну будынка падкладаліся дубовыя «штандары», прастора паміж якімі запаўнялася не надта тлустымі бярвёнамі ці гарбылямі, таксама, вертыкальнымі чурбакамі. Замест штандараў маглі выкарыстоўвацца камяні-валуны, паміж якімі насыпалася мелкае каменне; іншым разам хату ставілі прама на зямлю. Старажытныя звесткі пра памер тагачаснага жылля паходзяць з пачатку XIX ст. і належаць англічаніну Р. Джонстану. Каля Барысава ён вызначыў сярэднія памеры ўбачаных ім каля сотні хат даўжынёй — 20, шырынёй — 14 і вышынёй — 7 футаў. Іх плошча, паводле Джонстана, складала каля 12 футаў, яны былі зроблены з неабчасанага дрэва, канцы бярвёнаў выходзілі за мяжу сцяны і былі няроўнымі. Жыллё было зрубнай канструкцыі і складалася з гарызантальна пакладзеных, часам не абчасаных бярвёнаў; сцены маглі рабіць і з раздзеленых папалам бярвёнаў — дыляў, якія часта ўзгадваюцца ў дакументах XVII—XVIII стст., а таксама рэдка — з брусоў. Паміж бярвёнамі для ўцяплення засоўваўся мох. Ніжняя частка сцяны ўнутры хаты магла пакрывацца глінай. Адзін з найбольш старажытных спосабаў умацавання бярвёнаў — «у шулы» — калі канцы гарызантальных бярвёнаў устаўляліся ў пазы вертыкальна пастаўленых слупоў, якія на пэўнай дыстанцыі адзін ад аднаго быццам бы абкружалі хату. Гэты канструкцыйны метад угадвае старажытныя слупавыя будынкі на нашых землях часоў жалезнага стагоддзя. У вуглах бярвёны злучаліся разнастайнымі спосабамі — як можна меркаваць, — часцей за ўсё з астаткам, калі канцы бярвёнаў выступаюць за сцены. Яны злучаліся адзін з адным рознымі спосабамі, сярод якіх вылучаюцца «ў чашку» — калі бярвёны злучаюцца праз вырубленыя ў іх паўавальныя гнёзды, «у замок» — калі гнёзды прамавугольныя, і «ў каню» — калі выступы бярвёнаў, што заходзяць у пазы, пашыраюцца на канцы; найбольш старажытныя з іх — «у чашку», «у замок». Са старажытных часоў вядомы ў Беларусі і спосаб рубкі вугла без выступаючых канцоў — «чысты», «нямецкі» вугал, але, як можна меркаваць, шырока ён пачаў выкарыстоўвацца з XIX ст. Страха рабілася па досыць архаічнай вяночнай апорнай сістэме, якая прадстаўлена «закотам», — калі аснова страхі — свалокі — клаліся на бярвёны тарцовых сцен, якія паступова, па меры руху ўверх, укарочваліся. Больш позні варыянт усталявання страхі — каркасны, страпільны, што распаўсюджаны і зараз,— у сваім найбольш старажытным варыянце прадстаўлены канструкцыяй «на сохах» — калі дах трымаецца на вялікіх, у памер хаты, вертыкальна пастаўленых сохах, у рагулькі якіх пакладзена тоўстая жардзіна, і сценах будынка. У мадыфікаваным варыянце — «на ключах», «на дзядках», «на сошках» — сохі замяняюцца сошкамі, стаякамі, што абапіраюцца на папярочныя бэлькі. Тут мы зноў сустракаемся з фрагментамі старажытнай слупавой канструкцыі жылля. Страха была пераважна двухсхільная. Столь, якая ў традыцыйным беларускім жыллі рабілася ў асноўным над жылой хатай,

у сваім найбольш старажытным варыянце была скляпеністая з бярвёнаў, пазней — з дошак. Гэты тып столі адпавядаў канструкцыі «закотам», ён таксама рабіў прастору хаты больш аб'ёмнай; магчыма, дадзены від столі меў лакальна-абмежаванае распаўсюджванне. Пазней распаўсюдзілася плоская драўляная столь, у сваім старажытным варыянце прадстаўленая канструкцыяй з «трамам» — вялізным чатырохвугольным бярвеннем, што ішло ўздоўж хаты і на якое ўкладваліся дошкі столі. Страха крылася саламянымі снапамі (у асноўным — ржанымі), якія ўкладваліся камлямі ўверх (гэта найбольш старажытны спосаб пакрыцця страхі — «пад колас») ці ўніз, там дзе былі вадаёмы, — чаротам, а таксама пры наяўнасці сродкаў — дрэвам: дранкай (дошчачкамі, якія дралі з калод), гонтамі (дошчачкамі, спецыяльна апрацаванымі з двух канцоў). Вокны, звычайна тры ці чатыры, досыць часта адно, радзей два ў тарцы і два на падоўжнай сцяне на сумежных вянцах зруба, былі невялікія, без рам, зачыняліся засаўкамі, маглі быць зацягнутымі бычыным пухіром. Абавязкова два паралельна вялікія акны знаходзіліся там, дзе ў хаце быў кут (кутнія вокны). Над дзвярамі размяшчалася акенца для выхаду дыму, бо хаты былі курнымі, без дымаходаў. Падлога была добра ўтаптаная, земляная ці глінабітная. Характэрнай рысай беларускай хаты была наяўнасць заваліны, «прызбы», якой хата абносілася з трох бакоў. Для яе невялікую прастору каля ніжніх вянцоў адгароджвалі камлямі, невялікімі бярвёнамі і засыпалі зямлёй. Упрыгожванне беларускай хаты было адносна сціплым — да другой паловы XIX ст. яно абмяжоўвалася арнаментам на лабавых дошках і разнымі канькамі на грабяні страхі. Хата звычайна ставілася бокам да вуліцы (за выключэннем вёсак з вулічнай планіроўкай, якія ўтварыліся пасля валочнай рэформы).

Канструкцыйныя асаблівасці хаты маюць як поліэтнічныя, так і этнаспецыфічныя рысы. Да першых належыць зрубны характар хаты, які мелі і суседзі — рускія, украінцы. Разам з тым у беларускім жыллі прасочваюцца ў сценах, страсе элементы слупавой канструкцыі, што дамінавала на нашых землях у часы бронзавага і жалезнага вякоў і звязаная з балцкім этнасам, а таксама прысутнічала і ў раннім славянскім жыллі. Трохкамерная хата з жылым памяшканнем, халоднымі сенцамі і каморай ці жылой ізбой, агульная для насельніцтва ўсходнеславянскага арэала, існавала таксама і ў заходніх славян. Характэрныя планіровачныя асаблівасці беларускага жылля: замкнёны двор, аднарадная, лінейная забудова набліжае беларускае жыллё да польскага, чэшскага, славацкага. Тое ж тычыцца канструкцыйных асаблівасцей: шырокае прымяненне зрубнай і слупавой канструкцый пры будоўлі сцен, умацаванне столі на адной балцы, адсутнасць суцэльнага фундамента і інш. Поліэтнічны характар мае звычай класці камень пад фундамент, што быў распаўсюджаны у Літве, Латвіі, на Пскоўшчыне, драўляная канструкцыя фундамента, якая мела месца таксама ў рускіх і украінцаў. Увогуле беларускае жыллё мела этнаграфічныя асаблівасці, якія набылі поліэтнічныя рысы на палескім памежжы з украінцамі і паўночным усходзе — з рускімі.

Што да этнаспецыфічных рыс, дык трэба адзначыць вонкавае адрозненне беларускай хаты ад пабеленай украінскай, а таксама рускай, якая досыць часта размяшчалася на падклецці. Вялікія пагонныя двары таксама характэрна вылучаюць беларускае традыцыйнае жыллё ад украінскага і рускага. Такія тыповыя рысы, як колькасць і распалажэнне вокнаў (тут маюцца аналагі з украінскім жыллём), наяўнасць прызбы, утвараюць характэрныя элементы беларускага жылля, якія маюць этнічную афарбоўку.

Характэрнымі рысамі вызначаўся і інтэр'ер хаты. Як гаварылася вышэй, большую частку свайго існавання — да другой паловы XIX ст.,— хата была пераважна курнай і працэс усталявання комінаў праходзіў досыць марудна. Як сведчыў у канцы 20-х гг. XIX ст. К. Кантрым, у хатах без коміна ў той час жыла на Палессі і дробная шляхта. Адтуліна для дыму рабілася над дзвярамі, дым выходзіў таксама праз адтуліну ў столі пасярэдзіне хаты, якая закрывалася зверху, і, зразумела, праз вокны. Перад хатай была прыступка — калода ці камень. У хату ўваходзілі праз нізкія дзверы, пераступаючы праз парог. Уваход у сені звычайна размяшчаўся з падоўжнага боку хаты, вельмі рэдка, як сведчаць матэрыялы XIX ст., у паўночна-ўсходнім рэгіёне беларускіх зямель — з тарцовай часткі (у выпадку двухкамернага жылля). Асноўная кампазіцыйная дыяганаль хаты праходзіла наўскос ад печы да чырвонага кута (покуці) — самага пачэснага месца ў хаце. Глінабітная печ традыцыйна размяшчалася адразу каля ўвахода — справа ці злева ад яго, — у залежнасці ад становішча хаты адносна вуліцы і размяшчэння кута, і была зарыентавана вусцем да падоўжнай сцяны. У куце каля печы быў качарэжнік — месца, дзе стаялі качарга, вілкі, мяцёлка, іншыя прылады. З другога боку ад увахода размяшчаўся «бабін кут» — там стаяла вада, вёдры, была падвешана палічка з посудам. За звернутым у хату кутком печы знаходзіўся прыпечны слуп, на які абапіраліся спальны памост, жэрдкі. Наяўнасць гэтага слупа ў старажытнасці досыць верагодная, бо вакол яго разгортваўся рытуал найбольш старажытнага вясельнага абраду — слупавога. Ад печкі да бакавай сцяны ішлі спальныя памосты — ніжэйшы — пол і той, што быў меншы па памерах, — палаці. Побач з імі была падвешана люлька (гэта характэрная асаблівасць хаты старажытных ліцвінаў, у палякаў калыска стаяла на подлозе). Ад спальных месцаў уздоўж сцяны ішла шырокая нерухомая лава (дубовая ці сасновая) да кута, куды ўздоўж бакавой сцяны падыходзіла такая ж. У куце звычайна віселі абразы, убраныя ручнікамі, стаяла дзяжа. Перад кутом размяшчаўся стол з невялікай пераноснай лаўкай — услонам. Хата асвятлялася лучынамі, якія замацоўваліся ў разнастайных лучніках ці проста ўтыкаліся ў сценку. Немец Г. Форстар, які быў на нашых землях у другой палове XVIII ст., апісвае вясковую хату з бляхай з лучынамі, якая нагадвае посвет з падвешанаю да яго знізу жалезнай рашоткай. Параўнальна невялікае памяшканне хаты, дзе жылі 5—6 чалавек, займалі досыць вялікія працоўныя прылады — у зімовы час там стаялі кросны,

у восень (ці ўвесь час) — жорны. Там жа трымалі хатнюю птушку, узімку — цялят, дробны скот.

Інтэр'ер беларускай хаты ў сваіх асноўных, сістэмаўтваральных рысах падобны на інтэр'ер хат суседніх народаў. Разам з тым тып беларускага інтэр'ера вылучаецца характэрным размяшчэннем печкі — яна павернутая вусцем да бакавой сцяны. Гэта ўласціва украінскай, заходнерускай, усходнелітоўскай хатам і з'яўляецца поліэтнічным і культурнаспецыфічным элементам для вялікага культурнага рэгіёну.

## 1.3. Жыллё гараджан

Жыллё гарадскіх гандляроў і рамеснікаў было сацыяльна дыферэнцыравана, а таксама вылучалася сваёй урбаністычнай спецыфікай. Яно залежала ад планіроўкі горада, узроўню яго эканамічнага, маёмаснага патэнцыялу, а таксама на яго ўплывалі гісторыка-культурныя стылі — у дадзеным выпадку — рэнесанс, барока, класіцызм. У той часткі гарадскога насельніцтва, якая атрымлівала значны прыбытак ад апрацоўкі зямлі, сядзіба функцыянальна набліжалася да вясковай, у гандляроў і рамеснікаў яна мела адпаведныя асаблівасці планіроўкі, жыллё заможных гараджан набліжалася да шляхецкіх сядзіб і палацаў.

У асноўным жыллё гараджан у XVII—XVIII стст. было драўляным, хаця дамы цэнтральнай часткі горада, дзе жылі заможныя гараджане, патрыцыят, былі мураваныя. Так, у канцы XVII ст. рускі стольнік Пётр Талстой апісваў Магілёў як горад, на пасадзе якога шмат багатых каменных дамоў, а многія драўляныя дамы добра збудаваныя; таксама ён адзначаў наяўнасць каменных лавак у гандлёвых радах і брукаваных «дзікім» каменнем маставых.

Як можна меркаваць па старадаўніх чарцяжах, планах, малюнках, якія тычацца Гродна, Віцебска, Магілёва, драўляныя жылыя дамы сярэднезаможных мяшчан былі размешчаны на вузкім участку зямлі тарцом да вуліцы, побач з варотамі, што тлумачылася цеснатой гарадской забудовы, асабліва цэнтральнай. Плошча дома магла складаць ад 9 да 17,6 кв. м (Віцебск). Хата рубілася з круглых бярвёнаў ці брусоў, у замок, магла мець падклецце, падзялялася на жылую і гаспадарчую часткі, якія аб'ядноўваліся сенцамі. З XVII ст. у мяшчан распаўсюдзіліся кафляныя печы. Два—чатыры невялікія акны са свінцовымі абкладкамі і шклом пераважна зялёнага колеру выходзілі на вуліцу і гародчык за домам, двухсхільныя стрэхі крыліся гонтамі, дранкай. Падлога была з дрэва, дзверы мелі драўляныя штыры, жалезныя завесы. Над уваходам мог быць навес на слупах ці перад ім — невялічкая галерэя. Хаты пераважна былі курнымі, дым мог выходзіць праз акно ў франтоне. Зямельныя ўчасткі былі там, дзе гэта дазваляў характар мясцовасці, — там ставілася лазня, калі трэба — гумно. У якасці агароджы выкарыстоўваліся пляцень, слупкі з бярвення.

Дамы заможных гараджан займалі больш значныя па памерах дзялянкі, яны былі павернутыя да вуліцы падоўжным бокам, перад імі быў сад. Як сведчаць матэрыялы XVII ст., дамы былі на падклецціях (як і сядзібныя дамы шляхты), маглі мець два паверхі, а таксама своеасаблівыя галерэі з навесамі, якія, аднак, у XVIII ст. сышлі з гарадскога будаўніцтва. Стрэхі маглі быць чатырохсхільнымі шатровай формы. Плошча найбольш вялікіх драўляных дамоў — 36 кв. м (Віцебск). Гэтыя дамы мелі гаспадарчыя прыбудовы, печы з дымаходамі, крыты ганак пры ўваходзе. З канца XVIII ст. дамы пачалі пакрывацца бляхай. Часта гаспадарчая частка дома выходзіла на вуліцу — як можна меркаваць, там размяшчаліся майстэрні, крамы. Увогуле, асобныя майстэрні размяшчаліся, хутчэй за ўсё, уздоўж вуліц. У інвентарах узгадваюцца гаспадарчыя будынкі — свіран, піўніца, кухня, хлеў, стайня (з драўляным пакрыццём, як у Віцебску), бровар, гаспадарчыя ізбы. Сядзібы агароджваліся парканам — паміж двума вертыкальнымі бярвёнамі клаліся гарызантальныя.

Меліся і вялікія драўляныя дамы досыць складанай канструкцыі з вежамі над уваходам, шатровымі дахамі, абходнымі галерэямі.

Цікава адзначыць наяўнасць у гарадскім будаўніцтве еўрапейскай фахверкавай канструкцыі — калі драўляная аснова, каркас будынка дапаўняліся цэглай ці глінай, утвараючы досыць маляўнічае відовішча.

Фрагментарна захавалася каменнае гарадское жыллё ў Полацку, Магілёве, Гродне, Нясвіжы, Паставах. Для яго планіроўкі ўласцівы сіметрыя, падзел на жылую (звычайна ў глыбіні будынка) і вытворчую часткі (магла мецца жылая і парадная), адзін ці два паверхі, скляпы, мансарды. Фасад, дзе размяшчаўся сціплы дэкор, уяўляў сабой прамавугольнік асноўнага аб'ёму з франтонам. Сваім дэкорам вылучаюцца дом купца ў Магілёве канца XVII ст., вокны якога былі аздоблены ўзорамі, разьба парадных дзвярэй у жылым доме канца XVII ст. у Полацку, а таксама «дом на рынку» ў Нясвіжы, галоўная фасадная сцяна якога мае ламаную барочную канфігурацыю. Звяртае ўвагу тыпавая забудова ў Гродне і Паставах 60—80-х гг. XVIII ст. — каля 30 дамоў, дзе жылі пераважна замежныя майстры, запрошаныя для абучэння мясцовых вытворцаў. Гэта амаль квадратныя ў плане будынкі з традыцыйным падзелам на пярэднюю вытворчую і жылую часткі і франтонамі, што спалучаюць барочныя і класічныя элементы. У другой палове XVIII ст., калі сярод шляхты распаўсюдзілася мода жыць у гарадах, былі пабудаваны вялікія палацы — такія, як палац Агінскага ў Слоніме, Тызенгаўза ў Гродне.

Аб гаспадарчых пабудовах у заможных дамах дае ўяўленне лямус манастыра брыгітак у Гродне (каля 1634 г.), які мае двух'ярусны арачны пераход, уласцівы таксама для жылых будынкаў у старажытных беларускіх гарадах.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі пачалася перапланіроўка гарадоў, наданне ім рэгулярнай сістэмы. Жыллё, асабліва ў буйных гарадах, пачало таксама рабіцца па тыпавых праектах у стылі архітэктуры класіцызму.

Вуліцы гарадоў, у першаю чаргу іх цэнтральныя часткі, былі брукаваныя, забудова, дзякуючы строгай рэгламентацыі магістратаў, вытрымлівалася ў адзіным ключы і імкнулася да адзінага цэлага. Вуліцы, шырыня якіх, напрыклад, у Магілёве і Віцебску была 5 м, таксама насцілаліся дошкамі, якія, як гэта было ў Мінску ў XVII ст., трымаліся на сваях і папярочных лагах. Гараджане абавязаны былі сачыць за ўчасткам вуліцы, што знаходзіўся перад іх домам. Гарады ў XVII ст. мелі драўляныя вадазборнікі і водаадводы, драўляныя дрэнажныя сістэмы, а таксама каналізацыйныя адводы, якія вялі, як у Мінску, у адстойнікі на дыстанцыю 30—40 м. Увогуле на падвор'ях былі сметнікі, сама тэрыторыя пасыпалася шчэпкамі.

Да гарадскога жылля набліжалася жыллё заможных местачкоўцаў, якое мела некалькі аддзелаў — хату, святліцу, сенцы, камору, падвал, вокны са шклом, ацяплялася кафляной печкай, крылася дранкай. Адрознівала жыллё местачкоўца дастаткова вялікая колькасць вясковых гаспадарчых пабудоў: свірны, спіхлеры, каморы, хлявы, стайні, клуні, адрыны, гумны і інш. У сядзібны комплекс уваходзілі таксама бровары, пякарні, кузні, лазні.

# 2. АДЗЕННЕ

## 2.1. Адзенне шляхты

Шляхецкае адзенне як арыгінальная культурная з'ява склалася ў выніку складанага ўзаемадзеяння мясцовых традыцый з еўрапейскімі культурнымі ўплывамі, стылямі рэнесанс, барока, класіцызм, уздзеяннем італьянскай, французскай, англійскай, нямецкай культур. Акрамя гэтага, на шляхецкі строй істотна паўплывала ўласцівае шляхецкай сармацкай культуры захапленне ўсходам, арыенталізм. Усё гэта ўтварыла своеасаблівы культурны сімбіёз, які са здзіўленнем або з цікавасцю ўспрымалі прадстаўнікі заходнееўрапейскіх краін. Акрамя гэтага, як і паўсюдна ў феадальным грамадстве, існавала вопратка розных сацыяльна-маёмасных груп шляхты, нават у асяроддзі заможнай шляхты была мода двара і ўсіх астатніх. І апошняе — у тагачасным грамадстве адзенне выконвала знакавую функцыю — сведчыла аб сацыяльным статусе, палітычнай арыентацыі, маёмасным становішчы асобы, і таму стаўленне да яго было досыць пільнае.

Якасць адзення залежала ад гатунку тканіны, і тут шляхціцы выкарыстоўвалі даволі шырокі яе імпартны дыяпазон, які ахопліваў усіх знакамітых вытворцаў Еўропы, а таксама краін Усходу. Разам з тым паказальна, што пасля ўтварэння ў XVIII ст. мануфактур па вырабе палатна, шарсцяных, шаўковых тканін у Гародні, Нясвіжы, Слоніме, Ружанах перавага паступова пачала аддавацца мясцовым вырабам. Тым не менш, імпарт быў досыць насычаны, у тым ліку і каштоўных тканін.

Да іх ліку належалі аксаміт, шаўкі, адамашак генуэзскі, атлас, алтабас, французскі брокат, тафта, англійскае сукно, шыфтух. Тканіны сярэдняй якасці і кошту карысталіся большым попытам — гэта розныя віды сукна — галандскае з Лейдэ, мараўскае, каразея, чэшскае, мухаяр, фалендыш, бая, кіра, англійскі лундыш, камлот, усходні баракан, каламайка і інш.; малазаможныя шылі адзенне з фалендышу ці каламайкі.

Шляхецкае адзенне, мода, маючы ўстойлівыя, базавыя мадэлі, былі, тым не менш, дастаткова дынамічныя ў дэталях і фасонах. Істотны пералом у модзе адбыўся прыблізна ў 1730-я гг., калі пад моцным еўрапейскім уплывам традыцыйны сармацкі шляхецкі строй пачаў саступаць месца уніфікаванаму еўрапейскаму касцюму, які склаўся па нямецкім (саксонскім) і французскім узорах. Гэта тычыцца як мужчынскага, так і жаночага адзення, аднак найбольш паказальнымі былі характарыстыкі мужчынскага адзення як знакавага для ўсёй культуры Рэчы Паспалітай.

### *2.1.1. Мужчынскае адзенне*

Традыцыйны шляхецкі касцюм вылучаўся сваёй адметнасцю, а ў Еўропе — нават экзатычнасцю. У XVII ст. яго крой быў запазычаны з Усходу — Турцыі, а таксама Венгрыі. Разам з тым гэта ў асноўным тычылася верхняй, паясной вопраткі. Што да бялізны, дык яна, як і ў іншых сацыяльных колах, складалася з доўгай арнаментаванай кашулі, якая завязвалася пад шыяй тасёмкай, а таксама сподні — ніжніх штаноў з даматканага ці іншага палатна (такія штаны называліся таксама порткі). Паверх іх надзяваліся шырокія штаны з атласу, адамашку, якія называліся штаны, шаравары. Яны па шве маглі ўпрыгожвацца галуном і трымаліся на матузку, а потым на гузіках. Паверх бялізны надзяваўся жупан — двухбортнае адзенне з вузкімі рукавамі і стаячым каўняром, прыталенай спінай. Жупан шылі з каштоўнага сукна — мараўскага, а таксама аксаміту, падшывалі палатном, зашпільвалі на гузікі ці кручкі. Жупаны шылі таксама са скуры ласёў, а калі ён насіўся адзін, яго падшывалі ватай і рабілі з шарсцяных тканін. Левая фалда жупана істотна заходзіла на правую, яго таксама адрознівала залатая шнуроўка па краі каўняра і спераду. Мадыфікацыі жупана хутка мяняліся: з пачатку XVII ст. насілі кароткія жупаны з каўняром, нязначна паднятым ззаду і досыць невялікім спераду. З 1640-х гг. жупаны падоўжыліся ззаду, каўнер зрабіўся аднолькавай вышыні, ён разыходзіўся спераду. З XVIII ст. жупаны насілі з паясамі. На жупан апраналі кунтуш — кафтанападобную вопратку з разразнымі рукавамі. Па колеры жупан павінен быў быць трохі святлейшы за кунтуш. Паказальна, што, як адзначаюць даследчыкі, крой кунтуша не мае непасрэдных аналагаў у культурах усходу і захаду. Кунтуш шыўся з сукна, шарсцяной тканіны і падбіваўся футрам. Гэта было параўнальна шырокае адзенне, якое не стрымлівала рухаў. Яго асновы складаў адзіны ад спіны да нізу плат тканіны, да якога прышываліся бакавыя ўстаўкі. Адметнай рысай кунтуша была вялікая колькасць спераду пятліц

з каштоўнымі гузікамі, што адпавядала тагачаснай еўрапейскай модзе, калі ў XVII ст. гузік зрабіўся адметнай часткай мужчынскага касцюма. Каўнер кунтуша быў нізкі, стаячы. Мода мяняла кунтуш: у пачатку XVIII ст. ён быў доўгі і вузкі, у сярэдзіне стагоддзя пакарацеў да каленяў. Кунтуш без разразных рукавоў называўся чэхманам. Кунтушы заўсёды насілі з поясам, якому надавалася асобая роля ў шляхецкім касцюме. Ён павінны быў быць доўгі і шырокі, канец пояса павінны быў звісаць спераду да каленяў і быць добра ўпрыгожаны — асабліва залатымі ніткамі. Мода на паясы хутка мянялася — шаўковыя, вязаныя, вельмі тонкія кітайскія, турэцкія, персідскія і, нарэшце, слуцкія. Таксама насілі кафтаны з шоўку, сукна, кітайкі — яны былі параўнальна кароткімі, мелі кішэні, доўгія рукавы і разрэз спераду, які зашпільваўся на гузікі. Сярэдняя і малазаможная шляхта на нашых землях апраналіся і ў аднарадку — аднабортную вопратку без каўняра. Кароткія і доўгія рукавы мела чамара — доўгае адзенне на гузіках, абшытае шнуркамі. Замест кунтуша для коннай язды адзявалася катанка. Верхняя вопратка была прадстаўлена традыцыйнымі кажухамі, шубамі — мехавымі, доўгімі, з рукавамі. Разам з тым шляхта аддавала перавагу дэліі — безрукаўнай, падшытай мехам вопратцы свабоднага пакрою, абшытай тканінай яркага колеру з вялікім каўняром. Таксама шырока насілі феразь — падбітую дарагім мехам вопратку з яркай тканіны свабоднага крою з шырокімі рукавамі і вялікім каўняром. З воўчых ці мядзведжых скур рабілі ваўчыны, якія маглі насіць на шнурку на адным плячы. Былі папулярныя бекешы, што нагадвалі па крoі жупан. Плашчападобны крой мела кярэя, якая падшывалася мядзведжай скурай. Кярэя з башлыком называлася буркай.

На галаве ва ўсе поры года насілі спецыфічныя нізкія і высокія футравыя ці абшытыя футрам шапкі, якія атрымалі назву каўпака. Святочныя каўпакі шыліся з асабліва каштоўнага меху. Магнатэрыя насіла капелюшы з дарагога сукна і аксаміту. Сярэдняя і малазаможная шляхта шанавала магеркі, а таксама канфедэраткі — высокія з чатырохвугольным дном, абшытыя аўчынай шапкі. У розныя часы шляхта прытрымлівалася рознай моды на прычоскі. У першай палове XVII ст. галаву і твар галілі, пакідаючы зверху чуб, а таксама абавязковыя вусы. Потым прыйшла мода на доўгія, па французскай модзе, валасы, а таксама невялікую, на шведскі манер, бародку з вусамі. У XVIII ст. пакідалі толькі невялікія вусы і адносна кароткія валасы.

На нагах насілі жоўтыя, чырвоныя, зялёныя, блакітныя, вельмі рэдка чорныя боты, якія спераду былі досыць высокія і даходзілі да паловы калена. Пад напяткам была тлустая жалезная ці нават срэбная падкова. Узімку боты высцілалі саломай — гэта рабілі нават магнаты, чым дэманстравалі сваю прыхільнасць да народу. Шляхта насіла і высокія да кален, вузканосыя сапагі, халява якіх сцягвалася пад каленам рамянём.

Адметнай рысай шляхецкага касцюма была істотная колькасць упрыгожванняў — вышыўкі, нашыўкі, галуны, карункі, залатыя і срэбныя ніці, тасьмы, стужкі, гузікі, дзе выкарыстоўваліся каштоўныя матэрыялы.

Асаблівай павагай у шляхціцаў карысталіся пярсцёнкі — асабліва гербавыя сцігнеты (пярсцёнак з пячаткай).

Прыблізна з 1730-х гг. традыцыйны шляхецкі строй пачаў сыходзіць — яго паступова выцяснялі фрак, камізэлька, цыліндр, больш вытанчаныя аксесуары. Аднак шляхецкі кунтуш працягваў быць шляхецкім сімвалам і побач з канфедэраткай яшчэ доўга сімвалізаваў шляхецкую культуру з яе ідэаламі вольнасці, роўнасці, любові да айчыны.

### *2.1.2. Шляхецкая шабля*

Касцюм дапаўняла абавязковая зброя — шабля, а таксама малаткападобная прылада на ручцы — чэкан (калі другі бок ударнай часткі быў плоскі), абух (калі ён быў закручаны ў колы) ці надзяк (калі быў завостраны), а таксама нож.

Любы больш-менш заможны шляхціц меў у сябе, акрамя халоднай, і агнястрэльную зброю, а па магчымасці ўзбройваў і дворню. Разам з тым сярод старашляхецкай зброі Рэчы Паспалітай — Польшчы (Кароны), Вялікага княства Літоўскага — шабля займала выключнае месца. Гэты прызначаны для сячэння від халоднай зброі ператварыўся ў знакавую, культавую рэч, сімвал пануючага шляхецкага саслоўя, яго ментальнасці, этасу, культуры, улады.

Шаблю з гонарам насілі ўсе прадстаўнікі шляхецкага саслоўя: ад вышэйшых асоб дзяржавы да «шарачковых» шляхціцаў; побач з найбольш дарагімі радавымі рэліквіямі яна пераходзіла ў спадчыну па мужчынскай лініі; у хаце яна вісела звычайна над ложкам гаспадара. На тагачасных парадных партрэтах магнатаў і каралёў шабля прысутнічала амаль заўсёды.

Традыцыйная шляхецкая — крывая — шабля прыйшла на гэтыя землі з усходу і поўдня. У XVI — XVII стст. у Цэнтральнай Еўропе сярод паяснай зброі меч паступова страціў сваю дамінантную ролю, на першае месца выйшла шпага, і адначасова пачалося павелічэнне ўдзельнай вагі шаблі. Менавіта апошні від зброі выдатна «прыжыўся» ў Кароне, зрабіўшыся тут пануючым.

Шляхціц звычайна меў дзве асноўныя шаблі — адну парадную, пад адпаведны строй і ўрачысты выпадак, і іншую — баявую.

Клінкі найлепшых шабель рабіліся з адборнай сталі ці «дзівіру», жалезнага дроту, распаленага на агні і пракаванага кувалдай; простая, масавая шабля рабілася з жалеза, прычым асноўная маса зброі была мясцовага вырабу з тутэйшай сыравіны; замежныя шаблі каштавалі звычайна дорага.

У Рэчы Паспалітай вырабляліся розныя тыпы баявых шабель са сваімі назвамі. Адны з першых, шырока распаўсюджаных, былі шаблі XVI ст. вышынскія (ад назвы месца вырабу ў Кароне); як адзначаюць сучаснікі, яны былі высокай якасці — маглі гнуцца амаль да рукаяткі. З XVIII ст. з'явіўся новы варыянт масавай шаблі — сташоўка (ад Сташава сан-

дамірскага). На фабрыках сандамірскіх і кракаўскіх выраблялася аўгустоўка; высокая якасць была ўласцівая зыгмантоўцы (дзве гэтыя шаблі, па сведчаннях сучаснікаў, маглі без шкоды для сябе рубіць жалезныя цвікі); карысталася попытам і баторaўка. Гэтыя шаблі атрымалі свае назвы ад каралёў, партрэты і імёны якіх былі зроблены на зброі.

У паэме «Пан Тадэвуш» Адам Міцкевіч узгадвае выдатныя якасці шаблі:

*"А на дзвярах у дом завалы, клямкі, гакі*
*Ці пасяканы шаблямі, ці носяць знакі*
*Выпрабавання гарту шаблі "зыгмантоўкі",*
*Лязом якой хоць счэсвай вухналёў галоўкі —*
*На ёй ні знаку як уверсе, так і ўнізе!"*

Вялікай павагай ва ўсім свеце карысталася «дзямешка» — турэцкая шабля з дамаскай сталі, на якой звычайна былі выгравіраваны цытаты з Карана. Найбольш крывая шабля называлася серпенціна, яна ўжывалася звычайна ў паядынках.

Побач з баявымі сярод дастаткова заможнай шляхты былі распаўсюджаны і шаблі парадныя. Асабліва цаніліся парадныя шаблі XVII—XVIII стст., зробленыя львоўскімі армянамі. Ніколі не выкарыстоўвалася ў баі і вельмі рэдка ўжывалася ў паядынках парадная карабела — імпартаваная з-пад Багдада ці мясцовай вытворчасці. Гэта была лёгкая, вузкая зброя з багата аздобленай ручкай — з агату, аметысту, замацаваная залатымі цвікамі. Карабела досыць часта сустракаецца на парадных магнацкіх партрэтах.

Багата аздобленая шабля з'яўлялася істотнай часткай урачыстага падарунка: так у 1695 г. кароль Ян Сабескі падараваў у дзень шлюбу дачкі свайму зяцю Максіміліяну Эмануілу сярод іншых каштоўных рэчаў і шаблю з залатымі ножнамі, залатую рукаяць якой упрыгожвалі перліні з алмазамі, рубінамі, сапфірамі .

Асноўны тып старашляхецкай шаблі — гэта простая, «чорная» шабля (магла таксама называцца палашом), самая масавая, баявая, «працоўная» шабля сярэдне- і малазаможнага шляхціча. Яе рысы — прастата формы і функцыянальнасць, якія сумяшчаліся з прымальным коштам, выклікалі яе сістэматычнае, асабліва з XVIII ст., ужыванне. Тыпалагічна блізкая ёй шабля венгерская. «Чорная» — гэта крывая шабля з крыху дугападобным перакрыжаваннем — крыжам (у парадных шабель — карабелы і інш.— ён звычайна прамы), абавязкова гранёным, з малой скобачкай, куды ўваходзіў вялікі палец. Рукаяць завяршалася звычайным наканечнікам. Ножны рэдка рабіліся з якаснай барановай скуры , «куршу» (дрэва, абцягнутага скурай), часцей былі «яшчуровыя», нават са скуры вугра. З цягам часу баявыя шаблі ўдасканальваліся — так, зробленыя на іспанскі манер сташоўкі ўжо вузкія, лёгкія, як адзначае польскі гісторык другой паловы XVIII ст. Е. Кітовіч, яны добра падыходзілі для абароны і адбіцця нечаканага нападу. Паступова ў шабель з'явілася гарда — «фурдымент», якая складалася з жалезных прутоў і бляшкі

ў сярэдзіне шырынёй з далонь, што дугападобна ахоплівала рукаятку. Крыж павялічыўся, і гэта патрабавала больш шырокіх ножнаў, якія з часам пачалі ўжывацца і для шабель без «фурдыментаў». Як пісаў Е. Кітовіч, гэтую моду на шырокія ножны ўвялі «ліцвіны», г. зн. шляхціцы старажытнай Беларусі, потым яна распаўсюдзілася і ў Кароне. Шаблі з вялікімі крыжамі і шырокімі ножнамі насілі звычайна тыя, хто знаходзіўся, служыў пры шляхецкім двары, а таксама, як піша Е. Кітовіч, «шулеры і шалапуты». Разам з тым парадныя, магнацкія шаблі з простымі прамымі крыжамі існавалі як даніна традыцыі досыць працяглы час.

На шаблях сустракаліся надпісы рэлігійнага зместу, імёны ўласнікаў, прыслоўі, расповяды пра тое, якім шляхам і ад каго шабля трапіла да цяперашняга гаспадара; на іх маглі быць размешчаны партрэты каралёў, даты, вензелі, сімволіка. Гэта рабіла шаблю артэфактам мастацкага, культуралагічнага значэння.

Шаблі ўсіх відаў насілі па-рознаму, падвязвалі двояка. Найбольш пашыраны старажытны спосаб — на левым баку, калі крыж знаходзіўся на ўзроўні пояса, а ножны трымаліся на раменных паясах ці тасьмах са шнура: залатых, срэбных ці ўпрыгожаных гэтымі металамі. Паясы ці тасьмы абдымалі левы бок і сыходзіліся ў вузел на спіне над поясам па цэнтры цела. Пазней прыйшоў іншы спосаб павязвання, калі шабля вісела над каленам і пры хадзе яе трэба было трымаць за крыж ці несці пад пахай, повязь пры гэтым блыталася. Гэта было нязручна, і таму дадзеная мода праіснавала ў XVIII ст. 5—6 гадоў.

Валоданне шабляй было пастаўлена ў Рэчы Паспалітай на высокі ўзровень. Пісьменнік XVIII ст. Ф. Язерскі піша аб здаўна існуючым у краі «мастацтве» фехтавання. Да яго далучаліся ўжо «студэнты» езуіцкіх і піярскіх навучальных устаноў, дзе адной з найбольш папулярных забаў былі «пальцаты» — паядынкі на спецыяльных кіях, прычым яны мелі месца і ў асяроддзі прафесарскай моладзі. Біліся да страты апошніх сіл, прычым валодалі гэтай прыладай так спрытна, што паразіць праціўніка ў твар, галаву, бок было, як сцвярджаюць сучаснікі, складана. Пальцаты былі ў шырокім ужытку нават у сценах навучальнай установы — паміж лекцыямі, і той, хто не адважваўся ўступіць у паядынак, ганьбіўся ўсімі навучэнцамі.

Аб этнаспецыфічных прыёмах валодання шабляй піша Ф. Язерскі: «Венгр сячэ наводліў, масквіцін зверху, турак да сябе, паляк накрыж маша сваёй шабляй». Сапраўды, тагачасная тэхніка шабельнага бою шляхціца грунтавалася на рубцы накрыж. Яе спецыфіку складалі таксама такія прыёмы, як смяротны ўдар «млынок». Асабліва выразны ўдар, тэхнічны прыём атрымліваў імя свайго аўтара. Дарэчы меч, рапіра, шабля таксама маглі мець уласныя імёны. Ізноў звернемся да паэмы А. Міцкевіча: кажучы пра былога канфедэрата Мацея і яго ваенныя заслугі, паэт піша:

*«Паваяваў і жартам Розгаю гарачай*
*Зваў шабельку сваю дамаскую, няйначай".*

Праявай вытанчанага тэхнічнага майстэрства было ўменне адсекчы праціўніку вуха ці нос — гэта служыла прадметам гонару, пахвальбы.

Адной з найбольш пашыраных праяў бытавога выкарыстання зброі былі паядынкі, двубоі. Біліся за ўсё — за гонар караля, сваякоў, партыі, дам, сяброў і, канешне, за свой; біліся нават па некалькі разоў на дзень. Былі і свае рэкардсмены — так, шляхціц з Брэстчыны Якуб Багуслаўскі правёў больш за 50 двубояў, 15 з якіх закончыліся смерцю праціўніка. Як можна меркаваць, некалькі дзесяткаў дуэлей для шляхціца, нават заможнага, не былі нечым незвычайным — так, паляк Ян Хрыстазом Пасек у сваіх мемуарах апісаў не менш за 30 двубояў, прычым па тры — чатыры разы на дзень.

Існаваў баявы маральны кодэкс — з'яўленне крыві ў аднаго з праціўнікаў стрымлівала другога. Было нямала майстроў, у руках якіх шабля ператваралася ў страшэнную зброю: у крыніцах нагадваецца пра разрубленых наўскос, ад пляча, людзей. У асноўным гэта адбывалася ў час ваенных дзеянняў. У бойках паміж шляхціцамі высокі ўзровень валодання зброяй прыводзіў у асноўным да ран — самай сур'ёзнай і адметнай была адсечаная рука, што пачало кідацца ў вочы сучаснікам у бурным XVIII ст. У XVIII ст. шаблю ў двубоі пачаў выцясняць пісталет, што ўспрымалася тады прадстаўнікамі шляхецкай шабельнай традыцыі як паказчык фізічна-валявога заняпаду моладзі.

### *2.1.3. Жаночае адзенне*

Як і мужчынскае, жаночае адзенне падзяляецца на перыяды да і пасля сярэдзіны XVIII ст., калі яно істотна змянілася пад уплывам ідэй Асветніцтва, культур класіцызму і ракако, як і псіхалогія шляхцянак, іх месца ў грамадскім жыцці. Традыцыйнае адзенне шляхцянак часоў барока адрознівалася сваім «зачыненым» характарам — амаль усё цела плотна закрывалася, каўнер зашпільваўся пад падбародкам, рукі і ногі хаваліся пад даўгімі рукавамі і спадніцамі. Тут старашляхецкі строй нагадвае па прынцыповаму падыходу іспанскую моду, якая служыла ўзорам стрыманасці.

Бялізна была традыцыйна прадстаўлена кашуляй з тонкага палатна з каўняром і манжэтамі, якія не ўпрыгожваліся. Кашулі былі таксама начныя, у якіх спалі. З XVII ст. насілі разнастайныя панчохі. Наверх надзявалася сукня — вопратка з рукавамі і каўняром, гладкая ці з фалдамі. Потым апраналі спадніцу — шарсцяны андарак ці шырокую амазонку. Наверх надзявалі шнуроўку — жаночы кафтанік са шнуроўкай і карсетнымі пласцінамі, ці безрукаўку — кабаты, камізэлькі, сукманы, гарсеты, а таксама плечавую вопратку — юпку — з кароткімі ці доўгімі рукавамі. У халады на шнуроўку ці безрукаўку надзявалі яшчэ зімнюю юпку ці жаночы кунтуш, прыталены казакін.

Верхняя вопратка складалася з шубы, кажуха, тарлопа з каштоўных мяхоў. Галаўныя ўборы былі прадстаўлены шапкамі — каштоўнымі

мехавымі ўборамі, якія надзяваліся на хусткі ці чапцы. Істотнай часткай убора быў галаўны платок — рантуха, які ўпрыгожваўся каштоўнай вышыўкай. Рантуха магла насіцца і паверх чапца. Апошнія былі істотнай часткай галаўнога ўбору, упрыгожваліся каштоўнасцямі, перлінамі і мелі вялікую колькасць варыянтаў. Існавалі і каўпакападобныя ўборы. З другой паловы XVI ст. жанчыны пачалі насіць берэты. Асноўнымі ўпрыгожаннямі былі пацеркі, падвескі, ланцужкі, пярсцёнкі, завушніцы.

На ногі надзявалі чаравікі, боты.

Прыкладна з сярэдзіны XVIII ст. адзенне шляхцянкі зрабілася па-еўрапейску больш адкрытым, нават фрывольным. Спачатку прыйшлі доўгія салопы, потым кароткія паўсалопы. Адметна шляхецкім адзеннем былі рагоўкі — спадніцы з абручамі з кітовага вуса. У 1730-я гг., калі кабаты выйшлі з моды, з'явіліся першыя прадвеснікі разняволення жаночага адзення — раброны — доўгія сукенкі з шэрсці, моцна прыталеныя з дапамогаю кітовага вуса, выразы на якіх спераду і ззаду з цягам часу дасягнулі нябачных дагэтуль памераў. Нарэшце прыйшоў еўрапейскі строй тыпу шмізу — лёгкае, празрыстае адзенне ў антычным стылі, якое было прычынай шматлікіх прастудных захворванняў. Распаўсюдзіліся новыя шыкоўныя ўпрыгожанні, касметыка, мушкі, шыньёны.

## 2.2. Сялянскае адзенне

Традыцыйнае беларускае адзенне, асабліва жаночы строй, з'яўляецца багатым і насычаным этнакультурным зместам кампанентам беларускай культуры. Адзенне, якое сумяшчае утылітарны, мастацкі, знакава-сімвалічны элементы, у найбольшай ступені з відаў матэрыяльнай культуры сінтэзуе розныя рэаліі культуры этнасу.

Традыцыйнае адзенне амаль цалкам выраблялася саматужна са сваёй сыравіны, і асноўным яго вырабнікам была жанчына. Адзенне рабілася з ільну, валокнаў канапель, жывёльнай скуры, воўны. Шлях да гатовага вырабу быў досыць працяглы і ўключаў шэраг паслядоўных аперацый. Так, сцёблы льну ці канапель спачатку мачылі, потым мялі на спецыяльнай мялцы, трапалі з дапамогай лапаткі, часалі грабянямі і шчоткамі і толькі потым пачыналі прасці на прасніцы — спецыяльнай дошцы ці на калаўроце з колам. Пражу намотвалі на матавіла, сушылі, часта бялілі, снавалі і нарэшце пачыналі ткаць. У залежнасці ад палатна, якое меркавалася атрымаць, ткацтва ажыццяўлялася па рознай тэхналогіі. Афарбоўку рабілі самі сяляне — трэба адзначыць, што да прыходу фабрычных тэхналогій у летнім адзенні пераважалі натуральныя льняныя белыя фарбы; тое ж тычылася і зімовай вопраткі. Традыцыйна фарбавалі шарсцяную тканіну для спадніцы, штаноў, безрукаўкі. Да раменнікаў звярталіся, калі трэба было вырабляць верхняе адзенне, якасныя віды абутку, пэўныя тыпы галаўных убораў.

Комплекс традыцыйнай вопраткі падраздзяляецца на мужчынскі і жаночы (праблемным з'яўляецца дзіцячы комплекс), сезонны, будзённы і святочны ( можна вылучыць абрадавае адзенне, — напрыклад нявесты, свахі, свата). Дарослы член сям'і павінен быў мець некалькі комплексаў вопраткі: святочны, а таксама будзённы для кожнай пары года. Гэта тычылася і такіх складаных для вырабу рэчаў, як кажух і світка, якія таксама падзяляліся на працоўную і выхадную.

### *2.2.1. Жаночае адзенне*

Найбольш яскрава характэрныя рысы традыцыйнага беларускага адзення праявіліся ў жаночым строі. Аснову традыцыйнага комплексу адзення складала адзенне нацельнае, споднае, якое ў жанчын, як і ў мужчын, складалася з кашулі. У жанчын летні строй дапаўняўся спадніцай, фартухом, кароткай безрукаўкай (ці вопраткай з рукавамі), галаўным уборам і абуткам. Гэты комплекс мае поліэтнічны, усходнеславянскі характар; яго этнічныя асаблівасці тычацца ў асноўным метаду крою. Адзін з найбольш істотных элементаў традыцыйнага строю — кашуля (сарочка, рубаха). Найбольш старажытным кроем лічыўся тунікападобны — калі палатно складвалася папалам, пасярэдзіне рабіўся выраз для галавы, пакідаліся адтуліны для рук і рабіўся выраз наперадзе. Гэты пакрой шырока вядомы ў старажытнасці ў народаў Еўропы, у тым ліку і ў сумежных прыбалтаў. Аснову традыцыйнай, вядомай у пазнейшы час кашулі складала «станіна» — злучанае спецыяльным чынам на плячах палатно. У будзённых кашулях верх шылі з больш вытанчанага палатна, ніз — з грубага. Традыцыйна часткі станіны злучаліся пры дапамозе палікаў — прамавугольных уставак на плячах. Гэты тып сарочкі таксама ўласцівы рускім, украінцам. Каўняры на кашулях былі пераважна невысокія стаячыя, а таксама адкладныя. Як лічаць даследчыкі, шырокі адкладны каўнер (адзенне з ім часцей называлі кашуля) распаўсюдзіўся ў літоўцаў, беларусаў, украінцаў, а таксама, часткова, рускіх, пад польскім уплывам. Можна меркаваць, што пачатак гэтага працэсу належаў да часоў Рэчы Паспалітай. Рукавы рабіліся, як можна меркаваць, часцей з манжэтамі, акрамя рабочых кашуль. Традыцыйная беларуская кашуля даўжынёй была звычайна ніжэй каленяў. Яна ўпрыгожвалася досыць сціпла — арнамент размяшчаўся ў верхняй частцы рукава, на паліках, каўняры, грудзях, манжэтах, але ўзор у поўным камплекце наносіўся рэдка — як можна меркаваць па больш познім часе, у рэгіёнах, сумежных з Украінай. Упрыгожванне мела манахромны характар — у асноўным арнамент быў чырвонага колеру; старажытныя кашулі маглі быць увогуле без упрыгожвання. Насілася кашуля самастойна ці са спадніцай — у асноўным схаванай пад яе ці, рэдка, навыпуск.

Асноўная паясная вопратка жаночага строю — спадніца. Яна шылася з даматканага палатна ці сукна альбо паўсукна. Спадніца рабілася з некалькіх (да шасці) полак (падоўжных кавалкаў палатна), якія

сшываліся і збіраліся ў зборкі каля пояса. Зрэдку спадніцу шылі з папяроч-нага кавалка тканіны — папярочкі. Спадніца завязвалася спераду ці крыху збоку тасёмкамі ці паяском. Вылучаюцца спадніцы, якія шыліся з шарсцяной ці паўшарсцяной тканіны, — андаракі (слова паходзіць з нямецкай мовы). У старажытнасці андарак быў верхняй спадніцай прадстаўніц пануючых класаў. Ён быў багата ўпрыгожаны, яго асаблівасць — наяўнасць клятчастай арнаментальнай сістэмы. Спадніца з пакупной ці даматканай пераважна шарсцяной ці тонкай тканіны, часцей аднатонна пафарбаваная, называлася саянам. У старажытнасці яе насіла шляхта. Саянам называлася таксама адзенне са сшытых ліфа і спадніцы. Магчыма, тэрмін саян як спадніца з ліфам з'явіўся ў Расіі ў дачыненні да сарафана з беларускіх зямель у XVII—XVIII стст. Да старажытнага віду паяснога адзення належыць панёва — нясшытая ці, радзей, сшытая спадніца тыпу андарака. Магчыма, на нашых землях расхінная панёва папярэднічала андараку. Паверх спадніцы звычайна павязваўся фартух (пярэднік), які прымацоўваўся на таліі завязкамі. Ён рабіўся з адной, дзвюх, рэдка трох полак, яго даўжыня ў Беларусі амаль адпавядала даўжыні спадніцы. Такія доўгія, роўныя спадніцам фартухі мы бачым на выявах пакаёвак на іконе «Нараджэнне Маці Боскай» Маларыцкага майстра (1648—1650 гг.). Паказальна, што на выявах фартухі не арнаментаваныя — адзін натуральнага белага колеру, другі, хутчэй за ўсё, пафарбаваны, хаця ў пазнейшы час яны звычайна ўпрыгожваліся — часцей за ўсё гарызантальнай арнаментыкай, якая праходзіла па ніжнім краі, а таксама магла ісці вышэй. У верхняй частцы фартух дробна прызборваўся, што бачна на іканапіснай выяве. Беларускія фартухі тыпалагічна блізкія да пярэднікаў прыбалтаў, палякаў, што робіць гэты від адзення часткай поліэтнічнай культуры. Яшчэ адзін від адзення, які быў уласцівы беларусам, а таксама заходнім суседзям,— безрукаўка. Гэта было досыць каштоўнае адзенне, яно, як можна меркаваць па пазнейшых этнаграфічных даных, магло перадавацца ў спадчыну. У Беларусі яно мела назву «кабат», «шнуроўка», «гарсэт», «безрукаўка» і інш. Звязаць тып безрукаўкі з пэўнай назвай досыць складана, хаця, напрыклад, назва «шнуроўка» ўказвае на асаблівасць адзення. У XVII—XVIII стст. кабат насілі гараджанкі, шляхцянкі, ад якіх ён паступова перайшоў у сялянскае асяроддзе. Безрукаўкі часцей шылі з пакупнога сукна яркай расфарбоўкі. Найбольш просты і, магчыма, старажытны іх крой — з прамой спінкай, калі спіна рабілася з суцэльнага кавалка матэрыялу. Безрукаўкі ў Беларусі былі даўжынёй да таліі і ніжэй,— заходзілі за верхнюю частку спадніцы. У доўгіх безрукаўках іх ніжнія часткі разрэзваліся і абшываліся. Звычайна на безрукаўках ішоў разрэз спераду, які зашнуроўваўся ці зашпільваўся на хатнія гузікі, на грудзях рабіўся выраз — круглы ці геаметрычна-вуглавой формы. Безрукаўка шчыльна ўпрыгожвалася вышыўкамі, нашыўкамі з выкарыстаннем найлепшых нітак. Як мовілася раней, безрукаўка магла сшывацца са спадніцай, утвараючы саян. На вышэйадзначанай іконе «Нараджэнне Маці Боскай» мы бачым безрукаўкі на дзвюх пакаёўках: кабаты сіняга і

чырвонага аднатонных колераў маюць прамавугольныя выразы на грудзях і падоўжны разрэз спераду. У дадзеным выпадку мы маем справу, хутчэй за ўсё, з кароткім тыпам безрукавак, калі яны не сшытыя са спадніцамі. Безрукаўкі не ўпрыгожаныя ўзорамі, што можа тлумачыцца як даўняй традыцыяй, так і працоўным характарам адзення. Увогуле традыцыйнае беларускае жаночае адзенне, пры агульных састаўных элементах, характарызавалася арнаментальнай стрыманасцю, натуральным колерам; беларускі жаночы строй адрозніваецца ад рускага з яго сарафанам і какошнікам, а таксама ўкраінскага — з кароткімі спадніцамі і шчодрым упрыгожваннем пацеркамі і лентамі.

Верхняе адзенне вясковай жанчыны не вылучалася істотнай своеасаблівасцю: як і ў мужчын, гэта былі сярмяга і кажух, якія прыгадваюцца ў актах XVII—XVIII стст. Яны рабіліся з хатніх матэрыялаў — сукна, палатна, аўчыны, якія спецыяльна апрацоўваліся і шыліся спецыяльнымі краўцамі. Гэтая вопратка не мела падкладкі, магла зашпільвацца на драўляныя гузікі, гаплікі альбо проста падпаясвацца. Найбольш пашыраным відам адзення была світа (сярмяга) — зробленае звычайна з сукна доўгае распашное адзенне з рукавамі, разрэзам спераду і адкладным каўняром. Найбольш пашыраным быў прамы халатападобны крой світы, хаця, як можна меркаваць па даных другой паловы XIX ст., існавалі і іншыя: прыталеная з бакавымі клінамі — «вусамі», у зборкі, з фалдамі. Гэтыя тыпы былі ўласцівыя таксама украінцам, рускім, літоўцам, палякам. Світа была белага ці шэрага, рэдка чорнага (гэта быў колер вопраткі шляхты) колеру, упрыгожванне яе было сціплым. Іншае верхняе адзенне — кажух, рабіўся ў старажытнасці з нядубленых белых аўчын. Найболей пашыраным быў на Беларусі кажух прамога крою, яго мадыфікацыі адпавядалі крою світкі; у адрозненне ад пазнейшых часоў, старажытны кажух быў даўгім. Меней было распаўсюджана верхняе палатнянае адзенне — насоў, балахон, які апраналі на кашулю летам ці восенню.

Істотнае месца ў традыцыйным строі займалі галаўныя ўборы. Яны падзяляліся на сезонныя, святочныя і будзённыя, а таксама адрозніваліся ў залежнасці ад сямейнага становішча і ўзросту. Тыпалагічна вызначальным для ўбору было сямейнае становішча: непакрытыя валасы, косы, вянок (на цвёрдай драўлянай аснове, абшытай палатном, ці летам — з кветак), галаўная павязка, звычайна завязаная вузлом на патыліцы, — былі адзнакамі дзяўчыны. На святы ў косы ўпляталася болей рознакаляровых стужак, вянкі больш істотна ўпрыгожваліся — тут трэба вылучыць вясельны вянок, які, як адзначаў у сваіх творах у другой палове XVIII ст. Е. Кітовіч, да пачатку гэтага стагоддзя быў часткай рытуалу і прадстаўнікоў заможнага саслоўя. Пасля шлюбу галаўны ўбор і прычоска жанчыны мяняліся: косы распляталіся, валасы закручваліся на абшытыя палатном кудзелі галінкі дрэў і ўкладваліся вакол галавы ці закручваліся над вушамі. Адзін з найбольш старажытных жаночых галаўных убораў беларусак, а таксама рускіх, украінцаў, прыбалтаў — намітка: ручніковы галаўны ўбор з тонкага палатна значнай даўжыні (2—3 метры),

якi павязваўся паверх чапца (таксама яшчэ i на цвёрдую аснову) так, каб адзін ці два яго доўгія канцы спускаліся на спіну. Адны з найбольш старажытных выяў галаўных убораў, што нагадваюць наміткі, прысутнічаюць на вядомай іконе Пятра Яўсіевіча «Нараджэнне Маці Боскай» (1649 г.), дзе ў наміткі апрануты св. Ганна і служанкі. Звяртаюць увагу на сябе папярочныя чырвоныя і цёмныя палосы на намітках. У служанкі, размешчанай у цэнтры на пярэднім плане іконы, намітка павязана на авальную абручападобную аснову — хутчэй за ўсё, галаўны ўбор — тып чапца з авальным верхам, вузкім аколышкам і завязкамі ззаду. Тыпалагічна падобныя выявы, якія нагадваюць намітку, сустракаюцца на больш позніх іконах на дадзены сюжэт — напрыклад, творы з Магілёўшчыны канца 1700 г., дзе галаўныя ўборы не маюць упрыгожанняў. Акрамя намітак, беларускія жанчыны насілі ў старажытнасці чапцы — згаданыя вышэй, з круглым верхам, аколышкам і завязкамі ззаду і глыбокі, з завязкай пад падбародкам («каптур»). Існавалі і арыгінальныя рагатыя галаўныя ўборы, зробленыя на цвёрдай аснове і абвязаныя палатном (старажытны тып — «пушанка»).

Падобным на мужчынскі быў і жаночы абутак. Асноўным відам яго былі плеценыя з лык ліпы, лазы, бяросты, пянькі ці скураныя лапці. Як можна меркаваць, найбольш старажытнымі былі лапці прамога пляцення. Лапці надзяваліся на анучы — летнія ці зімовыя, прымацоўваліся пры дапамозе вяровак-абор. Найбольш просты тып лапцей — без галовак і запятак, дзе іх замянялі лыкавыя петлі і прыстасаванні для прымацавання абор. Меліся і скураныя лапці (пасталы), але шырокага распаўсюджвання яны не набылі. Акрамя лапцей, насілі скураныя паўсапожкі на абцасах (чаравікі), але гэта быў дарагі абутак. Таксама заможныя сяляне маглі мець валёнкі. Як досыць рэдкі від абутку можна вылучыць драўляны — цалкам з дрэва ці са скураным верхам.

### *2.2.2. Мужчынскае адзенне*

Традыцыйнае мужчынскае адзенне беларусаў вызначалася меншай разнастайнасцю, чым жаночае. Яно складалася з тыпалагічна падобных частак, а верхняе, зімовае і восеньскае, мала чым адрознівалася ўвогуле. Яго асноўныя элементы мелі поліэтнічны характар, асабліва што тычыцца ўсходніх славян. Як і ў жанчын, яго аснову складала кашуля (сарочка), якая шылася з палатна, часта крыху горшага за жаночае. Найбольш старажытны крой кашулі — уласцівы многім народам Еўропы са старажытнасці — тунікападобны, калі, як і ў жанчын, кашуля рабілася з аднаго кавалка палатна, у якім у сярэдзіне рабілася адтуліна для галавы і з бакоў прышываліся рукавы; з бакоў маглі прышывацца кліны. Наступны тып — кашуля з палікамі, якія прышываліся на плячах, — таксама мае шырокі арэал распаўсюджвання. Найбольш старажытны каўнер сарочкі — невялікі па вышыні, які па акружнасці абыходзіў вакол шыі. Таксама былі старажытныя кашулі з адкладным каўняром. Кашуля мела

разрэз па цэнтры, які завязваўся тасьмой, стужкай, зашпільваўся на самаробныя гузікі. Можна меркаваць, што найбольш старажытнымі былі прамыя рукавы, без манжэтаў. Кашулі насіліся навыпуск, былі досыць доўгімі і абавязкова падпаясваліся. Хаця на малюнках Кобрынскага інвентара 1742 г. мы бачым працуючых сялян у досыць кароткіх кашулях ці куртках. У параўнанні з жаночай, мужчынскія кашулі ўпрыгожваліся сціпла — на грудзях, каўняры, па нізе — і то пераважна святочныя. Яшчэ адзін элемент мужчынскай вопраткі — штаны (нагавіцы, ганавіцы) рабіліся з палатна (для нашэння летам), сукна (каб насіць узімку) не надта высокага гатунку. Беларускія штаны былі параўнальна не шырокія, іх адрознівала рамбавідная форма ўстаўкі паміж штанінамі, хаця мелі месца і ўстаўкі іншай формы — трохвугольнай, круглай, трапецыявіднай. Штаны трымаліся на шнурку, што праходзіў праз абшыўку ў верхняй частцы. Суконныя штаны маглі зашпільвацца на адзін ці два гузікі з косці, скуры, кавалачка дрэва. Штаны не мелі кішэней. Абавязковай прыналежнасцю мужчынскага касцюма быў пояс — старажытны плецены ці тканы. На поясе вісеў невялічкі мяшочак — каліта, у якім захоўваліся грошы, тытунь, люлька, крэсіва, нож (мог вісець асобна). Сяляне таксама насілі скураныя рамяні, якімі падпаясвалі світкі. Здаўна ( узгадваюцца ў актах XVI—XVII стст.) беларускія мужчыны насілі безрукаўкі (камізэлькі, жупіцы). Яны вядомыя двух тыпаў — прамыя і ў талію. У старажытнасці маглі насіць і нагруднікі — прамавугольныя кавалкі сукна ці аўчыны з прышытым каўняром, зашпіленым ззаду. Мужчынская світа і кажух па сваіх відавых асаблівасцях мала адрозніваліся ад жаночых. Гэтага нельга сказаць аб галаўных уборах, якія рабіліся з воўны, футра, сукна, саломы. Традыцыйны летні галаўны ўбор — сплеценая з саломы (радзей лазы, чароту) шыракаполая шляпа з верхам — капялюш (брыль). Са старажытных актаў вядомы магеркі — валеныя шапкі з палямі, што прылягалі да верха, а таксама валеныя брылі і інш. Старадаўнія зімовыя шапкі шыліся з футра белкі, лісы, зайца, а таксама з аўчыны футрам звонку. Найбольш старажытныя, з аўчыны,— былі высокія, цыліндрычнай, конусападобнай формы — кучмы. Зімовая шапка падкрэслена вялікіх памераў называлася капуза. Бытавала і футравая шапка, абшытая зверху сукном, з вушамі — малахай. Досыць старадаўняй была і пашытая звычайна з аўчыны аблавуха — шапка з вушамі па баках і спераду і ззаду (яны падвязваліся зверху). Мужчынскі абутак складаўся з лапцей (такіх жа, як і ў жанчын), ботаў (рэдкі, пераважна мужчынскі абутак), валёнак.

## 2.3. Адзенне гараджан

Гарадское адзенне ў сваіх лепшых узорах арыентавалася на шляхецкі строй — у першую чаргу ў сэнсе яго каштоўнасці і багацця. Разам з тым, як і ў іншых выпадках, шляхта строга ахоўвала свае прывілеі

на нашэнне дарагой вопраткі. Гэта праявілася ў неаднаразовых афіцыйных сеймавых, магістрацкіх забаронах мяшчанам, асабліва жанчынам, насіць як дарагія ўпрыгожанні, так і пэўныя віды адзення, а таксама адзенне з дарагіх матэрыялаў — шоўку, аксаміту. Ужо на сейме ў 1613 г. мяшчанству, за выключэннем магістрата, забаранялася насіць дарагое адзенне, футра — у першую чаргу з лісы; у 1655 г., акрамя дарагога адзення, пад пагрозай штрафу ў 1000 грыўняў забараняліся сабаліныя, рысіныя футры, шаўковыя паясы. Мяшчанкам не дазвалялася насіць рагоўкі з абручамі з кітовага вуса. Тым не менш, падобна да таго, як мяшчане ўпарта імкнуліся набыць шляхецтва, што і паспяхова рабілі ў XVIII ст. дзякуючы грошам, росту маёмаснага становішча, так і мяшчанскае адзенне не перапыняла спроб зраўняцца па якасці са шляхецкім. Тым больш, што матэрыяльныя магчымасці для гэтага былі: асноўны імпарт тканіны з захаду ішоў праз Брэст і Гродна, ды і на рынках іншых беларускіх гарадоў — Магілёва, Віцебска — прысутнічалі як мясцовыя, так і замежныя матэрыялы для вырабу адзення і яно само. Сярод мужчынскага адзення купцоў, рамеснікаў акты называюць жупан, кунтуш, каштоўныя паясы, рамяні, апончы (плашчы), кафтаны фарбаваныя, сярмягі, кажухі, шубы. Характэрна, што мяшчане часта рабілі жупан з канапляных валокнаў, падобных па колеры на атласавыя. На галовах насілі магеркі, капялюшы, абуваліся ў боты. Выхаднымі былі боты саф'янавыя — жоўтыя ці чырвоныя, будзённыя — чорныя. Мяшчане не пазбягалі ўпрыгожванняў: былі папулярнымі пярсцёнкі, сігнеты, пазней — пазалочаныя табакеркі.

Жаночы строй уключаў кашулі з тонкага палатна з манжэтамі, шытую безрукаўку (гарсэт), спадніцу, фартух. Сярод мяшчанскага адзення прыгадваюцца юпкі — часта з кароткімі рукавамі, гузікамі, якія апраналіся на гарсэт. Зімовыя падшываліся футрам, летнія падбіваліся кітайкай ці палатном. Папулярныя былі і кантушкі з вісячымі дэкаратыўнымі рукавамі. Насілі таксама сукні, салопы. У XVIII ст. атрымалі распаўсюджванне мантылы. Недзе з XVII ст. насілі разнастайныя тонкія і грубыя панчохі. На галаву надзявалі футравы каўпак, часта надзеты на чапец, разнастайныя, нярэдка футравыя чапцы, хусткі — часта чорныя. Сярод мяшчанскага адзення былі распаўсюджаныя рантухі — асабліва з тонкага фламандскага палатна. З пачатку XVII ст. былі папулярныя высокія чапцы з каронкай, з другой паловы XVII ст. прыйшла мода на нізкія чапцы, з футравай абляמоўкай па краі. Асаблівай павагай у мяшчанак карысталіся дарагія адамашкавыя абшытыя золатам чапцы. Яшчэ адзін папулярны чапец — абшыты золатам ці срэбрам з каронкай з футра. На нозі надзявалі модныя высокія боты, з вострым наском. Заможныя мяшчанкі Рэчы Паспалітай у XVII ст. аддавалі перавагу заходнім строям — пераважна іспанскім з нямецкімі, французскімі ўплывамі, што патрабавала каштоўных матэрыялаў — адамашка, аксаміту. Увогуле, адзенне заможных мяшчанак не на шмат рознілася ад строю заможнай шляхцянкі. Заможная мяшчанка на старажытнай выяве апранута ў аксамітную безрукаўку з невялікімі рука-

вамі, атласную спадніцу, вышыты срэбрам чапец, прыбраны футрам. Як і ўся культура Рэчы Паспалітай, з другой паловы XVIII ст. мяшчанская мода зазнала французскія і нямецкія касмапалітычныя ўплывы.

# 3. ЕЖА

## 3.1. Шляхецкая ежа

Істотнае месца ў шляхецкай культурнай мадэлі займалі ежа і ўсё, чым суправаджалася яе спажыванне,— посуд, застольны рытуал, яго атмасфера. Трэба адзначыць як станоўчую рысу шляхецкай культуры тое, што прыняцце ежы з самага пачатку не было простым яе спажываннем, а мела характар менавіта рытуалу, які нёс пэўную ідэйную нагрузку, маніфеставаў тэмы братэрства, узаемнай пашаны, гасціннасці. Гэта не было навіной для тагачаснай культуры: як можна меркаваць па запісах XIX ст., рытуалізацыя ежы была ўласцівая і сялянству. Але добрыя матэрыяльныя магчымасці, а таксама высокі ўзровень элітнай карпарацыйнай самасвядомасці шляхты зрабілі менавіта шляхецкае застолле ўзорным, мадэльным для тагачаснага грамадства. Гэта быў шляхецкі рытуал, распрацаваны да дробязі, ухіленне ад якога выклікала абразу грамадства.

Зыходзячы з тых матэрыялаў, што маюцца ў нашым ужытку, шляхецкае застолле часоў Рэчы Паспалітай можна ўмоўна падзяліць на два перыяды, мяжой паміж якімі з'яўлялася другая палова XVIII ст. Менавіта прыблізна з гэтага часу пад уплывам дамінантнай для Еўропы французскай, італьянскай, англійскай моды шляхецкае застолле ўскладнілася, зрабілася больш элегантным, вытанчаным з пункту гледжання яго аздаблення, дыяпазону ежы, страў. Можна сказаць, што з гэтага часу прыкметна вырасла роля застолля як адметнай рысы шляхецкага стылю жыцця з яго паказной раскошай, якая каштавала разарэння, фінансавага банкруцтва не аднаму шляхціцу. У апошнія сто гадоў існавання Рэчы Паспалітай менавіта застолле зрабілася візітнай карткай тутэйшай культуры ўвогуле, дзяржавы, шляхты і шляхецкага ладу жыцця з яго шчодрасцю, размахам, гасціннасцю.

Шляхецкае застолле часта было месцам абмеркавання сур'ёзных спраў, як адбывалася на сейміках і сеймах, калі дэпутаты запрашаліся ўплывовымі панамі на своеасаблівыя застольна-арганізацыйныя сходы, дзе вырашаліся істотныя пытанні палітычнага, эканамічнага жыцця. Менавіта за агульным сталом сустракаліся сярэдне- і нават малазаможны шляхціц і прадстаўнікі вышэйшай шляхты, магнатэрыі і дэклараваўся «святы» для шляхты прынцып роўнасці. Менавіта за сталом заможны пан фарміраваў сваю шляхецкую «партыю», якая стаяла за яго на сеймах, сейміках, у цяжкіх абставінах таго багатага на ўзброеныя дзеянні часу.

Аб значэнні застолля сведчыць уседзяржаўная вядомасць яго шчодрых заўзятараў, добрых пітакоў, якія займалі ў грамадскай свядомасці пачэснае месца побач са славутымі ваярамі, інтэлектуаламі, палітыкамі.

Шляхецкае застолле было рознае, як і рознай па ступені заможнасці была шляхта. Але мадэльным было застолле магнатэрыі, на якое арыентавалася заможная і сярэдняя шляхта. Як і любое застолле, яно падзялялася на будзённае і святочнае, звязанае з каляндарнымі рэлігійнымі святамі; асаблівым застоллем адзначаліся падзеі сямейнага жыцця, разнастайныя ўрачыстасці — прыбыццё госця, грамадская, палітычная падзея. Увогуле заможныя шляхціцы трымалі звычайна адкрыты стол — гэта значыць, што ў пэўныя гадзіны за ім мог падсілкавацца любы шляхціц. Шмат народу збіралася на званыя застоллі, на якія запрошаны госць мог прыходзіць са сваёй шляхтай. Выбранае кола гасцей збіралася на прыватнае застолле. Фактычна ў заможных дамах застоллі з гасцямі ладзіліся кожны дзень — гэта было своеасаблівай абавязковай прыналежнасцю стылю жыцця заможнага шляхціца.

### *3.1.1 Аздабленне стала*

Вялікае значэнне ў застоллі мела аздабленне стала, якое, у першую чаргу, падаваў посуд, які з цягам часу рабіўся ўсё больш вытанчаным. Хаця з пункту гледжання матэрыяльнай каштоўнасці новага посуду, які з'яўляўся на стале, істотнага прагрэсу не назіралася — фамільнае срэбра, якое паступова знікала са стала, коштам і мастацкай якасцю мала саступала папулярным шклу, фаянсу. Увогуле, з самых ранніх часоў Рэчы Паспалітай стол для ежы рыхтаваўся ў заможнай шляхты старанна. Ужо ў XVII ст. сталы пакрывалі багатымі дыванамі, у тым ліку турэцкімі і персідскімі. На іх клалі прыгожа вышытыя абрусы — па адным для кожнага з гасцей, паверх дывана і абруса слалася яшчэ белае палатно. Індывідуальныя сурвэткі з'явіліся дастаткова позна — недзе з сярэдзіны XVIII ст.; хто іх не меў, карыстаўся насавой хустачкай.

Відавочны прагрэс назіраўся ў вобласці посуду — пашыраліся яго віды, адбывалася індывідуалізацыя. Так, у XVII ст. асобныя талеркі для кожнай стравы былі толькі ў цэнтральнай частцы магнацкіх сталоў. Далей ад цэнтра елі з аднаго посуду, а запоўненыя рэшткамі талеркі аддавалі для ачысткі слугам ці, зрэдку, госці самі выкідвалі рэшткі ежы ў цёмны кут, малашляхетныя госці маглі выкінуць усё пад стол. Увогуле стравы, пераважна мясныя, падаваліся на вялікіх блюдах, да якіх трэба было дацягвацца кожнаму паасобку, і тут усё залежала ад спрытнасці і месца за сталом. Розны посуд для розных страў шырока пачаў выкарыстоўвацца прыблізна з першых дзесяцігоддзяў XVIII ст. Індывідуальныя кілішкі таксама распаўсюдзіліся з гэтага перыяду — раней госці пілі па чарзе з аднаго келіха, які перад піццём маглі выціраць насоўкай. У XVII ст. існавалі асобныя келіхі для дам. У пазнейшы час склаўся тыповы індывідуальны сталовы набор прадметаў: перад кожным госцем ставілі

зменную талерку, кілішкі для віна і вады, бутэлькі з віном і вадой, клалі сурвэтку (сурвэтка таксама засоўвалася за каўнер), а таксама нож, відэлец, лыжку. Піва для жадаючых разносілі ў шклянках.

Адно з цэнтральных месц у наборы посуду займалі келіх (кубак), кілішак (адносна невялікі па памеры посуд для пітва). Згодна з класіфікацыяй XVI ст., келіхі бывалі шкляныя (гэта самы распаўсюджаны тып келіха, які меўся ў шляхты ў досыць вялікай колькасці і час існавання якога быў досыць абмежаваны), срэбныя; меліся таксама гліняныя куфлікі — для піва. Келіхі першапачаткова былі ў асноўным нямецкага паходжання і рабіліся па нямецкім узоры, але з другой паловы XVIII ст. на нашых землях пачаў шырока вырабляцца якасны шкляны пераважна бясколерны посуд, у тым ліку і для пітва, на мануфактурах у Налібоках і Урэччы. Акрамя келіхаў і кілішкаў ствараліся вялікія «шкляніцы» з накрыўкамі, арыгінальныя «дубельты» — дзве спаяныя чашы, «куляўкі» — вялікія келіхі без падстаўкі, бакалы, стромкія флеты, а таксама вялікая колькасць посуду для ўтрымання напояў: розныя бутэлькі, графіны, жбанкі, фляґі і г. д.

Што да сталовага посуду, дык яго відавая разнастайнасць заўсёды адрознівала шляхту. Гэта гліняны посуд, які па традыцыі захоўваўся на ліштвах-паліцах: міскі, паўміскі, талеркі, падносы, куфлі, медніцы, жбаны, жбаночкі, кубкі, блюдцы і інш. З металу рабіліся кубкі, чаркі, піўныя конаўкі, талеркі, місы, паўмісы, ступкі, кварты, наліўкі, фляшкі і інш. Сярод кухоннага посуду гэта катлы, кацялкі, скавародкі, верцялы і да т. п.

Асобнай увагі заслугоўваюць сталовыя прыборы — нож, лыжка, відэлец. З іх найбольш старажытным з'яўляецца нож, які быў асноўнай прыладай на стале да XVIII ст., — у Еўропе сярэдневяковай, а таксама часоў Рэнесансу елі рукамі, дапамагаючы сабе нажом, — так было нават пры каралеўскіх дварах, нават такіх, як італьянскі, французскі. З антычных часоў у Еўропе ўжываліся лыжкі, якія, адзначым, часта сустракаюцца яшчэ ў егіпецкіх пахавальніцах — напэўна, егіпцяне імі елі і раздавалі ежу. У другой палове XVIII ст. відавы дыяпазон лыжак паступова нарастаў — ад вялікіх раздатачных да зусім маленькіх для солі і гарчыцы. Апошнім з вядомых нам прадметаў для ежы на стол патрапіў відэлец. У традыцыйнай для яго функцыі — для непасрэднай ежы — відэлец выкарыстоўваўся ў Візантыі ў IV ст. н. э. Яго адносна шырокае распаўсюджванне ў еўрапейскіх краінах пачалося ў другой палове XVI ст. У Рэчы Паспалітай ён з'явіўся на шляхецкіх сталах у XVII ст. Старажытны відэлец мала нагадваў цяперашні — ён быў прамы, зроблены з цэльнага кавалка металу (без падзелу на ручку і рабочую частку), з двума доўгімі зубамі і па форме цягнуўся да нажа. Толькі ў XVIII ст. ён пачаў набываць сваю сучасную, адметную форму — з'явілася выгнутасць, параўнальна кароткія тры-чатыры зубы. Цікава, што відэлец складана прыжываўся ў Еўропе — да яго падазрона ставіліся нават пры французскім двары Луі XIV, не адразу яго прынялі ў Англіі, адносна рэдка ў параўнанні з нажом і лыжкай ён прысутнічаў і ў сталовым наборы шляхты. Самай рэдкай з'явай быў разда-

тачны відэлец. Працяглы час нож, лыжка, відэлец былі асабістымі рэчамі шляхціца, іх вазілі з сабой у спецыяльным футляры. З 1730 — 40-х гг. сярод дваровай шляхты нават распаўсюдзілася мода насіць з сабой нож, лыжку, зрэдку відэлец у скураным са срэбнай аддзелкай футляры. На не надта шыкоўным застоллі срэбныя лыжкі, нажы, відэльцы, а таксама фарфоравыя, фаянсавыя талеркі размяшчалі звычайна на сярэдзіне стала, дзе сядзелі найбольш шаноўныя госці. Па краях клалі бляшаныя ці цынкавыя лыжкі, нажоў і відэльцаў маглі не даваць увогуле, маючы на ўвазе тое, што гэтыя прылады госці прынясуць з сабой. Хто не меў сваіх відэльца і вілкі, мог пазычыць у суседа, а найбольш спрытныя рабілі прыладу са скарынкі хлеба на нажы.

Рост дабрабыту, а таксама ўплыў французскай моды, істотна змяніў сталовы посуд XVIII ст. Прыблізна з 1730-х гг. традыцыйнае фамільнае срэбра пачаў дапаўняць посуд з фаянсу, а таксама больш дарагі за срэбра фарфор. Паступовы адыход ад ежы на срэбры меў пазітыўны вынік у сэнсе аховы здароў'я — шляхта магла паўтарыць вопыт старажытных рымлян, дзе мода на срэбны посуд выклікала шэраг спецыфічных хвароб. З новага матэрыялу выраблялся шматлікі сталовы посуд: з фарфору рабіліся «сервізы», талеркі, місы, салатніцы, салянкі, графіны, ручкі нажоў і відэльцаў. Цэнтральнае месца на стале займалі два ці тры «сервізы» — 5—6-павярховыя канструкцыі, на якіх размяшчаліся прыправы, лімоны. Для спецый існавалі таксама спецыяльныя «фражэтавыя» наборы невялікіх судкоў. Былі і сервізы ў сучасным разуменні гэтага слова — сталовыя комплексы, у склад якіх уваходзілі вытрыманыя ў адной стылістыцы келіхі, кілішкі, бакалы, графіны, флягі. На сталах з'явіліся срэбныя вядзёркі з ільдом для вады і віна і, як ужо адзначалася, шматлікія віды лыжак і відэльцаў. Пашырэнне асартыменту ежы і напояў выклікала з'яўленне новых відаў посуду — дэсертных талерачак, салатніц, кубачкаў для гарбаты і інш. Шкляныя вырабы маглі аздабляцца гравіроўкай, асноўнымі тэмамі якой былі геральдыка, выявы жывёлін, краявіды, часта з выявай сядзібы, міфалагічныя сюжэты і інш. Талеркі пачалі падаваць праз сурвэтку, на іх краях клалі драўляныя зубачысткі. Як можна меркаваць, паменшыліся і памеры талерак — порцыі зрабіліся драбнейшымі, іх змены — больш частымі.

### *3.1.2. Рытуал*

Безумоўна, асноўны змест застолля складала прыняцце ежы, тым больш што шляхецкія стравы адрозніваліся высокай каларыйнасцю, а жыццё шляхты — значнай фізічнай актыўнасцю. Але істотную, знакава-семантычную ролю адыгрываў характэрны застольны рытуал, які адлюстроўваў і фарміраваў сістэмаўтваральныя кампаненты шляхецкага светаўспрымання, пастулаты гонару, узаемнай павагі, культу гасціннасці. Асноўнымі адпраўнымі кропкамі застольнага рытуалу былі тосты (здравіцы), дзе галоўную ролю адыгрываў гаспадар.

Спачатку ўсе добра частаваліся, каштавалі асноўныя перамены страў да апошняй — салодкага. Пасля гэтага пачыналася ўласна застолле са здравіцамі і пітвом. Гэта падаецца досыць рацыянальным звычаем, так, добра пад'еўшы перад пітвом, робяць у Еўропе і зараз. Як лічаць медыкі, у гэтым выпадку алкаголь у меншай ступені распаўсюджваецца па арганізме, чым пры актыўным закусванні.

Перад пачаткам застольнага рытуалу на стол ізноў падавалася мяса. Рытуал пачынаў гаспадар, які малым кілішкам, што выкарыстоўваўся ў гэтай частцы рытуалу, піў па чарзе ў гонар усіх прысутных, пачынаючы з самых знакамітых, у гонар якіх ён уставаў. Шануючы іншых, ён казаў: «Здароўе пана!» —і падносіў кілішак да вуснаў. Ідэя роўнасці і павагі праяўлялася ў тым, што гаспадар не прапускаў нікога, нават тых, каго не ведаў,— у дачыненні да іх ён проста глядзеў у бок госця і ўздымаў кілішак. Паралельна найбольш пачэсныя госці пачыналі піць за сваіх «васалаў»— шляхту, што групавалася вакол сваіх лідэраў, так што, як адзначаў сучаснік, гоман стаяў нядрэнны. У канцы гэтай часткі застолля ўсе пілі стоячы за здароўе ўсіх.

Дзеля другой часткі застолля выносіліся вялікія келіхі, а таксама абнаўлялася ежа — падаваліся печаныя мясныя стравы. Ізноў рэй вёў гаспадар — ён уставаў і зноў піў за здароўе гасцей, пачынаючы з самага шаноўнага. Пасля здравіцы ён перадаваў свой кубак госцю і той таксама піў за гаспадара, вяртаючы яму кубак. Падчас пітва ўсе госці ўставалі. Як можна меркаваць, індывідуальнай здравіцай шанаваліся толькі найбольш знакамітыя госці. За астатніх пілі за ўсіх адразу —«класамі» — за дам, духавенства, вайскоўцаў. Такім чынам, усё грамадства амаль беспярапынна ўставала і сядала, пазбегнуць гэтай гімнастыкі маглі толькі дамы параўнальна сталага веку і тыя, хто не асільваў гэты марафон і не патрабаваў значнай даліўкі. Гэта была найбольш цяжкая і складаная з пункту гледжання пітной нагрузкі частка рытуалу — вялікі келіх трэба было выпіваць залпам, адразу да канца, і рабіць гэта прыходзілася не раз — у залежнасці ад колькасці здравіц. Недапіць, схаваць, пакінуць недалітым келіх было складана — за кожным уважліва сачылі слугі, некаторыя гаспадары саджалі іх нават пад стол.

Вядома, не ўсе вытрымлівалі гэты іспыт — іншым рабілася дрэнна прама за сталом, але, трэба адзначыць, што прысутныя ўспрымалі гэтыя падзеі з гумарам. Тым не менш, такі госць пасля вяртання за стол абіраў сабе іншае месца. Некаторыя, як старажытныя рымляне на сваіх пірах, рабілі сабе штучную рвоту і зноў вярталіся працягваць застолле. Увогуле ўменне стойка вытрымліваць вялікія дозы спіртнога шанавалася ў тагачасным грамадстве і лічылася паказчыкам моцы. Цяжка было і сысці цішком — аб такім учынку паведамлялася гаспадарам, і ўцекача спынялі звычайна каля карэты і прымушалі піць за гаспадара, гаспадыню, грамадскасць і г. д., ад чаго адмовіцца было бестактоўна, у выніку чаго госць даходзіў да адпаведнай кандыцыі. Фінал такога застолля быў часта катастрафічным для гасцей — разбітыя лбы, насы, сон дзе прыйдзецца,

зрэдку — лятальны зыход. Як сведчылі сучаснікі, гаспадар з задавальненнем успрымаў хваробныя для гасцей вынікі застолля, якія, як можна меркаваць, у яго вачах служылі пацверджаннем яго гасціннасці. Што да гаспадара, дык, як бачна, асноўная рытуальная і піцейная нагрузка прыходзілася на яго і вытрымаць яе па-сапраўднаму было досыць цяжка. Таму ён мог ісці на хітрыкі — піў падфарбаваную пад колер віна ваду.

З другой паловы XVIII ст. пад уплывам еўрапейскай культуры, стыляў барока, ракако ў шляхецкі быт увайшла музыка, з'явіліся прыватныя аркестры, капэлы. Музыка зрабілася істотнай часткай прыёмаў, што суправаджаліся застоллямі і танцамі і рабіліся з самай living нагоды — пачатку дзейнасці сейміка, прыбыцця вядомай асобы, імянін караля, атрымання службовай пасады, выздараўлення, вяселля і г. д. Шырока выкарыстоўваць музыку маглі дазволіць сабе магнаты, што мелі прыватныя капэлы, такія, як вядомыя за межамі нашага краю нясвіжская Радзівілаў, слонімская М. К. Агінскага, гарадзенская А. Тызенгаўза. Разам з тым мець невялікі аркестрык мог дазволіць сабе не толькі магнат. У гэтым выпадку застолле суправаджалася танцамі, прычым музыкі сядзелі ў суседнім пакоі. Пад уплывам канцэпцыі «прыроднага чалавека» Ж. Ж. Русо атрымала распаўсюджанне ежа на прыродзе. Так, застоллі пад адкрытым небам ладзіліся каля Нясвіжскага замка, у парку «Кансаляцыя» ці побач з ім, у пастаўленых спецыяльна шатрах у суправаджэнні музыкі капэлы.

### *3.1.3. Ежа*

Ежа шляхты вылучалася каларыйным, бялковым характарам, у ёй вялікае месца займала мяса, што прынцыпова адрознівала яе ад ежы сялянскай, дзе пераважалі вугляводы і быў недахоп бялкоў і тлушчаў (асабліва вясной). Гэта адпавядала тыпу шляхецкай жыццядзейнасці, насычанаму вайсковымі справамі, палітычнай дзейнасцю — тым, што называецца актыўным маторным пачаткам. Характар ежы адбіваўся і на знешнім выглядзе шляхціца: на тагачасных партрэтах мы бачым мажных, але не тлустых, разам з тым не стромкіх шляхціцаў, з чаго можна рабіць выснову аб тым, што пэўная ўпітанасць не лічылася заганай. Гэты шляхецкі тып адрозніваўся ад рускага, дзе вялікі жывот падкрэсліваў значнасць асобы, а таксама ад, кажучы сучаснай мовай, спартыўнага, субтыльнага целаскладу французскіх, іспанскіх, італьянскіх дваран.

Шляхціцы сур'ёзна ставіліся да ежы і з цягам часу гэта перайшло ў яе культ, які ў другой палове XVIII ст. набыў вытанчаны характар. Ужо ў XV ст. князі на нашых землях мелі сваіх кухмістраў, пасля Люблінскай уніі была ўведзена пасада кухмістра Вялікага княства Літоўскага. Але гэтая пасада была хутчэй ганаровай; побач з ёй кароль і магнаты мелі сваіх сапраўдных кухмістраў-павароў. Згодна з тэкстам XVII ст., ён павінен быць прыбраны, галава можа быць падголена, рукі

чыстыя, пазногці абрэзаныя, апрануты ў белы фартух, цвярозы, не старыя і, зразумела, быць добрым спецыялістам у прыгатаванні страў. Зрабіцца майстрам кухарскай навукі было складана: трэба было прайсці шлях вучобы, пачынаючы ад простай прыслугі на кухні да выпрабавання майстэрства яго настаўнікам і вядомымі кухмістрамі. У рэшце рэшт прэтэндэнт атрымліваў упрыгожаны малюнкамі, пазалочаны патэнт і ўрачыста прымаўся ў суполку кухмістраў. Гісторыя захавала імёны славутых каралеўскіх кухмістраў — Бальцэр Плата, Дамінік Алемані, Пётр Жэроньскі, Фердынанд Валыньскі і інш. Самымі каштоўнымі лічыліся повары, якія рыхтавалі гарачыя, вараныя стравы.

Як і ўся тагачасная шляхецкая культура, кухня часоў Рэчы Паспалітай падзяляецца на два перыяды, мяжой паміж якімі можа ўмоўна лічыцца сярэдзіна XVIII ст. Старажытная кухня, як і пазнейшая, адрознівалася перавагай мясных страў, і тут мы саступалі хіба толькі палякам з іх традыцыйнай схільнасцю да мяса. Разам з тым ежа старажытнага перыяду была больш простай, без вытанчаных, зробленых з замежных прадуктаў ці па замежным узоры страў. З жыдкіх страў спажывалі булён (мясны, посны), боршч, у Польшчы, а магчыма і на нашых землях, рабілі традыцыйны польскі бігас — перамешаныя і звараныя з квашанай капустай дробныя кавалкі сала, каўбас (папулярны быў гультайскі бігас). Досыць папулярным быў «боршч літоўскі» — з буракоў, з яйкамі, смятанай, просам. З мясных страў спажывалі птушак — фаршыраваных грыбамі з пярловай кашай і смятанай гусей, кур, куранят, індыкоў, дзікіх птушак — перапёлак, курапатак, качак, дробную птушку. Як можна меркаваць, птушынае мяса складала істотную частку рацыёну шляхціца. Елі проста кавалкі смажанага мяса, папулярныя былі каўбасы (літоўская, італьянская, венская, сальцісон (кравяная), вантробы (рубец), запраўленыя жоўтым шафранам («жаўтабрухі»), кішкі чорныя, белыя, рысавыя, цяляціна са смятанай, бараніна з часнаком, заліўное з валовых ног, капчоная гавядзіна, мяса зайца, серны, аленя, лані, дзіка. Рабілі вэнджаную бараніну па-татарску, вэнджаных парсючкоў, кумпякі, шынкі, паляндвіцы. Былі ва ўжытку рулеты — з парасяціны, свініны, рыбы. Ужывалася і рыба — вэнджаныя, падпечаныя, вяленыя самы, шчупакі, плоткі, вугры. Асноўная колькасць мясных страў выносілася на вялізных прымацаваных адна пад адной місах, дзе паступова ад верху да нізу ляжалі гавяджая пячонка, цяляціна, бараніна, індычкі, гусі, капланы, кураняты, курапаткі і ўверсе — самае дробнае птаства.

Вельмі папулярнымі стравамі на нашых землях былі паўгускі — вяленыя паловы гуся, а таксама гусь «чорны» — зроблены цалкам у вуголлі з мёдам, воцатам, перцам. На сняданне і падвячорак не надта заможная шляхта спажывала страву з яечных жаўткоў і смятаны — сялянку. Шырока было распаўсюджана саленне (асабліва агуркоў), квашанне (капусты, буракоў), марынаванне (фасолі, гароху, яблык) садавіны і гародніны. Ужывалі грыбы: рыжыкі, баравікі салілі, марынавалі, шампіньёны — салілі, усе гэтыя грыбы — сушылі. З салодкіх страў рабілі шматлікія

варэнні і цукровыя і мядовыя жэле. Параўнальна няшмат, акрамя свят, ужывалі мучных вырабаў: жытні хлеб, разнастайныя віды булак (шафранавыя, запараныя, фармавыя, посныя), абаранкаў, сухароў (вылучаліся крохкія на пост), а таксама велікодныя стравы — бабкі: жаўтковая, запараная, грэцкая, хлебная, мазуркі — каралеўская, на дражджах з пенай, тарты — яблычны, хлебны і інш. З раслін ужываліся морква, пастарнак, буракі, капуста, часнок, цыбуля. Прыправамі служылі гваздзіка, перац, шафран, мёд; далікатэсамі былі лімон, воцат, які замянялі квасам. Не надта шырока, але выкарыстоўваліся соусы.

Пад французскім, італьянскім уплывамі прыкладна з 1730-х гг. стравы рабіліся больш разнастайныя, вытанчаныя, порцыі меншыя — за адзін раз маглі выносіць да 60 страў, у кухню ўвайшлі замежныя прадукты, стравы. З'явіліся французскае рагу, паштэт, фарш, якім шчодра шпігавалі парасят, бараноў, курэй. Прыйшла разнастайная рыбная кухня — у моду ўвайшлі рыбныя абеды. Рыбу рабілі ў сваім саку, а таксама ў мясным соусе, з саланінай, у віне (ласось у бургундскім); перад рознымі стравамі пачалі ўжываць для апетыту селядзец. Рыбу таксама марынавалі (міног), пяклі, вэндзілі. Распаўсюдзіліся салаты. Прыйшлі дэлікатэсныя прыправы, эсенцыі, мода на лімон, аліўкі, труфелі. Шырока распаўсюдзіліся тарты, пячэнне, бісквіты, пачалі ўжываць цукеркі, цукар выцесніў мёд. Пачалі шмат піць кавы — з малаком і з цукрам — з гэтага пачынаўся ранак; шмат пачалі піць таксама гарбаты; распаўсюдзілася спецыяльная араматызаваная вада. З італьянскай і французскай кулінарый прыйшла мода на экзатычныя стравы: жаб, чарапах, вустрыц, слімакоў, яечкі маладых ягнят і цялят, курыныя грабяні і інш.

Істотна змяніліся і алкагольныя напоі. Раней традыцыйна перавага аддавалася самаробным прадуктам — запраўленай натуральнымі раслінамі гарэлцы: малінаўцы, апельсінаўцы, міндалеўцы, кардамонаўцы, аераўцы, мятнай, анісаўцы і інш. З пакупной была папулярная гарэлка гданьская. У вялікай колькасці рабілі наліўкі: вішнёвую, малінавую, з парэчак, а таксама лікёры — гваздзіковы, сунічны, малінавы. Было і хатняе віно — з агрэсту, парэчак, таксама сідр. З XVIII ст. пачалі распаўсюджвацца віны рознага гатунку — пераважна французскія, венгерскія, італьянскія. Прычым на нашых землях шанаваліся віны венгерскія — пераважна такай, а таксама французскія; карыстаўся попытам македонскі мускатэль; у XVII ст. сустракаем таксама віны крыцкія, іспанскія. Сярод рэдкіх і каштоўных він, якія маглі сабе дазволіць досыць заможныя людзі, было шампанскае і бургундскае. А самым распаўсюджаным напоем сярод шляхты, а таксама гараджан, заставалася піва — сярод гатункаў якога ўсё больш было каштоўнага замежнага — нямецкага, англійскага. Шляхта спажывала яго са спецыяльнага посуду — доўгіх шкляных кіёў, куфляў, шкляніц з трыма абручыкамі, а таксама шырока выкарыстоўвала ў гастранаміі — рабіліся піўныя супы, у піве варыліся каўбасы, яго ў гарачым выглядзе спажывалі з мёдам ці макавым малаком. Бочкі з півам шляхта выцягвала са склепа на паясах. Здольнасць шляхты да ўжывання

піва мяжуе з фантазіямі Франсуа Рабле: як сцвярджаў сучаснік, вядомы гісторык Е. Кітовіч, у XVIII ст. чатыры добрыя пітакі маглі за вечар выпіць ёмістасць, якая ў пераліку ў сучасныя меры складае 188,5 літра.

Увогуле, нягледзячы на новыя павевы — больш вытанчаныя стравы, дробныя порцыі, шляхта засталася вернай каларыйнай, бялковай, мясной ежы — знакамітым ліцвінскім паўгускам, цяляціне, птушкам.

Шляхецкае застолле сышло, як і шляхецкая культура Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага. Але для нас яно мае каштоўнасць як семантычная мадэль, дзе прынятце ежы разглядаецца як рытуал, нагода яшчэ раз прадэклараваць такія істотныя прынцыпы, як узаемнае шанаванне гаспадара і гасцей, павага і гонар асобы, а таксама асаблівы дух братэрскасці, шчырасці, гасціннасці.

## 3.2. Ежа сялян

### *3.2.1. Сельскагаспадарчая тэхніка*

Зыходзячы з таго, што сялянская ежа была прадуктам саматужнай сялянскай працы, разгляд гэтага раздзела мы пачнем з традыцыйнай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Вялікае месца ў жыцці вяскоўца займала тое, што звязана з яго асноўным працоўным заняткам — земляробствам. Гэта тычыцца як каляндарнай абраднасці, прыкмет, забабонаў, магіі, так і, зразумела, непасрэдна сельскагаспадарчай вытворчасці, яе тэхналогіі. Земляробчы сезон працягваўся ў Беларусі прыблізна з сярэдзіны красавіка па сярэдзіну кастрычніка і ахопліваў крыху больш за палову каляндарнага года; прычым гэта быў перыяд менавіта актыўнай працы.

Для вясковай культуры з яе ўстаноўкай на кансерватызм характэрны ўхіл у традыцыйнасць, замкнёную нерухомасць асноўных тэхналагічных прынцыпаў і прыёмаў. Асноўны дынамічны імпульс у гэту сферу прыходзіў звычайна звонку і быў звязаны з прамысловым удасканаленнем метадаў і прылад працы. Такі ўплыў на беларускую сельскую гаспадарку актыўна пачаў назірацца з другой паловы XIX ст., дзелячы такім чынам традыцыйную сельскагаспадарчую тэхніку беларусаў апошніх стагоддзяў на два этапы: позняга феадалізму і ранняга капіталізму.

Сельская гаспадарка побач з жывёлагадоўляй — асноўныя заняткі насельніцтва Беларусі з бронзавага веку. Глебы Беларусі не адрозніваюцца ў цэлым высокай урадлівасцю, наяўнасцю ворыўных зямель увогуле — яны патрабуюць сістэматычнага клопату, угнаенняў. Побач з урадлівымі глебамі Цэнтральнай Беларусі, Палесся існуюць неспрыяльныя для добрых ураджаяў глебы поўначы. Таму сярэднія ўраджаі абмяжоўваліся «сам-тры», хаця на Гародзеншчыне ў пачатку XIX ст. збіралі «сам-чатыры», «сам-пяць». Гэтая прыродная акалічнасць наклала істотны адбітак на менталітэт селяніна, паўплываўшы на такія

яго якасці, як прымат працы ў дасягненні дабрабыту, працавітасць, здольнасць да сістэматычнай працы. Разам з тым адносна вялікія намаганні, час, якія ён вымушаны быў прыкладаць для здабывання сродкаў для жыцця, адбіліся на пераважна працоўнай скіраванасці яго побыту, параўнальна нізкім узроўні матэрыяльнага дабрабыту.

Традыцыйна ў Беларусі вырошчвалі і спажывалі ў ежу жыта, пшаніцу, авёс, ячмень, грэчку (з'явілася дастаткова позна), проса, чачавіцу, каноплі. На агародах садзілі рэпу, буракі, моркву, капусту, цыбулю, часнок, а таксама — яблыкі, грушы, слівы, вішні, ягады — парэчку, агрэст і інш. З канца XVIII ст. пачала шырока распаўсюджвацца бульба, якая з другой паловы XIX ст. заняла істотнае месца ў рацыёне сялян, фактычна замяняючы хлеб. Сярод тэхнічных культур істотнае месца займалі лён, каноплі. Здаўна на нашых землях склаліся некалькі сістэм земляробства, сярод якіх найбольш старажытнай з'яўлялася падсечная (лядная), якая дажыла да XIX ст. У XVII—XVIII стст. выкарыстоўвалася трохполле, а таксама двухполле. Існаваў і старажытны пералог, калі частка зямлі не апрацоўвалася, пакуль не адновіць свае кандыцыі. Істотную ролю ў распаўсюджванні трохполля і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ўвогуле адыграла валочная рэформа 1557 г.

Сельскагаспадарчыя прылады беларусаў вылучаліся функцыянальным і відавым кансерватызмам. Галоўная прылада земляробства — саха, якая, за выключэннем жалезных сашнікоў, была хатняй вырабкі. Старажытная саха складалася са зробленага з выкапанага з каранём ствала дрэва — рагача, а таксама рабочай часткі — рассохі, плахі. Рассоха прымацоўвалася да рагача пад вуглом, яна мела падвоены канец, на які надзяваліся жалезныя сашнікі (нарогі). Да двух канцоў рассохі прымацоўваліся нерухомыя паліцы — дошкі розных памераў, якія рэгулявалі пераварот ворыўнага пласта. Такая саха была прыстасаваная для двух валоў і атрымала назву літоўскай, палескай ці падляшскай. Саха такога тыпу была распаўсюджана акрамя Беларусі на суседніх польскіх, украінскіх, літоўскіх землях. На паўночных землях Беларусі пазней атрымалі распаўсюджванне сохі з конскай цягай — віцебскага тыпу з перакладной (рухомай) паліцай для аднаконнай цягі, а таксама іншыя мадыфікацыі. Для апрацоўкі дзярніны, лугу выкарыстоўваўся разак — прылада з вострым наканечнікам ці даўгім нажом на канцы. Для акучвання бульбы выкарыстоўвалі сошку — невялікую саху з адным лемяшом. Пасля апрацоўкі зямлі сахой яе рыхленне ажыццяўлялася бараной. Найбольш старажытныя віды бараны — зробленая з верхавіны елкі сукаватка, а таксама смык, зроблены са звязаных яловых плашак. Досыць пашыранай была плеценая барана, зробленая на дугападобнай аснове. Акрамя цяглавых прылад прымяняліся ручныя прылады апрацоўкі глебы, сярод якіх распаўсюджанымі былі матыкі (цяпкі, сапкі), найбольш старажытныя з якіх рабіліся цалкам з дрэва, таксама драўляныя ў старажытнасці лапаты (рыдлёўкі), крукі і вілы для гною. Да глыбокай стара-

жытнасці належыць і капыл, які складаўся з драўлянага трымальніка і вялікага ляза. Збожжа ўбіралі сярпамі, грачыху, авёс, гарох маглі касіць косамі, імі касілі і траву. Найбольш старажытныя косы былі без ручкі, з кароткім кассём. Зжатае збожжа звязвалі ў снапы, якія састаўлялі ў бабкі. Снапы сушылі ці на азяродах (Віцебшчына, Міншчына) — драўляных слупах з перакладзінамі, ці ў асецях (ёўнях) — сушылках на гумнах. Снапы звазіліся ў гумно — вялікае памяшканне з токам, дзе збожжа малацілі цапамі, пранікамі, веялі лапаткамі-веялкамі ці сітам. Пры працы са снапамі, саломай выкарыстоўвалі драўляныя граблі, вілы. Потым зерне складалі ў клеці, спецыяльныя ямы, дзе яно чакала перапрацоўкі на муку і крупы. Гэта рабілася на ветраных і вадзяных млынах, але часта вяскоўцы таўклі для атрымання круп зерне ў драўляных ручных (ці зрэдку нажных) ступах таўкачамі. Муку малолі на хатніх жорнах, камяні якіх абапіраліся на чатырохвугольную аснову.

Вялікае месца ў гаспадарчай дзейнасці беларусаў займала жывёлагадоўля. Кожная гаспадарка трымала працоўную і крупную рагатую жывёлу — валоў, коней, кароў, цялят, прычым сярод цяглавай жывёлы на паўднёвым захадзе ў XVII—XVIII стст. пераважалі валы, на іншых землях — коні. Крупнай рагатай жывёлы мелася ў сярэднім 3—4 галавы на гаспадарку. Акрамя гэтага, абавязкова трымалі авец, свіней, радзей — коз, хатнюю птушку — гусей, кур, качак.

У раёнах, дзе былі водныя артэрыі, сяляне займаліся рыбалоўствам. Сярод прылад для лоўлі рыбы традыцыйнымі з'яўляліся аднасценныя ці трохсценныя сеткі, невад вялікі і малы, брэдзень — невад для лоўлі рыбы ўброд, крыгі. Як можна меркаваць, былі шырока распаўсюджаны стаўныя лавушкі: поплаў, буч, кацец, нерат, венцер, каробка, скрыпка, ват, а таксама лавушкі рухомыя: таптуха, кломля, хапун, волак, брадан, настаўка. Выкарыстоўваліся вуды, перамёт, старажня. Працягвала выкарыстоўвацца астрога (восці).

Яшчэ адным промыслам было бортніцтва ў сваім старажытным выглядзе — як развядзенне, утрыманне пчол у борцях — выдзеўбаных у дрэвах дуплах. Далейшае развіццё бортніцтва — яго калодачная форма, калі вулей рабіўся ў калодзе, якая ставілася ці клалася. Мелі месца таксама саламяныя вуллі.

### *3.2.2. Ежа сялян*

Сялянская ежа дадзенага перыяду ў пэўнай ступені адрозніваецца ад традыцыйнай беларускай кухні, як мы яе ведаем па матэрыялах канца XIX — пачатку XX ст. Галоўным чынам гэта звязана з адсутнасцю ў рацыёне бульбы, якая шырока распаўсюдзілася сярод беларускага сялянства з другой паловы XIX ст. Як ужо адзначалася, бульба досыць складана ўваходзіла ў рацыён беларускага этнасу: сяляне яе прынялі не адразу, а шляхта не спажывала ўвогуле да канца XIX ст. Сярод звыклых

для пазнейшага часу культур можна адзначыць адсутнасць у сялянскім ужытку таксама грэчкі і памідораў, якія распаўсюдзіліся пазней.

Характар сялянскай ежы залежаў ад пары года і, адпаведна, наяўнасці прадуктаў, быў сезонны, а таксама рэгламентаваўся пастамі, якія вызначалі посныя і скаромныя перыяды. Найбольш каларыйна вясковец харчаваўся ўвосень і часткова зімой — калі прадуктаў пасля збору ўраджаю было шмат; найбольш цяжкім перыядам была вясна. Акрамя гэтага, трэба было абмяжоўваць сябе ў ежы па двух асноўных пастах — вялікім перадпасхальным і піліпаўскім. Акрамя гэтага, ежа была будзённая і святочная.

Шматлікія дакументальныя даныя сведчаць аб прадуктах, якія спажывалі сяляне. Гэта перш-наперш зерневыя культуры, якія складалі аснову сялянскай ежы. Сярод іх перавага аддавалася жыту, меней спажывалі пшаніцы, аўса, ячменю. Шырока былі прадстаўлены таксама агародніна: капуста, гарох, боб, морква, буракі, агуркі, рэдзька, часнок, цыбуля, хрэн, пятрушка, мак, пастарнак. У садах раслі яблыкі, грушы, вішні, слівы, рабіна, шыпшына, парэчкі, агрэст, чарэшня. Досыць рэдка прыгадваюцца гарбузы і дыні. Раслінны рацыён дапаўняўсяляснымі прадуктамі — ягадамі, арэхамі, грыбамі.

Мяса ўжывалі параўнальна мала, у асноўным па святах. Галоўным мясам была свініна, спажывалі таксама бараніну, з хатніх птушак елі гусей, радзей качак, шырока разводзілі курэй. Мясныя стравы дапаўняліся прадуктамі палявання, а таксама рыбай, разнастайныя віды якой былі ў шырокім ужытку (у тых, хто жыў каля вадаёмаў): гэта ёрш, карась, лешч, акунь, лінь, галец, сом, шчупак і інш. Мясная ежа дапаўнялася пераважна курынымі яйкамі.

Шырока ўжываліся малако (яго пілі пераважна кіслым) і прадукты з яго — масла, тварог, сыр. Мёд замяняў цукар. Соль была пакупная.

Як адзначаў вядомы гісторык Д. Л. Пахілевіч, селянін у XVI—XVIII стст. спажываў 1,1 кг зернебабовых у дзень (каля 400 кг зерня ў год), на сям'ю ў дзесяць чалавек патрабавалася 3410 кг жыта, пшаніцы, ячменю, аўса, гароху. Мяса дарослы чалавек спажываў 12 кг у год, а сям'я ўжывала ў год 102 кг, 186 кг рыбы, 8 кг сала, 63 кг свежых грыбоў, 1551 кг агародніны, 310 кг ягад, садавіны, 1200 кг малака, 12 кг сыру, 100 яек. Як бачым, стол пераважна вугляводны, у адрозненне ад шляхецкага, дзе пераважалі бялкі.

Першае месца на стале займаў хлеб — чорны, выраблены з жытняй мукі, радзей з аўса, ячменю, якія звычайна ішлі на дабаўкі. Старадаўні спосаб выпечкі хлеба з пшанічнай мукі — у лістах капусты ці хрэну. Са старажытнасці вядомыя святочныя віды хлеба — пшанічныя пірог і каравай. Здаўна з прэснага цеста пяклі пернікі, пячэнне, абаранкі, хрусты. З квашанага і прэснага цеста традыцыйна пяклі бліны. З дабаўкай у муку яек рабілі клёцкі. Даўняй стравай была і зацірка. Паўсядзённай стравай быў кулеш з гарохавай мукі. З аўсянай мукі рабілі кісель, з жытняй — саладуху. Па даных мяжы XVIII і XIX ст. у галодныя часы — вясной ці

ў голад — у хлеб дамешвалі шчаўе, тоўчаную сярэдзіну дрэва, травы, карэнні, мякіну.

З аўсяных, ячных і жытніх круп рабілі кашы.

Масла рабілася з ільнянога і канаплянага семені, вяршковае елі па святах.

Гародніну спажывалі пераважна свежай, а таксама апрацоўвалі ўпрок. Капусту квасілі, як і буракі, агуркі салілі ў бочках з кропам, вішнёвымі і дубовымі лістамі.

Сярод супоў старажытнымі з'яўляліся капуста, боршч з буракоў, таксама са шчаўем — халаднік.

Мяса адносна сістэматычна ўжывалася ў вараным выглядзе ў супе. Таксама параўнальна рэгулярна ўжывалі сала. Мяса смажылі, тушылі, рабілі вяндліну, каўбасы. У ежу ўжываліся вантробы — кішкі, пячонка, лёгкія, почкі. Да старажытных прысмакаў належаць і студзень, сальцісон. Гэта можна сказаць і пра верашчаку (мачанку) з мясных страў, мукі, цыбулі, спецый. Рабілася і страва, што вядомая з прац даследчыкаў як літоўская сялянка — з яек, смятаны і маку.

З ягад, фруктаў, бярозавага соку рабілі квас, узвар, з мёду — жаўтаваты ліпец і чырвонага адцення малінец.

З ежай быў звязаны і пэўны хатні посуд, перш-наперш з дрэва. Гэта дзяжа для заквашвання цеста для хлеба, а таксама для захавання агародніны, вады. Ночвы, якія выкарыстоўвалі як вялікія талеркі, кубел, дзе побач з рэчамі захоўвалі зерне. Таксама прыгадваюцца міскі, лыжкі, налівачы, сіта, рэшата, кошыкі, карабы і інш. Гліняны посуд прадстаўлены кухонным і сталовым — перш-наперш гэта гаршкі — ад 0,2 до 9 л аб'ёму. Кухонны посуд прадстаўлены таксама макотрамі (начынне цыліндрычнай формы вялікага дыяметра), патэльнямі (начынне на трох ножках з ручкай), латкамі (начынне канічнай формы), міскамі-друшлякамі, збанамі. Сталовы посуд — міскі, у меншай ступені — талеркі, конаўкі, кубачкі.

## 3.3. Ежа гараджан

Аб гэтай сферы матэрыяльнай культуры сведкаў захавалася няшмат. Вядомы цэхі беларускіх гарадоў, звязаныя з вытворчасцю ежы. Так, у Магілёве ў другой палове XVI ст. існавалі цэхі калачнікаў, хлебапёкаў, крупадзёраў, пірожнікаў, маслабойшчыкаў, мяснікоў, піва募раў, медавараў, прычым іх дзейнасць цалкам была звязаная з рынкам — яны працавалі не на заказ. У канцы XVI — пачатку XVII ст. з'явіліся цэхі саладоўнікаў, рыбакоў. На рынку горада былі вялікія гандлёвыя рады: мясны, рыбны, пякарскі, саляны. З акругі ў горад везлі мёд, таплёнае сала, пшано, хмель, рыбу, садавіну і агародніну — капусту, агуркі, буракі, цыбулю, моркву, рэдзьку, рэпу, салату, часнок, гарох, яблыкі, грушы, слівы, вішні, парэчкі, агрэст, а таксама мяса, жыта, пшаніцу. На рынках беларускіх

гарадоў у пачатку XVII ст. прадаваліся і замежныя, вытанчаныя прадукты: аніс, шафран, імбір, міндаль, гваздзіка, перац, разынкі, лаўровы ліст, фігі, тмін і інш. Як і ў асноўнай колькасці жыхароў Старажытнай Беларусі, галоўнай ежай мяшчан былі вырабы з зерня — у першую чаргу хлеб. Яго ў гарадах выраблялі ў большасці з пшаніцы ў якасці белага хлеба, пірагоў, сітніц, калачоў, абаранкаў. Рабілі таксама аладкі, бліны з грэчкі. З мяса шырока ўжываліся бараніна, гусяціна, курацiна, у рацыёне было таксама шмат рыбы, у тым ліку самы, асятрына.Як можна меркаваць, у гарадах шырока ўжываліся напоі, асабліва піва, якое часта сустракаецца ў якасці платы за працу ў актах гарадскіх магістратаў. У гарадах меліся таксама спецыяльныя памяшканні для захавання вялікай колькасці гарэлкі. Акрамя гэтага выраблялiся напоі на мёдзе, квас. Іх вытворчасцю займаліся ў гарадах браварнікі, вінакуры, піўвары, квaснікі, медавары. Ужывалі таксама французскія і венгерскія віны.

У XVII—XVIII стст. у беларускіх гарадах існаваў разнастайны набор начыння, звязанага з ежай. Гэта разнастайныя кухонныя збаны, часта досыць вытанчанай, конусападобнай формы, добра вырабленыя, часта паліваныя ці дымленыя. Таксама конусападобныя накрыўкі, цыліндрычныя макотры, латкі (нешта сярэдняе паміж гаршком і міскай), патэльні, рынкі, міскі. Для ежы выкарыстоўваліся талеркі, міскі, шматфункцыянальныя збаны. З XVI ст. у быт увайшоў шкляны посуд — чаркі, стопкі, куфлі, кілішкі, шкляніцы; бутлі, бутэлькі, кварты, штофы. Да гэтага часу належаць і рукамыі. У гарадах за сталамі выкарыстоўваліся, акрамя традыцыйных нажоў і лыжак, таксама і відэльцы.

# СЯМЕЙНЫ І ГРАМАДСКІ БЫТ

## 4. СЯМ'Я І СЯМЕЙНЫ БЫТ

### 4.1. Шляхецкая сям'я

Шляхецкая сям'я, культура шляхецкіх сямейных зносін была часткай светапоглянай, матэрыяльнай і духоўнай сістэмы жыццядзейнасці тагачаснага дваранства. Уступленне ў шлюб і нараджэнне нашчадкаў было неад'емнай часткай шляхецкага стылю жыцця. Наяўнасць радавітай жонкі, нашчадкаў, пажадана мужчынскага полу, утульнай, добра ўладкаванай радавой сядзібы былі грунтоўнымі кампанентамі шляхецкага быту. Разам з тым шляхецкая сям'я, у адрозненне ад сялянскай ці, часткова, гарадской, была больш складаным і сэнсава насычаным інстытутам — яе функцыі не зводзіліся да простага працягу роду і атрымання жыццёвай падтрымкі праз дзяцей. Як і ўся шляхецкая культура, шлюб меў прэзентацыйны характар, быў сродкам усталявання прэстыжных радавых сувязей, кар'еры, набыцця добрага маёмаснага становішча. Шляхціц быў самадастатковай асобай у прававых, эканамічных адносінах і не адчуваў патрэбы ў падтрымцы з боку нашчадкаў. Хутчэй, наадварот, з другой паловы XVIII ст., калі істотна ўзмацнілася цяга моладзі да раскошы, бацькі зрабіліся неабходнымі ў гэтым сэнсе дзецям. І яшчэ адна акалічнасць — шляхціц быў асобай публічнай, кожны са шляхціцаў актыўна і сістэматычна прымаў удзел у выбарчай, судовай дзейнасці, яго каштоўнасць як асобы, поспех жыцця быў у значнай ступені звязаны з палітычнай кар'ерай, вагой у вачах грамадскасці. Адсюль вынікае пэўная другаснасць сямейнага жыцця як крыніцы задавальнення жыццёвых амбіцый. Разам з тым паважныя, рыцарскія адносіны шляхціца да жанчыны, культ сямейнага абавязку не давалі шляхціцу цалкам сысці ў грамадскую дзейнасць.

#### *4.1.1. Выхаванне дзяцей*

Асновы шляхецкага менталітэту закладваліся ў выхаванні, якое па формах і змесце было, у дачыненні да мужчын, на той час найбольш аптымальным у краі. Адна з галоўных мэт выхавання старабеларускага (ліцвінскага) шляхціца — усталяванне ў яго спецыфічнага менталітэту, звязанага з паняццямі шляхецкага гонару, вольнасці, самаахвярнасці, а таксама характэрнага комплексу паводзін, уменняў, навыкаў, сярод якіх значнае месца належала звязаным з фізічнай, ваеннай падрыхтоўкай. Гэта вынікае са своеасаблівай, дамінуючай ролі гэтага саслоўя ў палітычным, эканамічным, грамадскім, культурным жыцці Рэчы Паспалітай, што вымушала шляхціца спалучаць такія маральныя, духоўныя якасці, як смеласць, патрыятызм, мужнасць, з валоданнем шырокім

спектрам ведаў, навыкаў. Канцэптуальна ідэя своеасаблівага шляхецкага выхаваўчага кодэксу вынікала з сарматызму, які акцэнтаваў мужнасць, стрыманасць, самастойнасць, сумленнасць, смеласць, патрыятызм. Адсюль строгія, нават крыху стрыманыя ўзаемаадносіны паміж бацькам і дзіцем, якія грунтаваліся на ўзаемнай павазе, аднак былі пазбаўленыя з боку бацькі паслабленняў і залішняй сентыментальнасці. Сям'я шляхціца грунтавалася на патрыярхальных асновах — яе галавой быў бацька, — і адпаведна ён рыхтаваў сына да такой жа самай адказнай ролі.

Складанне духоўнага аблічча шляхціца пачыналася з ранняга дзяцінства, якое праходзіла ў атмасферы культу роду, сярод сармацкіх партрэтаў продкаў, папулярных тады радаводаў, паданняў пра славутую даўніну істотна міфалагізаваных першапродкаў. Нараджэнне само па сабе з'яўлялася значным, абгрунтаваным культурнай традыцыяй актам — яшчэ адным звяном у дыяхронным ланцугу славутых людзей і падзей. Разам з тым шмат дзяцей мець было непажаданым — гэта пагражала барацьбой за спадчыну, падзелам маёнтка. Бяздзетнасць лічылася адметнасцю — аб ёй звычайна паведамлялася ў мемуарах. Разам з тым досыць часта жыццё нават знакамітых князёўнаў ператваралася ў бесперапынны ланцуг цяжарнасці і родаў, што літаральна высмоктвалі арганізм жанчыны. Адсутнасць добрай медыцыны прыводзіла да шматлікіх летальных зыходаў немаўлят. Тут дастаткова нагадаць дванаццаць памёрлых дзяцей Ганны Катажыны Радзівіл, саркафагі якіх знаходзяцца ў радавым скляпенні ў Нясвіжы. Вялікую ролю ў кар'ерных, маёмасных пытаннях, перапыненні спрэчак і ўмацаванні хаўрусаў меў выбар хросных бацькоў — асаблівым гонарам лічылася мець за іх караля ці каралеву. Ранні перыяд жыцця немаўляткі суправаджалі характэрныя дзеянні, што мелі утылітарна-фізіялагічны падмурак. У гэты час у наглядзе за дзіцем істотная роля належала «мамкам», якія адказвалі не толькі за кармленне немаўляткі, але і за яго выхаванне. Адразу пасля нараджэння дзіця апускалі ў цёплую ваду з рознымі зёлкамі.. Такія абмыванні рабілі некалькі дзён, павялічваючы колькасць штодзённых «працэдур»; і толькі пасля гэтага дзіця аддавалі маці або жанчыне, што даглядала яго. Немаўляткам давалі ўнутр лекі — разам з густым сіропам — толькі ў выпадку хваробы. Скуру прысыпалі таўчоным алебастрам. Цікава, што ў склад першай штучнай ежы дзіцяці разам з цукрам, хлебам, маслам уваходзіла і піва. Немаўлят апраналі досыць цёпла: у крыніцах загартоўванне ў раннім узросце амаль не прыгадваецца. Для дзетак існавала спецыяльная мэбля — невялічкія ложкі на ножках з дугападобным завяршэннем — своеасаблівыя калыскі, ці ложкі на калёсіках, а таксама нерухомыя. Да XIX ст. захоўваўся звычай аддаваць дзетак «на дзядзькаванне» — у дом іншага чалавека, што спрыяла выпрацоўцы самастойнасці, а калі чалавек быў не надта заможны — яшчэ і фізічнай вынослівасці, непатрабавальнасці. Разам з тым распаўсюджанае ў пазнейшай літаратуры мерка-

ванне аб тым, што на дзядзькаванне шляхецкіх дзяцей аддавалі ў сялянскія сем'і, у адносінах да выхадцаў з сярэднезаможных і багатых сем'яў не адпавядае рэчаіснасці — іх дзяцей аддавалі на ўтрыманне ў дамы ўпраўляючых, сваякоў. Істотныя змены адбываліся ў жыцці дзіцяці з 5—7 гадоў — яго пачыналі дома вучыць грамаце, асновам навучальных прадметаў, пачыналася мэтанакіраванае выхаванне. З 7 гадоў сынам пачынаў займацца бацька. Гэты ўзрост у гісторыі дзяцінства шматлікіх народаў лічыцца пераломным: узрастае ўзровень індывідуальнай адказнасці, пачынаецца працэс сацыялізацыі. Асобая ўвага надавалася выхаванню хлопчыка—яму прывіваліся пачаткі «рыцарскай» культуры. У XVIII ст. распаўсюдзіўся інстытут гувернёраў, «дырэктараў» — хатняе навучанне праводзілі нанятыя шкаляры, з канца стагоддзя — замежныя гувернёры.

"Загартоўвалася" псіхалогія хлопчыка і ў школах — спачатку парафіяльнай, потым іезуіцкай ці піярскай. У першай сярод сродкаў уздзеяння не апошнюю ролю адыгрывалі фізічныя пакаранні — вучняў білі рознымі скуранымі прыладамі, рэменем ад трох да пятнаццаці ўдараў адразу. У двух іншых тыпах школ перавага аддавалася сродкам маральнага ўздзеяння, прычым узровень адукацыі, як і ўзровень пакарання, быў роўным для ўсіх — дзяцей мяшчан, шляхты, магнатэрыі. Дзве любімыя гульні навучэнцаў — у мяч і спаборніцтвы «двое на двое» на кіях («пальцатах») садзейнічалі выпрацоўцы гнуткасці цела, спрыту.

Вялікая роля ў выхаванні шляхціца надавалася валоданню зброяй — у першую чаргу шабляй. Досыць рана хлопчыкі прывучаліся да стральбы — спачатку з лука. Яшчэ два віды актыўнай фізічнай дзейнасці, да якіх рана далучаліся хлопчыкі, — язда на кані і паляванне, на якое ішлі з бацькам. З пачатку XVIII ст. з ростам шляхецкай свавольнасці роля, статус, прыярытэт фізічных, вайсковых якасцей шляхціца пачалі рэзка ўздымацца, адсоўваючы якасці інтэлектуальныя.

Увогуле ў выхаванні шляхціца ўхіл рабіўся на строгасць, дысцыплінаванасць, псіхалагічную ўстойлівасць, фізічную вынослівасць. Выхаванне, як і тагачасная сям'я, было патрыярхальным: менавіта бацьку адводзілася галоўная роля ў выхаванні шляхецкага менталітэту. Так, шляхціц Ян Цадроўскі тую частку сваіх напісаных у XVII ст. мемуараў, у якіх ён спыняецца на сваіх заслугах у палітычным, грамадскім жыцці, адрасуе менавіта дзецям, каб яны ведалі, як служыў ён «ваяводству і любай айчыне». Спрыяў разумоваму развіццю шляхціцаў і звычай, згодна з якім юнакоў, якія толькі —толькі зрабіліся адносна дарослымі (звычайна ў 16 гадоў), накіроўвалі ў краіны Еўропы — павучыцца, пападарожнічаць, паглядзець свет.

Хібы шляхецкага выхавання былі характэрныя для ўсёй тагачаснай сістэмы еўрапейскага выхавання: жорсткая сацыяльная прадвызначанасць і адсутнасць прызнання спецыфічнага дзіцячага свету, космасу —

дзіця разглядалася як непаўнавартасны дарослы. Разам з тым шляхецкія выхаваўчыя традыцыі даюць цікавы і плённы прыклад спалучэння добрых фізічных кандыцый са шляхетнай вытанчанасцю, рыцарскай этыкай і культурнай эрудыцыяй.

### *4.1.2. Шлюб*

Гэтыя якасці маглі спатрэбіцца пры наступным этапе жыцця — стварэнні сям'і. У тыя часы гэта было звязана са спецыфічным гадавым рэестрам, што дыктаваў, у якім узросце на што мае права шляхціц, і, адпаведна, вызначаў срок яго магчымасцей уступлення ў шлюб. Тое, што мы зараз называем здольнасцю да самастойных учынкаў, надыходзіла, як лічылі, для хлопца ў 18 гадоў (ён мог кіраваць, за выключэннем фінансавых аперацый з нерухомасцю, маёмасцю, і галасаваць на сейміках). Канчаткова і цалкам шляхціц рабіўся паўнацэнным уласнікам, суб'ектам права (мог быць абраным паслом ад сейміка) у 24 гады, што і вызначала гэты тэрмін як найбольш аптымальны, па сутнасці абавязковы для шлюбу, для дзяўчыны гэты ўзрост складаў 16 гадоў, хаця праз каралеўскі дазвол гэты ўзрост можна было знізіць, — калі трэба, маладосць не была перашкодай, — так, Людвіка Караліна Радзівіл пайшла ў шлюб з Людвікам Гагенцолернам, не дасягнуўшы гэтага ўзросту. Згода на шлюб залежала ад бацькоў ( для дзяўчыны згода бацькі была абавязковай) і апекуноў (калі апякун доўга не даваў згоды на шлюб дарослай дзяўчыны, дык справа вырашалася з удзелам яе сваякоў), і яе маглі дамагацца за шмат гадоў да дасягнення дзяўчынай паўналецця. Да Гарадзельскага прывілея 1413 г. ліцвінская шляхта магла выдаваць дачок у шлюб толькі з дазволу Вялікага князя. Меліся строгія абмежаванні шлюбаў паміж сваякамі: несапраўдным лічыўся шлюб паміж сваякамі ў 4-ым пакаленні, а за шлюб у 3-ім пакаленні, як і за двяжэнства, прысудам была смерць. Для ўдавы была абавязковай шасцімесячная жалоба. Мелі месца абручэнні (заручыны), фактычна шлюбныя пагадненні. Чым больш сталы быў узрост маладога ці маладой, тым больш самастойнасці праяўлялі яны ў шлюбным выбары. Хаця воля бацькоў адыгрывала вялікую ролю, нават калі справа тычылася юнакоў: так, імя сваёй будучай жонкі князь Караль Станіслаў Радзівіл першы раз пачуў у касцёле ад сваёй маці, пасля чаго адразу і адбылося вянчанне. Увогуле, з часоў Асветніцтва ўзрос прыярытэт культурна-адукацыйных фактараў у аксіялагічным рэйтынгу асобы, можна сказаць, што з гэтага перыяду быт шляхціца зрабіўся культурна заангажыраваным у шматлікіх сферах—ад распрацаванага этыкету—да падбору кніг уласнай бібліятэкі. Акрамя дамінуючага меркантыльнага аспекту, ад прэтэндэнта на руку патрабаваліся і культурніцкія захады: у адукаваным шляхецкім асяроддзі ў XVIII ст. у гонар абранніц складаліся вершы, галоўным аргументам магло быць валоданне музычнымі інстру-

ментамі — так, Міхаіл Казімір Агінскі заваяваў сэрца сваёй каханай і будучай жонкі тым, што лепш за суперніка граў на музычных інструментах.

Як і любы іншы час, шляхецкая эпоха багата насычаная па-сапраўднаму трагедыйнымі гісторыямі кахання, дзе па-антычнаму перамешаныя моцныя пачуцці, інцэст, рок і дзе закаханыя ідуць насуперак прынятым нормам. Адна з такіх была шырока вядомая ў XVII ст.— гэта ўзаемнае, як можна меркаваць, каханне дачкі славутага Януша Радзівіла — Ганны Марыі і яе апекуна, стрыечнага брата бацькі, Багуслава Радзівіла. Сама думка аб гэтай сувязі, не кажучы ўжо аб шлюбе, была грахоўнай і звязвалася з кровазмяшэннем, што ў той час лічылася страшэнным грахом. Тым не менш, іх пачуцці не былі таямніцай. Як гэта не дзіўна, але пратэстант Багуслаў дабіўся ў Рыме дазволу на шлюб, праз пэўны час нарадзілася дачка, але лёс не спрыяў закаханым: праз месяц пасля цяжкіх родаў Ганна Марыя памерла. Мелі месца і дашлюбныя сувязі, якія мелі адпаведныя вынікі. Так, Катажына — дачка славутага князя Якуба Сабескага, закахалася ў князя са знатнага роду Вішнявецкіх — Дзмітрыя, прычым ёй не было шаснаццаці, а яму — семнаццаць. Як часта адбываецца ў падобных выпадках, вынік іх сувязі не заставіў сябе чакаць. Як шляхетны пан, Дзмітрый папрасіў рукі Катажыны, аднак яму адмовілі. Дзіця, якое нарадзілася, забралі ад маці, а Катажыну, якой споўнілася 16 гадоў, у 1650 г. аддалі за князя Заслаўскага-Астрожскага.

Шляхецкае вяселле вылучалася сваім багаццем, працягласцю (не менш за тыдзень), насычанасцю еўрапейскімі, хрысціянскімі, а таксама мясцовымі шляхецкімі рытуаламі: крыкамі «Віват!», уздыманнем на палатне пярсцёнкаў. Вяселле заможнай шляхты ўключала багаты вясельны картэж, прыёмы з абавязковай з XVIII ст. музыкай і танцамі, тэатральныя прадстаўленні, стрэлы з гармат, феерверкі. Асаблівай пашанай карысталася звычайна багата аздобленая «шлюбная карона», якую жаніх дарыў нявесце і якая захоўвалася працяглы час. Прыблізна да XVIII ст. у галаўны ўбор нявесты ўваходзіў, як і ў вясковай традыцыі, вянок. Рытуал застолля быў распрацаваны і грунтаваўся на ідучых у пэўнай паслядоўнасці прамовах-здравіцах. Зборнік вясельных прамоў XVII ст. дае ўяўленне аб парадку рытуалу. Сярод іх — «Прашэнне аб благаславенні шлюбу», «Прашэнне аб пані», «Віншуем ганароўцаў», «Добры вечар, госці», «Дзякуем за панну», «Добры вечар, госці з падарункамі», «Благаславенства да дому», «Даюцца дары салодкія», «Аддаюцца падарункі».

### *4.1.3. Сямейныя адносіны*

Шляхецкія сямейныя адносіны, як і культура наогул, насілі знакава-прэстыжны характар. У значнай ступені гэта грунтавалася на падтрыманні «маястрату»— саслоўнага становішча шляхецкага роду, што праяўлялася і ў сферы сямейных адносін. Адсюль — супрацьлеглыя працэсы ў шляхецкай свядомасці: з аднаго боку — ганарлівасць

шляхецкім радаводам, а з другога — схільнасць з другой паловы XVIII ст. да меркантыльных шлюбаў з заможнымі купцамі, вяскоўцамі. Усе пералічаныя вышэй акалічнасці рабілі сям'ю і сямейныя адносіны шляхціца досыць складаным культурным феноменам.

Сямейная культура шляхты можа тлумачыцца зыходзячы з рыцарскага характару шляхецкай культуры ўвогуле, рыцарскай маралі, а таксама ідэалогіі сарматызму. Шляхціц, як рыцар, а таксама нашчадак ваяўнічых сарматаў, арыентаваўся на выразны ўзор дабрадзейнага ў адносінах да жанчын, а таксама ўсіх слабых і пакрыўджаных. Служэнне жанчыне, паважлівае стаўленне да яе нават з элементамі абогатварэння складае выразную адметнасць рыцарскага светапогляду. Разам з тым рыцарская культура не належала да шэрага «сямейных», фармальна яна не адмаўляла сямейную вернасць, але на самай справе яе героямі досыць часта былі людзі, якія не звярталі ўвагі на шлюбныя абавязкі — як свае, так і сваіх партнёраў. Культавы герой еўрапейскага рыцарства — Трыстан не вызначаўся пачцівым стаўленнем да сямейнага права свайго дзядзькі Марка, а матыў адзюльтэру быў адным з асноўных у распавяданнях аб рыцарах Круглага стала. Рыцарскі прыярытэт адносін да жанчыны — ці платанічнае абогатварэнне (яго крызіс вызначыў Дон Кіхот), ці рамантычна-авантурная стыхія. Нездарма культавая любоўная пара XVI ст. Барбара Радзівіл і Жыгмунд III Аўгуст не адрознівалася пачуццёвай стрыманасцю ў сваіх паводзінах да ўзаемнай сустрэчы. Гэтая дваістасць была характэрная і для мужчыны-шляхціца, які быў асобай пераважна публічнай, перш-наперш у ваенным, палітычным сэнсе. Сям'я і жонка (у першую чаргу яе радавітасць, маёмаснае становішча) выступалі хутчэй як сродак грамадскай знакавасці шляхціца. Тым больш што ў шлюбы ўступалі ў дастаткова маладым узросце, а высокі ўзровень смяротнасці як сістэматычна ваяваўшых мужчын, так і слаба абароненых медыцынай жанчын рабілі неаднаразовыя шлюбы звычайнай справай. Таксама значную ролю ў шлюбе адыгрываў матэрыяльны, прэстыжна-радавы фактар, досыць часта муж быў старэйшы за жонку, што, па логіцы, мала спрыяла ўсталяванню глыбокіх пачуццёвых адносін паміж супругамі. Таксама можна адзначыць, што ў тагачаснай літаратуры амаль не прадстаўлены творы, якія б апалагізавалі сямейнае каханне. Гэты этас адпавядае рыцарскаму ідэалу кахання, дзе яго суправаджаюць і стымулююць тайныя сустрэчы, пераадоленне перашкод,— усё тое, што адсутнічае ў сямейным жыцці. Разам з тым старабеларуская (ліцвінская) шляхта выдатна засвоіла прынцып рыцарскага, пачцівага стаўлення да жанчыны, што ў сукупнасці з абароненымі артыкуламі Статута правамі (у тым ліку і маёмаснымі) і строгай сармацкай этыкай ставіла жанчыну-шляхцянку, хай сабе і фармальна, у паважанае, абароненае становішча. Гэтаму спрыялі, у тым ліку, і заканадаўчыя нормы. Напрыклад, асноўным пакараннем шляхты за «незаконнае сужыццё» часцей за ўсё было царкоўнае пакаянне, але ў выпадку неаднаразовых сямейных здрад, парушэння дадзенага слова вінаватаму мог выносіцца смяротны

смяротны прысуд. Дамастроеўскія прынцыпы сямейнага жыцця, рукапрыкладства не мелі на беларускіх землях шырокага распаўсюджання і былі хутчэй выключэннем.

Як сведчаць дакументы, у шляхецкіх сем'ях здараліся разводы, дазволы на якія даваліся свецкай уладай і царквой. Вядомыя выпадкі, калі шляхціц разводзіўся два ці тры разы; разводу маглі дамагчыся як мужы (падстава — адсутнасць дзяцей), так і жонкі (невыносныя ўмовы жыцця, грубыя адносіны, пры ўмове адсутнасці дзяцей). Для ўступлення ў новы шлюб было неабходна развесціся, у іншых выпадках падставай магла быць смерць мужа ці жонкі, знікненне аднаго з іх на доўгі час.

Пахаванне шляхціца з XVIII ст. усё больш набывала раскошны, тэатралізаваны характар. Чорныя драпіроўкі, адпаведная вопратка прысутных, алегарычныя кампазіцыі з сімваламі нябожчыка, а таксама смерці, асобныя тэатралізаваныя імпрэзы, жалобная музыка, спевы, званы, залпы гармат, вялікая жалобная працэсія — усё гэта рабіла на гледачоў надзвычайнае ўражанне. Паказальна, што іншым разам пахавальны звычай адлюстроўваў і адмоўнае стаўленне грамадскай думкі да нябожчыка — над тым, хто не спраўдзіў чаканняў, ламалі сімвалы яго ўлады, зброю. Характэрна, што агульнадзяржаўны пахавальны рытуал меў і рэгіянальныя адрозненні: так, у адрозненне ад палякаў, ліцвіны (старабеларуская шляхта) не вымалі падчас развітання з нябожчыкам шаблі з ножан.

З другой паловы XVIII ст. маральныя нормы істотна змяніліся: зрабіліся больш хісткімі, вольнымі, істотнае месца пачала набываць рэпрэзентацыя эратызму. Разам з тым сексуальная рэвалюцыя, якая прыйшла на беларускія землі з Еўропы на хвалі культур Асветніцтва і ракако, мела тут абмежаваныя вынікі, хаця і адбілася ў сваіх асноўных формах. З гэтага часу жанчына выйшла ў свет, пачала актыўна ўдзельнічаць у балях, прыёмах, рэдутах (нешта накшталт баляў па білетах). Змянілася вопратка жанчын, яна, згодна з арыстакратычнай модай таго часу, больш адкрывала цела, давала магчымасць бачыць бялізну, якой пачала надавацца асаблівая ўвага. Разам з тым сярод тутэйшых спакусніц, вядомых сваімі вольнымі паводзінамі, мы сустракаем у асноўным жанчын вольных прафесій — акцёрак, жанчын без пэўных заняткаў. Што да шляхціца, дык падчас ад'езду па справах ён мог правесці час у вясёлым жаночым акружэнні,— гэта не разглядалася як сур'ёзная сямейная здрада. Аднак публічна прэзентаваць грамадству сваю каханку, адкрыта з'яўляцца з ёй у сваім асяроддзі лічылася непрыстойным. Калі прыходзілася выбіраць паміж сямейным абавязкам, клопатам пра дзяцей і хай сабе і салодкім, але летуценным вольным жыццём, выбар рабіўся на карысць першага. Тым больш, гэта тычылася каханак, што паходзілі з простых колаў — пакаёвак і інш. Выпадкі адыходу ад гэтага прынцыпу, якія апісваюцца ў тагачасных мемуарах, тычацца рускіх дваран, што запоўнілі край пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Не атрымаў пашырэння на нашых землях і звычай трымання дваранамі своеасаблівых «прыгонных гарэмаў», куды ўваходзілі залежныя ад уладара

пераважна вясковыя дзяўчаты. Шляхецкае стаўленне да жанчыны, якое выключае прыніжэнне, моцны інстытут сваяцкасці, які мог, калі што, пастаяць за гонар шляхцянкі, стварылі на нашых землях дастаткова аптымальны баланс паміж разняволеннем жанчыны, яе самасцвярджэннем як асобы і трыманнем яе ў пэўных маральных рамках, якія, згодна з грамадскай мараллю, забяспечвалі ёй аўтарытэт і павагу пры ўмове адпаведнасці статусу добрай жонкі і маці.

Увогуле, шляхцянка пры жаданні і наяўнасці здольнасцей магла рэалізоўваць свае дзейныя памкненні, як дапамагаючы мужу ў яго справах, так і дзейнічаючы самастойна. Ганна Катажына Радзівіл праводзіла эканамічныя рэформы ў Нясвіжы, заснавала знакамітую шкляную мануфактуру ў Налібоках, вытворчасць габеленаў у Карэлічах, суконную фабрыку ў Слуцку і інш., Уршуля Радзівіл пісала і ставіла п'есы, Саламея Пільштынава падарожнічала і апісвала свае «авантуры» і г. д.

## 4.2. Сялянская сям'я

### *4.2.1. Структура сям'і*

У XVIII ст. пераважнай формай сямейнай арганізацыі беларускага сялянства была, па ўсёй відавочнасці, малая сям'я — г. зн. тая, аснову якой складала адна сямейная пара з дзецьмі ці без іх; разам маглі таксама жыць сваякі — адзін з бацькоў, нежанатыя браты, сёстры і г. д., але гэтых сямей было меней. У перыяд, які даследуецца, пераважнай формай сямейнай арганізацыі беларускага сялянства была, па ўсёй відавочнасці, малая сям'я. Па даных інвентароў другой паловы 60—90-х гг. XVIII ст. (выкарыстаны толькі дастаткова поўныя вопісы), якія адносяцца да розных абласцей беларускіх зямель, з 772 сем'яў 487 (63% ) былі малымі, а 285 (37%) — непадзеленымі. Прычым колькасная перавага малой сям'і праяўляецца на матэрыялах, якія паходзяць як з заходняй, цэнтральнай, так і ўсходняй Беларусі. Сярод малых сем'яў 64% (312) складалі нуклеарныя (сямейная пара з дзецьмі), 28% (138) — ускладненыя (муж з жонкай і дзецьмі або без іх, з якой жыве адзін з бацькоў, нежанатыя браты, сёстры, другія сваякі і г. д.), 8% (37) — няпоўныя (без пары). Сярод непадзеленых сем'яў 55% (157) былі бацькоўскія, 43% (123) — брацкія, 2% прыходзілася на іншыя формы. Наогул, сярод названых тыпаў сям'і значную большасць складалі нуклеарная — 40% усёй колькасці, за імі ішла бацькоўская — 20%, малая ўскладненая — 16,5% і брацкая — 16%.

У другой палове XVIII ст. дакладна выявіліся адрозненні ў маёмасным становішчы сялян як вынік узмацнення феадальнай эксплуатацыі. Аддзяліліся, з аднаго боку, багатыя, з другога — бедныя сялянскія гаспадаркі, кутнікі, бабылі, каморнікі, лезныя людзі і г. д., прычым самі землекарыстальнікі прымушаны былі класіфікаваць сялян па іх маёмасным становішчы на 3, а часам і 4 катэгорыі. Істотнае адрозненне ў матэрыяльным

становішчы сялянскіх гаспадарак абумовіла розны характар усёй жыццядзейнасці сем'яў, што спрыяла развіццю іх выразнай сацыякультурнай тыпізацыі.

Важным структурным паказчыкам сям'і з'яўляецца яе колькасны склад. Ён вызначаецца даследчыкамі па даных інвентароў другой паловы XVII—XVIII стст., зыходзячы з населенасці аднаго «дыма» (двара) у Вялікім княстве Літоўскім. Розныя даследчыкі вызначаюць гэтую лічбу па-рознаму — 4, 5, 6, 7 чалавек Дастаткова вялікі аб'ём матэрыялу ахоплены даследаваннямі П. Г. Казлоўскага (9697 дымоў — 65424 чал.), які лічыць, што ў мірны час колькасны склад насельніцтва дыма складаў 7 чалавек, а ў перыяд войнаў і спусташэнняў (60—70-я гады XVII і першая чвэрць XVIII ст. ) — 5. Разам з тым усе гэтыя падлікі маюць пэўнае адценне верагоднасці, бо ў інвентарах не заўсёды поўна ўказваецца колькасць жанчын і дзяцей, і таму сярэднюю лічбу трэба штучна карэкціраваць.

Трэба заўважыць, што колькасны склад жыхароў сялянскага двара розных маёнткаў і гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў быў дастаткова варыянтны. Напрыклад, у маёнтку Радзівілімонты (сучасны Клецкі раён), паводле інвентара 1786 года, са 187 дымоў больш за ўсё — 39 (20,9%) і 38 (20,3 %) налічвалі адпаведна 4 і 6 чалавек; у 34 дварах (18,2 % ) сем'і складаліся з 5 чалавек. У сярэднім на дым прыходзілася 5,8 душ. Згодна з інвентаром маёнтка Вялікія Дольцы Барысаўскага павета за 1805 г. (177 двароў), большасць сем'яў — 12,4% складалася з 5 чалавек; 10,7% — з 8; 10,2% — з 10; 9,6% — з 7 чалавек. Сярэдняя населенасць двара ў маёнтку складала 8,6 душ. Такім чынам, мы бачым, што колькасны склад сялянскіх двароў, узятых у дастаткова вузкім храналагічным зрэзе і якія належаць да маёнткаў розных рэгіёнаў беларускіх зямель, можа характарызавацца адноснай зменлівасцю як сярэднестатыстычных паказчыкаў, так і суадносін колькаснай перавагі пэўных тыпаў сялянскіх сем'яў.

Вельмі праблематычнае пытанне пра полаўзроставую структуру сялянскай сям'і ў XVII—XVIII стст. Яго даследаванне абцяжарваецца зноў жа непаўнатой асноўных крыніц — інвентароў. Разам з тым ёсць і асобныя дакладныя даныя. Так, у люстрацыі маёнтка Урэчча 1789 г. усё насельніцтва ўлічана па ўзросце і полу. З 1331 чалавека найвялікшы працэнт — 41 (546 душ) і 30 (399 душ) складалі людзі ва ўзросце адпаведна ад 1 да 16 год і ад 16 да 30; суадносіны колькасці мужчын (51% ) і жанчын (49% ) былі прыблізна роўнымі. Характэрна, што асобы мужчынскага полу часта колькасна пераважаюць у інвентарах: маёнтак Вялікія Дольцы — мужчын 52% (802 чалавекі), жанчын — 48 % (741 чал.), што можа тлумачыцца іх больш дакладным улікам.

Ёсць і іншыя даныя пра дэмаграфічную структуру сям'і, у прыватнасці, пра колькасць дзяцей. Згодна з інвентаром маёнтка Вядцы (Віцебшчына) 1790 г., 126 сямейных пар мелі 315 дзяцей, прычым часцей за ўсё ў мужа і жонкі было двое ці трое дзяцей (адпаведна па 24,6%), потым ідуць пары з адным дзіцём (18,2%), чатырма дзецьмі (13,3%); па 6 дзяцей мелі, паводле вопісу, толькі 4 пары (каля 4%). У 8,2% сем'яў дзяцей

не было. Сярэдняя колькасць дзяцей у сямейнай пары — 2,5. Улічваючы дастаткова высокі ўзровень дзіцячай смяротнасці ў тую эпоху, дадзеная лічба бачыцца цалкам рэальнай. Паказальны ўзрост бацькоў: 13,5% складаюць групу ад 15 да 20 год; 36,9% — ад 21 да 30; 31,5% — ад 31 да 40 год. Прычым жанчыны пераважаюць у першай (амаль удвая) і другой узроставых групах. Гэты факт тлумачыцца тым, што ў абсалютнай большасці выпадкаў (акрамя 5 на 126 пар) муж быў старэйшы за жонку, і гэтая розніца максімальна складала ў азначаным маёнтку 12—14 год. Што да мінімальнага ўзросту ўступіўшых у шлюб, то для жанчын ён раўняўся 15—16 гадам, для мужчын — 18—19. Дастаткова малады ўзрост тых, хто ўступіў у шлюб, быў, гледзячы па ўсім, тыповай з'явай у сялянскім асяроддзі XVII—XVIII стст.

Такім чынам, у дадзены перыд, як можна меркаваць па вышэй прадстаўленых матэрыялах, ішлі павольныя змены ў структуры сялянскай сям'і, самыя істотныя з якіх былі звязаны з развіццём малой сям'і, на што істотны ўплыў зрабілі наступствы правядзення валочнай рэформы і дэструкцыя эканамічнай ролі грамады. Перавага малой сям'і, а ў межах яе — нуклеарнай — сведчыць аб якасных зменах у сямейным жыцці, звязаных з рэаліямі новай гістарычнай эпохі. Колькасны склад тагачаснай беларускай вясковай сям'і хістаўся ў дастаткова істотным дыяпазоне, што робіць праблематычным з навуковага пункту гледжання магчымасць аперыраваць сярэднімі лічбамі, але лічба ад 4 да 6 чалавек, на якую прыпадае найбольшы працэнт даследаваных сем'яў, падаецца аб'ектыўна адпавядаючай тагачаснай рэчаіснасці. Альтэрнатыву гэтым сем'ям складалі вялікія ці непадзеленыя, якія маглі быць бацькоўскімі — г. зн. складацца з бацькоў з жанатымі дзецьмі, ці брацкімі — з некалькіх жанатых братоў. Такія сем'і былі досыць вялікімі — колькасць іх членаў магла даходзіць да 15—18 чалавек. У сярэднім беларуская сям'я таго часу налічвала 5—7 чалавек. Улічваючы характар сямейнага быту таго часу — аднапакаёвая хата памерам прыкладна 20—24 кв. м. з сенцамі і каморкай, хата, дзе ўзімку трымалі дробную жывёлу, цялят—такая шчыльнасць насельніцтва падаецца досыць значнай.

### *4.2.2. Выхаванне дзяцей*

Значную па насычанасці частку быту складалі падзеі сямейнага жыцця, сярод якіх адной з найбольш істотных было нараджэнне дзіцяці. Як можна меркаваць па матэрыялах наступнай гістарычнай эпохі, а таксама зыходзячы з рэальных умоў тагачаснага вясковага жыцця, больш пажаданым было нараджэнне хлопчыка. «Дзякуй Богу і Хрысту, што я хлопчыкам расту» (асабісты архіў Л. М. Салавей, палявыя запісы 70-х гг. XX ст.) — гэтая вясковая прыказка, падаецца, была актуальнай і ў эпоху, што даследуецца. Пасля нараджэння немаўлятка клалі ў калыску, якая на нашых землях была падвешанай, у адрозненне ад калыскі польскай, што стаяла на зямлі. Каб дзіця заснула, яму, як спрадвеку павялося, спявалі. Часам

маці вымушана была браць дзіця ў поле, на жніво. Ежу давалі немаўляці тую ж, што елі самі: пражаваныя гарох, капусту, разам з тым немаўляткам давалі рэчы спецыфічнага ўздзеяння, напрыклад мак. Мала вядома і пра дзіцячую спецыяльную вопратку — хутчэй за ўсё яна складалася з кашулькі, якую насілі амаль да дзесяці гадоў як хлопцы, так і дзяўчаты. Такім чынам, у сялянскай сям'і мелася праблема спецыяльнай, адаптаванай для дзіцяці сферы бытавой культуры, дзе б дзеці не разглядаліся цалкам як непаўнацэнныя, малыя дарослыя, асноўная задача якіх — як мага хутчэй вырасці і зрабіцца ўдзельнікамі грамадска-працоўнага сялянскага жыцця.

Падрыхтоўка да працоўнай дзейнасці ляжала ў аснове выхавання дзяцей. Яна, гледзячы па ўсім, праходзіла, як і ў наступную гістарычную эпоху. У працоўным выхаванні можна вылучыць тры перыяды: імітацыйны, дапаможных работ («пастухоўскі») і спецыялізаванай працы. Да 5 год дзеці імітавалі працоўныя аперацыі, а з 6—8 год уключаліся ў прымітыўную гаспадарчую дзейнасць, аснову якой складала пастухоўская праца. Як адзначаў Л. Галямбёўскі, у «люду рускага», куды ён уключаў і беларусаў, да 12 год дзеці толькі пасвілі валоў, бацькоўскі ці грамадскі статак, і былі пакінутыя на саміх сябе.

Паказальна, што з 12 год дзецям у адным з інвентароў 1787 г. прадпісвалася выходзіць раз на тыдзень разам з дарослымі членамі сям'і на вялікія «гвалты». Прыблізна з 13—15 год падлеткаў сістэматычна прывучалі да спецыялізаванай працы, хаця ўменні, асабліва дзяўчынкам, спарадычна прывіваліся і раней. З гэтага часу пачыналася сацыялізацыя юнакоў і дзяўчат, яны, калі можна дапусціць гэтую паралель, уваходзілі ў фазу ініцыяцыі, у чым вялікая роля належала менавіта змене характару працоўнай дзейнасці. Увогуле, выхаванне дзяцей у сялян мела выразны утылітарна-рацыянальны характар, мела задачай вырасціць працаздольнага, непатрабавальнага да знешніх умоў жыцця чалавека, які здолее адаптавацца да складаных умоў навакольнай рэчаіснасці, барацьбы за матэрыяльныя жыццёвыя патэнцыі.

### *4.2.3. Шлюб*

Сярод даследчыкаў існуе досыць устойлівае меркаванне, што шлюбы па каханні былі не надта распаўсюджанымі ў сялянскім асяроддзі — першае месца займалі практычныя, маёмасныя высновы, сацыяльны статус, разлікі бацькоў; акрамя гэтага, на шлюб трэба было атрымаць дазвол пана ( прычым дзяўчаты і ўдовы, што ішлі ў шлюб у іншы маёнтак, абкладаліся падаткам — куніцай). Разам з тым, традыцыйныя маладзёжныя дашлюбныя звычаі, абрады і гульні, такія, як вячоркі, купалле, калядкі, гульня «Жаніцьба Цярэшкі» і інш., давалі магчымасць юнаку і дзяўчыне выбраць сабе спадарожніка жыцця зыходзячы з пачуццяў адзін да аднаго, а таксама прыналежнасці да сваёй маёмаснай, сацыяльнай групы. Прычым у першую чаргу ўвага звярталася на матэрыяль-

нае забеспячэнне мужчыны, яго маральныя якасці (каб не быў п'яніцай, буянам), а таксама маральны прэстыж яго сям'і. Звычайна заможныя жаніхі бралі багатых нявест, у той час як не было заведзена, каб забяспечаныя нявесты ўступалі ў шлюб з малазаможнымі жаніхамі. З XVIII ст. пашырыліся шлюбы заможных сялян з прадстаўнікамі малазаможнай шляхты. Асабліва ўдалым лічыўся шлюб сялянскай дзяўчыны са шляхціцам — у гэтым выпадку яна рабілася дваранкай, калі ж шляхціц уступаў у шлюб з сялянкай, дык ён пазбаўляўся шляхецтва. Што да нявесты, дык істотным крытэрыем яе грамадскага поспеху ў шлюбным выбары была яе працавітасць. Як сведчыць вопіс пачатку XIX ст., калі дзяўчына не ўмела ткаць, шыць, вышываць і г. д., то яе называлі «няўмека», «няздольніца», і яна звычайна няхутка знаходзіла сабе мужа, у той час як для працавітай дзяўчыны («работніцы», «здольніцы») хлопцы сваталіся так хутка, што яна не паспявала скончыць працу над пасагам. Найбольш распаўсюджаны ўзрост бацькоў — ад 21 да 40 год, хаця кожны восьмы-сёмы з сялян, што былі ў шлюбе, меў дзяцей ва ўзросце ад 15 да 20 гадоў. Але апошняе тычыцца ў асноўным жанчын — асноўная частка іх мела дзяцей ва ўзросце да 20 гадоў і, у меншай ступені, да 30. Што да шлюбнага ўзросту, дык, як адзначалася, ён складаў у сярэднім 15—16 гадоў для дзяўчыны і 18—19 — для хлопцаў. Я. Ласіцкі, які апісаў беларускае вяселле ў 1581 г., казаў, што дзяўчынкі ўступаюць у шлюб у 10—11 гадоў, што адпавядае шлюбнаму ўзросту прадстаўнікоў старажытных цывілізацый, аднак, магчыма, гэты ўзрост не суадносіўся непасрэдна са шлюбам, а тычыўся ўзросту заручын; сапраўдны шлюб мог адбывацца пазней. Па даных інвентароў, у абсалютнай большасці выпадкаў муж быў старэйшы за жонку, і гэтая розніца максімальна магла складаць 12—14 год. Увогуле сялянская сям'я мела ў сярэднім 2—3 дзіцяці, хаця сустракаліся і такія, дзе было і па 6 нашчадкаў.

У азначаны перыяд шлюб паміж сялянамі быў царкоўны і мог адбыцца пры ўмове згоды ўладара-феадала. Аднак муж і жонка маглі жыць разам і без санкцыі царквы ці вянчацца без ведама ўладальніка. Як адзначаў М. В. Доўнар-Запольскі, сумеснае жыццё без вянчання, на «сумленне», сустракалася, хаця і зрэдку, у асноўным сярод хаця і дальніх, але сваякоў, якія не маглі вянчацца па царкоўных правілах. Духавенства імкнулася абвянчаць фактычных мужа і жонку і не арганізоўвала праследаванні. Дастаткова рэальнай, хаця і нячастай, з'явай сямейнага жыцця былі разводы, дазволы на якія давалі свецкія і радзей — царкоўныя ўлады. У выпадку працяглага знікнення мужа ініцыятарам разводу магла быць жонка.

Сямейнае жыццё пачыналася, было санкцыянавана вясковай грамадой пасля традыцыйнага вяселля — разнастайнага абраду, які ў беларусаў вылучаўся рытуальным, фальклорным багаццем. Характэрна, што, нават павянчаўшыся, маладыя не маглі жыць разам, пакуль не адбудзецца вяселле, якое магло затрымацца па прычыне няхваткі грошай і інш.; такое становішча магло цягнуцца да году. Вяселле ладзілася

ў досыць кароткі перыяд — ад свята Пакроваў (14 кастрычніка ў праваслаўных) да першага тыдня каляднага посту (28 лістапада ў праваслаўных, 15 — у каталікоў). Такім чынам, перыяд, калі дзяўчына ці хлапец маглі ўступіць у шлюб, быў досыць малы — у выпадку няўдачы трэба было чакаць яшчэ год. Царква не забараняла рабіць вяселле ў іншы час, але вяскоўцы трымаліся гэтага часу перш-наперш таму, што ён быў спрыяльны ў матэрыяльных адносінах — ураджай сабраны, засекі поўныя, працы няшмат. Само вяселле складалася з папярэдняй часткі, трох дзён вясельнага застолля і паслявясельных рытуалаў. Аб папярэднім этапе вяселля дае ўяўленне апісанне вяселля мяжы XVIII — XIX стст. Гаенскай парафіі (Барысаўскі павет). Традыцыйна яно пачыналася са сватання (раней уваходзіла ў рытуал, які называўся заручыны, першыя ці малыя запоіны), якое адбывалася ў суботу ці чацвер, звычайна ўвечары; гэты рытуал быў насычаны іншасказаннямі, парафразамі. Зразумела, прыход свата не быў у хаце, дзе жыла дзяўчына на выданні, нечаканасцю і таму ў гэтыя дні там панаваў асаблівы настрой. Дзяўчына апраналася па - будзённаму, але ў больш вытанчанае, чыстае адзенне, увечары яна адна з усёй сям'і да апошняга мітусілася па хаце, прыбіраючы рэчы. Нарэшце з'яўляўся сват — адна з цэнтральных асоб вяселля, які павінен быў адпавядаць шэрагу патрабаванняў — быць сталага, але не старога ўзросту, заможным, добра ведаць вясельныя звычаі, умець жвава размаўляць, захоўваць цвярозы розум на застоллі. Разам са сватам маглі быць 2—3 паплечнікі. Свата, што заходзіў у хату, звычайна нібыта не заўважалі, але пасля рытуальнага звароту да гаспадара з павагай садзілі ў кут, дзе ён пачынаў размову па сутнасці: пералічваў вартасці жаніха. Тым часам дзяўчына бегла за сяброўкай і вярталася з ёй назад, прычым у хату не ўваходзіла, а чакала запрашэння побач, у каморцы. Па запыту свата жанчыны ішлі ў сенцы, каб запрасіць дзяўчыну ў хату; пасля некалькіх захадаў яна, нарэшце, уваходзіла. Ні ў якім разе нельга было выходзіць на сярэдзіну пакоя, глядзець у вочы прысутным; увесь выгляд дзяўчыны павінен быў дэманстраваць сціпласць. Яна станавілася недалёка ад дзвярэй, каля пячнога куточка, дзе размяшчаліся качарга, венік, іншыя хатнія прылады, вочы былі апушчаныя, пальцамі яна калупала сцяну. Адзначым апошняе дзеянне: згодна з меркаваннем неафрэйдыста К. Юнга, калупанне, трэнне, звязанае з нашымі глыбіннымі, падсвядомымі лібідыёзнымі, эратычнымі інстынктамі і дзеяннямі, упісваецца ў вясельную тэматыку. На запыт бацькоў аб шлюбе дзяўчына адказвала ціха, галава яе заставалася апушчанай, адказ не меў прамога характару: «як сабе хочаце», «што ж рабіць, калі трэба спраўляць тое свята, то хай так і будзе»; пасля чаго выходзіла на цэнтр хаты. Далей пачыналася застолле, дзе ўсе пілі гарэлку свата, шануючы адзін аднаго. Напаследак гаспадыня абкручвала пляшку даматканым палатном і ў такім выглядзе сват урачыста адносіў яе ў хату маладога. Паспяховае сватанне яшчэ не абавязвала да вяселля. У выніку адмовы вопытны сват ішоў у іншую хату і гэтак далей. Расплатай за адказ былі

грошы, якія бацькі нявесты павінны былі аддаць свату за гарэлку. У старажытным апісанні беларускага вяселля, зробленым літаратарам Янам Ласіцкім, прыгадваецца аб тым, што ў выпадку адмовы сябры жаніха кралі нявесту і аддавалі яе прэтэндэнту, пасля чаго ўжо іншыя хлопцы вярталі яе бацькам; учынак матывававаўся моцным каханнем. Звычай выкрадання нявест меў на беларускіх землях глыбокія гістарычныя карані: аб ім прыгадваецца яшчэ ў «Аповесці мінулых часоў» пры апісанні побыту радзімічаў, гэты звычай у мадыфікаваным выглядзе спарадычна сустракаўся ў беларусаў яшчэ ў другой палове XIX ст., а існаванне ў традыцыйнай беларускай вясельнай абраднасці XIX — пачатку XX ст. аналогій выкрадання нявесты складала спецыфічную асаблівасць беларускага вяселля ў параўнанні з рускім і украінскім. Разам з тым пра непасрэднае выкраданне ў канцы XVIII ст. размова не ідзе, яно прадстаўлена абрадавымі алюзіямі і, верагодна, паступова знікла на працягу XVII—XVIII стст., захаваўшыся ў абрадах як гістарычны ўспамін.

Дастаткова старажытным з'яўляецца і звычай куплі-продажу нявесты, элементы якога прысутнічаюць у традыцыйным вясельным рытуале беларусаў. Ён адлюстраваны ў адной з песень вясельнага абраду Гаенскай парафіі:

*Баяры вароты абляглі,*
*Пасыпалі золата на скалі,*
*Да ходзюць, паходзюць па дворы,*
*Да папросюць Тацянкі.*
*Тацянка татулькі прасіла:*
*—Даражы, татулька, даражы!*
*Да сто чырвонцаў запрасі,*
*Тады мяне маладу аддасі!*

Калі бакі не перадумвалі, дык выбіралі дзвюх дзяўчын—сваячак маладой, ці, калі такіх не было,— проста сяброўак — «бальшанак» (сярод іх адна была старэйшай), якія пераходзілі жыць у хату нявесты, спявалі там песні і да шлюбу не адыходзілі ад нявесты. Праз тыдзень спраўляліся «вялікія запоіны», «вялікая гарэлка» ці «вялікія заручыны», пасля якіх адмовіцца ад шлюбу было ўжо нельга. На «вялікія запоіны» прыязджалі сват з маладым, які прывозіў гарэлку, запрашаліся сваякі нявесты, якія ўважліва прыглядаліся да маладога — «судзілі яго». Вялікія заручыны мелі характар застолля, вячэры, на якім маладыя абменьваліся заручальнымі пярсцёнкамі, канчаткова пацвярджалася згода на шлюб, што набліжала іх да традыцыйных заручын, «вечарын». На заканчэнне маці нарачонай вяртала маладому пляшку, абгорнутую палатном. Пасля нарачоная актыўна займалася ткацтвам, шыццём — рыхтавала вясельныя падарункі, у першаю чаргу — паясы, а таксама абрусы і інш. На пяты дзень пасля вялікіх заручын у хаце дзяўчыны адбываліся «змовіны», «абрады», на якія яна запрашала асабіста, са старшай бальшанкай, ходзячы ад хаты да хаты, жыхароў вёскі, не абмінаючы нават малых дзяцей; збіраліся таксама ўсе сваякі маладой, як бы далёка яны ні жылі.

На «змовіны» прыязджаў малады з дружынай з дзесяці і болей чалавек, сярод якіх вылучаліся сват, два ці тры маладыя хлопцы — звычайна сваякі жаніха — «дружкі», а таксама «музыка» — гэтаксама са сваякоў (музыка мог не ўмець граць на чым-небудзь, ён толькі рабіў хуткую імітацыю гэтага, а граў іншы), іншая моладзь. Са старажытным культам рытуальнага агню звязаны звычай запальвання на змовінах каля хаты нявесты дзецьмі смалістых бярвёнаў. Хаця запальванне бярвёнаў тлумачыцца ў апісанні неабходнасцю паведамлення пра ўрачыстасць і надання ёй большай святочнасці, гэтае дзеянне мае іншыя, глыбокія семантычныя вытокі, якія сцерліся з народнай памяці. У традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў, а таксама шматлікіх іншых народаў, агонь адыгрываў ачышчальную ролю, выконваў таксама функцыю абярэга ад злых сіл. У традыцыйным вяселлі наступнай гістарычнай эпохі агонь выконваў менавіта гэтую ролю, аб чым сведчыць звычай перагароджваць дарогу маладым, якія едуць з царквы, запаленым кулём саломы. Змовіны пачыналіся зранку, з рытуальнага запрашэння гаспадара ў хату, ад чаго той настойліва адмаўляўся. Затым пачынаўся рытуал паклонаў маладой гасцям, абранне маладзіцы (жанчыны, што знаходзілася ў шлюбе не болей 1—2 гадоў і якая дапамагала ў абрадах нявесце), у хаце нарэшце з'яўляліся бацька маладой, яе маці, і пачыналася застолле, на якім пасаджаныя рытуальным парадкам прысутныя пілі па чарзе адзін да аднаго з чаркі, пакрытай белай, потым каляровай (чырвонай) хусткай. Маладыя зноў абменьваліся пярсцёнкамі, сват дарыў маладой чаравікі, якія яна пасля трох запрашэнняў прымала. Абутак, падораны нявесце звычайна жаніхом ці ягоным братам, меў у славянскім вясельным рытуале выключнае значэнне, бо абазначаў прыняцце таго, хто яго носіць ( нявесты ), у хатнюю ці радавую супольнасць жаніха. Пачыналіся танцы — кожны следам за маладым, запрашаў жанчыну, што сядзела насупраць яго, прычым малады танцаваў з нявестай толькі адзін раз, а асноўную ўвагу надаваў яе сваякам, асабліва жанчынам сталага ўзросту. Гралі вясельныя інструменты, сярод якіх асноўныя — скрыпка, дуда, жалейка; як адзначаў Я. Ласіцкі, на вяселлі часцей за ўсё скакалі пад рукаплясканні. Асноўныя напоі вясельных застолляў — гарэлка і піва.

Праз тыдзень, у суботу, маладая з бальшанкамі і маладзіцай ішла да споведзі, пасля якой адбываўся апошні вечар папярэдняга цыкла — «дзявочы вечар», на які прыходзілі толькі дзяўчаты. Магчыма, меў месца аналагічны сход хлопцаў, сведчанні аб якім спарадычна сустракаюцца ў этнаграфічных матэрыялах наступнага гістарычнага перыяду.

За папярэднім этапам вясельнага рытуалу адбывалася вянчанне, якое прыгадваецца ў якасці неабходнага кампанента вяселля яшчэ ў апісанні Я. Ласіцкага. Згодна з ім, да храма ішлі позна, вечарам, з сабой неслі мядовае віно, брагу, піва, рытуальны хлеб. Пры вянчанні святар пытаўся ў жаніха, ці не будзе ён біць жонку палкай, ці не пакіне яе, калі будзе хворая, карослівая, пакалечаная; у нявесты пытаўся, ці зможа яна жыць з мужам, ці будзе клапаціцца аб сям'і, ці будзе верная сляпому,

кульгаваму, пакалечанаму мужу. На маладых надзяваліся вянкі з надпісам «па-русінскі», г. зн. па-старабеларуску «расціце і размнажайцеся». Святар і маладыя пілі «пеністага мёду», потым вянкі з галоў скідвалі, тапталі і пачыналі вадзіць карагоды, якія ўзначальваў святар. Злучэнне ў старажытным рытуале хрысціянскага і язычніцкага праяўлялася і ў звычаі раскідвання жанчынамі па храме зерня лубіну, лёну і прыгавору пры гэтым: «Хай жа богі нашы зробяць так, каб маладажоны ніколі не мелі нястачы».

Пасля вянчання ішла асноўная частка вяселля, якое пачыналася ў нядзелю, ішло тры дні ў хаце маладога па абраднасці, як можна меркаваць, каравайнага ці, зрэдку, стаўбавога варыянтаў і ўключала абмен падарункамі, дзяленне караваю і інш. У канцы першага дня маладых вялі спаць — звычайна ў клець, назаўтра дзень пачынаўся з рытуалу іх буджэння і праверкі цнатлівасці маладой. У першай палове XIX ст. апісвалася, што маладую з ранку вялі да вадаёма, дзе, калі маладая была цнатлівай, ваду праз яе пералівалі, а калі не — аблівалі. У гэтым выпадку вяселле ішло іначай: бацькоў маладой абражалі, маглі ў хамуце вадзіць па вёсцы, у хаце білі посуд, рабілі разгром.

### *4.2.4. Сямейныя адносіны*

Падзел працы ў сям'і ажыццяўляўся па полаўзроставай прыкмеце. Так, сялянскія жанчыны, як адзначаў у 1792 г. А. М. Лунін, займаюцца хатняй працай, а таксама «жнуць, прадуць простымі калаўротамі, ткуць палатно і сукно простае сялянскае». Акрамя гэтага, як і ў наступную эпоху, жанчына дапамагала пры сенакосе, працавала падчас збору ўраджаю. У хатнюю працу ўваходзіла прыгатаванне ежы, догляд свойскай жывёлы і г. д. Прычым полаўзроставы падзел працы і быту быў звязаны з часамі году: так, узімку побыт жанчыны быў цесна звязаны з ткацтвам. Становішча жанчыны вызначалася формай сям'і і было некалькі лепей у маладой, дзе яна мела права не толькі на нерухомасць, якая дасталася ёй у пасаг, але і — у выпадку смерці мужа — на надзел зямлі (у інвентарах удава амаль заўсёды называецца трымальніцай дзялянкі). Адносна раўнапраўным было становішча жанчын у брацкай сям'і, дзе галоўнай была жонка старэйшага брата. Мужчыны ў сям'і выконвалі асноўную гаспадарчую працу, нарыхтоўвалі дровы, рамантавалі прылады працы, хатнія пабудовы і г. д. Старэйшы па ўзросце мужчына звычайна быў галоўным у сям'і, за выключэннем тых выпадкаў, калі ён не мог выконваць свае абавязкі з-за старэчага ўзросту ці няздольнасці (п'янства, хвароба і г. д.).

Умацаванне сваяцкіх адносін паміж дзецьмі і бацькамі, асэнсаванне сваёй сямейнай адметнасці выявіліся і ў з'яўленні ў беларускіх сялян устойлівых спадчынных найменняў — прозвішчаў. Узнікненне прозвішчаў сведчыла аб працэсе стабілізацыі дыяхронных унутраных інфармацыйных сувязей этнасу, а таксама сямейнай і асобаснай (у межах сям'і ) самасвядомасці беларускага сялянства.

У XVII — XVIII стст. у беларусаў — прадстаўнікоў заможных слаёў грамадства — працягваўся пачаты ў XV ст. працэс складання трохкампанентнай сістэмы найменняў, у межах якой на аснове імён па бацьку, імён-мянушак і г.д. пастутова ўзнікалі ўласна прозвішчы. Сяляне аж да апошняй чвэрці XVIII ст. звычайна называліся двухкампанентнай формай, першая частка якой складалася з уласнага імені, а другая часцей за ўсё была прадстаўлена імем па бацьку, прычым яна захоўвалася амаль заўсёды ў двух пакаленнях. Двухпакаленная перадача імя па бацьку ці мянушкі не можа служыць падставай для канстатавання антрапанімічнай сваяцкай пераемнасці, для яе неабходна наяўнасць дыяхронна больш глыбокага антрапанімічнага вызначэння. Для даследавання гэтай праблемы ў дачыненні да сялянства маюцца дасканалыя крыніцы — дыяхронныя інвентары аднаго маёнтка. Іх аналіз сведчыць, што ў шэрагу выпадкаў пэўныя найменні жыхароў сялянскіх паселішчаў існавалі ў гэтых населеных пунктах працяглы перыяд часу, што прадугледжвала іх шматпакаленнае спадчыннае пераманне. Так, найменне Гурын у вёсцы Несцяняты ўладання Смаргонь прасочваецца ў шасці паслядоўных інвентарах з 1622 па 1788 гг. Прычым інвентарныя вопісы фіксуюць паслядоўную перадачу гэтага антрапоніма прадстаўнікамі трох, а магчыма, чатырох пакаленняў адной сваяцкай лініі. Чатырохпакаленная пераемнасць мела месца пры перадачы антрапоніма Усніч у вёсцы Лапічы маёнтка Лапічы Ігуменскага павета ў інвентарах 1726, 1760, 1803 гг. Працэс узнікнення прозвішчаў у сучасным значэнні гэтага слова ў сялян Беларусі XVIII ст. ішоў у кантэксце крышталізацыі індывідуальна-сваяцкай самасвядомасці, звязанай з развіццём малой сям'і. Пераход ад мянушкі да ўстойлівага сваяцкага антрапоніма не ў апошнюю чаргу звязаны з маёмасным наследаваннем валочнай зямлі, замацаваннем сваяцкай спадчыннасці ў яе валоданні. Такім чынам, антрапанімічны матэрыял сведчыць аб сінхроннасці этнакультурных працэсаў у розных сацыяльна-класавых стратах старабеларускага грамадства — у асяроддзі шляхты, гараджан і сялян назіралася амаль паралельнае ўсталяванне сваяцкай свядомасці.

Антрапанімія дадзенай эпохі мела і этнічную маркіроўку. Характэрнай асаблівасцю разгорнутых мужчынскіх найменняў тагачасных беларусаў, у тым ліку і вяскоўцаў, была наяўнасць значнай колькасці патрамімічных форм з суфіксамі —овіч, —евіч, —іч . Яшчэ адна істотная этнакультурная акалічнасць: у найменнях беларусаў адсутнічалі змяншальна-прынізлівыя інтэрпрэтацыі імён, што былі ўласцівыя тагачасным рускім, у тым ліку і на афіцыйным узроўні (Астапка, Данілка, Івашка і інш.). Характэрна таксама, што ў антрапонімах праяўляецца этнічнасць: мянушкі выхадцаў з іншых краін акцэнтуюць іх этнічную прыналежнасць. Так, у інвентары в. Свірыдавічы (Смаргоншчына) за 1672 г. прыгадваецца навасёл Ян Маскаль.

Як сведчыць шматлікі антрапанімічны інвентарны матэрыял, для перыяду, што даследуецца, уласцівы канчатковы пераход сялян на асабістыя

імёны хрысціянскага паходжання. Старажытнаславянскія імёны амаль не сустракаюцца ў вопісах насельніцтва вёсак — гэты элемент старажытнаславянскай культуры канчаткова сышоў з сялянскага побыту ці не самым першым. Разам з тым у інвентарах не прыгадваюцца ўзроставыя градацыі сялянскіх імён, якія ўласцівыя антрапаніміі беларусаў XIX ст. Магчыма, гэта звязана са спецыфікай інвентарных вопісаў.

## 4.3. Гарадская сям'я

Тып паводзін мешчаніна знешне арыентаваўся на мадэльны шляхецкі, але меў і свае якасныя адрозненні, перш-наперш звязаныя з паняццем буржуазнай маралі, што ляжала ў падмурку дзелавога — купецкага, рамесніцкага — жыцця гараджан. Для яго ўласцівыя такія з'явы, як прадпрымальнасць, матэрыяльны разлік, ашчаднасць, сцiпласць, працавітасць, меркантылізм. Галоўная спецыфіка мяшчанскага сямейнага жыцця звязана з яго гаспадарчай сферай. Мешчанін XVIII ст. траціў на працоўныя справы значна больш часу, чым шляхціц. Калі ў папярэднім стагоддзі шляхціц меў за звычай кожны дзень сам аб'язджаць свае палі і ў сэнсе гаспадарчасці не саступаў мешчаніну, дык у XVIII ст. працоўны прыярытэт перайшоў да мяшчанства. Паказальна, што, па даных А. М. Лютага, у канцы XVIII — пачатку XX ст. з 63 вядомых уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі 46 чалавек (73%) былі мяшчанамі, астатнімі ўладарылі ў асноўным дваране.

Працоўны ўхіл мяшчанскай жыццядзейнасці наклаў адбітак на сямейнае становішча жанчыны. Жанчына-гараджанка была паўнапраўнай гаспадыняй у доме, але менш удзельнічала ў свецкім жыцці, што кампенсавалася яе вялікай роляй у якасці памочніцы ў справах мужа: так, жонкі купцоў нярэдка станавіліся гандлёвымі партнёрамі мужоў. Увогуле, мяшчанка адрознівалася параўнальна істотнай юрыдычнай самастойнасцю, правы на якую яна актыўна выкарыстоўвала. У інвентарах мы сустракаем яе ў якасці галоўнай утрымальніцы падатковай маёмасці былога мужа пры яго сынах, у судах не рэдкасць — іскі мяшчанак, прычым да асоб досыць высокага ўзроўню. Так, у 1644 г. маці бурмістра (вышэйшай асобы магістрата) г. Камянца Анастасся Кашубіна звярнулася са скаргай на яго за прысваенне маёмасці і грубае абыходжанне з ёй і яе братам. Судзіліся мяшчанкі і паміж сабой.

Структуру мяшчанскай сям'і дакладна вызначыць складана па прычыне непаўнаты інвентароў. Аднак можна адзначыць досыць нізкую, параўнальна з сялянскай, колькасць брацкіх сем'яў і, як можна меркаваць, непадзеленых увогуле. Так, па даных інвентара 1689 г. г. Смаргоні, з 78 дымоў (падатковых адзінак), дзе жылі мяшчане хрысціянскага веравызнання, 22 запісаныя за гаспадарамі без дзяцей, 38 — за гаспадарамі з сынамі, 12 — за ўдовамі і проста жонкамі амаль заўсёды з сынамі, і толькі 6 налічвалі гаспадара з братамі, пляменнікамі і інш.

Пры выхаванні дзіця, як можна меркаваць па ўскосных даных, пераважна далучалася да бацькоўскай прафесіі. Што да агульнай адукацыі, дык мяшчане ў дастатковай колькасці прадстаўлены сярод навучэнцаў калегіумаў, школ пры каталіцкіх ордэнах, брацтвах. Вядомыя факты атрымання дзецьмі мяшчан адукацыі ў замежных універсітэтах.

Можна сказаць, што пастаянным і рэзкім антыподам шляхецкага быў мяшчанскі бытавы тып, што асоба яскрава праявілася ў канцы XVIII ст. Супрацьлегласць быту мяшчанскага і феадальнага — асцярогі і рызыкі, шырокага жэсту і знявагі да працы дзеля заробку (асабліва фізічнай), пошукаў бяспекі і прагі ваяўнічай славы — мае вытокі ў антычнай старажытнасці, калі пачалі закладвацца рысы «рыцарскага» стылю жыцця. У шляхецкай Рэчы Паспалітай гэтае супрацьстаянне ўзмацнялася, з аднаго боку, каставай замкнёнасцю феадальнага саслоўя, а з другога — нарастаннем у сувязі з развіццём буржуазных адносін у мяшчанскім асяродку такіх якасцей, як эканомнасць, дзелавітасць, меркантылізм. Процілегласць гарадскога і шляхецкага стыляў жыцця выявілася ў працах паэта і філосафа, гуманіста мяжы XVII—XVIII стст. Юзэфа Даманеўскага, творчасць якога была звязаная з беларускімі землямі. У паэме «Жыццё сялянскае і гарадское», а таксама ў творы «Некаторыя эмблемы», нягледзячы на відавочную апалогію сялянскага жыцця, аўтар супрацьпастаўляе пустое баўленне часу і марнатраўства феадальнага саслоўя, яго спажывецкі лад жыцця працалюбству і беражлівасці гарадскіх рамеснікаў, купцоў, якія перасягаюць шляхту па сваім маральным абліччы і карысці, што прыносяць грамадству. У цэлым Ю. Дамаеўскі фіксуе ўзмацненне светапогляднага, таксама бытавога антаганізму паміж феадаламі і гараджанамі, адлюстроўвае прынцыповае непрыманне шляхтай гарадскога жыцця з яго хуткім тэмпам, перавагай асабістых якасцей індывіда над прывілеямі саслоўнай прыналежнасці, схільнасцю да прадпрымальніцтва. Тут адзін аднаму супрацьстаялі два культурныя светы — які набірае моц і які трухлее,— рэзка адметныя па сістэмах каштоўнасцей, светапогляду, стылю быту. З пункту гледжання жыццёвых установак, асноўнымі размежавальнікамі былі, з аднаго боку, знатнасць паходжання і народжаная ёй ганарлівасць, а з другога — акцэнтаванне асаблівай жыццёвай прадпрымальнасці, матэрыяльны разлік, сціпласць. Разам з тым марудны характар усталявання буржуазных адносін абумовіў тое, што буржуазны і шляхецкі этасы на Беларусі доўга дакладна не падзяляліся, іх носьбіты былі амбівалентныя ў сваіх светапоглядных характарыстыках. Гэта нагадвае сітуацыю ў Францыі і Англіі, дзе таксама назіралася інтэрферэнцыя буржуазных і рыцарскіх асобасных узораў.

# 5. ГРАМАДСКІ БЫТ

## 5.1. Грамадскі быт шляхты

У Рэчы Паспалітай — дзяржаве, куды ў складзе Вялікага княства Літоўскага ўваходзілі землі Беларусі,— шляхта была дамінуючым саслоўем, а шляхецкая культура — узорам, мадэллю для гараджан, мястачкоўцаў, заможных сялян. З цягам часу ў шляхты ўсталяваўся свой адметны культурны комплекс, стыль жыцця і культуры, які склаўся на падставе ідэйнай плыні сарматызму, прынцыпаў рыцарскай культуры, такіх фундаментальных асноў шляхецкага светапогляду, як роўнасць, вольнасць, служэнне айчыне, рэлігійнасць. У падмурку гэтага стылю ляжаў сарматызм (ад сарматаў — гістарычнага ваяўнічага племені, з якога выводзіла сваё паходжанне шляхта). У аснове сарматызму знаходзіўся ідэал воіна-двараніна,— мужнага, непатрабавальнага да камфорту і стойкага да нягод, сумленнага, гатовага ахвяраваць сабой дзеля абароны дзяржавы, веры, справядлівасці.

Шляхта (слова пайшло ад старажытнага верхненямецкага Slahta — род, радавітасць) — пануючае дваранскае саслоўе ў шэрагу краін Усходняй Еўропы, у тым ліку Польшчы, Вялікім княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай, землях Беларусі. Яго вытокі ўзыходзяць да прафесійнага воіна-двараніна — рыцара, а ў той форме, якая існавала на нашых землях, яно аформілася ў Польшчы ў XIII—XIV стст. Раней прадстаўнікі пануючага феадальнага класа называліся на нашых землях баярамі, а таксама зямянамі. У XVI ст. аформіўся прававы статус шляхты як пануючага саслоўя. Да XVII ст. вылучыліся найбольш знакамітыя і ўплывовыя шляхецкія рады, звязаныя з нашымі землямі: Радзівілы, Сапегі, Тышкевічы, Пацы, Агінскія, Завішы і інш. Шляхціц быў асноўным суб'ектам прававой дзейнасці, заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Шляхецкае саслоўе было асноўным уладальнікам прыватнай уласнасці — зямлі і іншай маёмасці, якую дзяржаўным уладам нельга было канфіскаваць, за выключэннем выпадку здрады Радзіме,— і якая абкладалася вельмі невялікімі падаткамі. Шляхта называлася рыцарскім саслоўем — яно адно (за выключэннем пэўных катэгорый гараджан) мела права насіць зброю — сімвалічна-культавую шаблю, а таксама іншую, пераважна халодную. Як прадстаўнікоў ваеннага саслоўя, галоўным абавязкам шляхты было бараніць радзіму, збірацца для гэтага на «паспалітыя рушэнні». Пад пагрозай пазбаўлення шляхецтва дваранству было забаронена займацца гандлем, рамёствамі, шынкарствам (гэта забарона для шляхты, што жыла ў гарадах, была скасавана ў 1775 г.). Акрамя шаблі, знакавай адзнакай шляхты былі радавыя гербы (часта спалучаныя з дэвізам), якія прыйшлі да нас у сваёй аснове з Польшчы і перадаваліся шляхціцамі ў спадчыну. Мужчыне зрабіцца шляхціцам можна было па нараджэнні ад бацькі-шляхціца, а таксама за вялікія заслугі перад дзяржавай праз

набілітацыю, калі шляхецтва прысвойваў кароль ці сейм, — набілітант мог адразу атрымаць усе правы старажытных радоў ці правы абіраць і быць абраным на пасады атрымліваліся праз тры пакаленні. Акрамя гэтага, можна было прыпісаць чалавека да свайго шляхецкага герба (адопцыя), але за гэта пасля 1633 г. можна было пазбавіцца шляхецтва. Атрымлівалі шляхецтва і радавітыя прадстаўнікі іншых краін. З другой паловы XVIII ст. жорсткія межы шляхецкай адасобленасці істотна пахіснуліся: шляхціцы пачалі браць жонак з заможнага мяшчанства, а багаты і прыстойны мешчанін мог без асаблівых перашкод атрымаць шляхецтва. Фармальна ўся шляхта была адным, абсалютна роўным у правах «шляхецкім народам», дзе апошні быў роўны першаму, — гэта тычылася і караля. Гэты пастулат быў неаднаразова пацверджаны афіцыйнымі забаронамі тытулаў князя і графа, за выключэннем тых, што былі да Люблінскай уніі 1569 г. Тым не менш, шляхта была досыць разнастайная па маёмасным становішчы: была магнатэрыя, заможная і сярэднезаможная шляхта, засцянковая (заградовая), што не мела сялян, і гербавыя браты — шляхта без зямлі, што займалася толькі службай. Шляхта складала, па розных падліках, ад 8 да 12 % насельніцтва Вялікага княства Літоўскага ў XVII—XVIII стст.— яе лічба хісталася ў межах 200 тыс. чалавек., што адпавядала сярэдняй колькасці дваранства ў краінах тагачаснай Еўропы. Пасля далучэння нашых зямель да Расіі большая частка шляхты атрымала расійскае дваранства, найменш заможная была пераведзена ў склад асабіста вольнага насельніцтва.

### *5.1.1. Характэрныя формы грамадскага быту*

У дачыненні да шляхты вылучыць непасрэдна быт і аддзяліць яго ад працоўнай дзейнасці досыць складана. З аднаго боку, сфера дзейнасці шляхціца як уладальніка асноўнага сродку вытворчасці — зямлі павінна быць звязана з кіраўніцтвам працоўнай дзейнасцю маёнтка. Так яно і было ў XVII ст., калі шляхціц пачынаў дзень з аб'езду палёў, агляду гаспадаркі і значны час прысвячаў гэтай працы, што, дарэчы, адрознівала шляхту Рэчы Паспалітай ад еўрапейскага дваранства, адносна мала звязанага з непасрэдным удзелам у гаспадарчай дзейнасці. Але ўжо з XVIII ст. шляхта ў сваёй масе ўсё болей адыходзіла ад гаспадарчых спраў, аддаючы перавагу забаўляльным формам правядзення вольнага часу. З іншага боку, шляхта як асноўны суб'ект палітычнага жыцця была абавязана прымаць актыўны ўдзел у працы сеймікаў, сеймаў, выкананні абавязкаў, звязаных з разнастайнымі палітычнымі, судовымі пасадамі, што можа разглядацца як прафесіянальная дзейнасць. Разам з тым з XVIII ст. сеймавая дзейнасць шляхты ўсё болей зазнавала ўплыў дэструктыўнасці, узброеных сутыкненняў паміж палітычнымі групоўкамі, баляванняў, зрываў сеймаў увогуле, што ставіць пад сумненне прафесіянальны характар дзейнасці шляхты на гэтых сходах. Як альтэрнатыву анархізму і свавольнасці ў часы Асветніцтва шляхта пачала

прысвячаць свой вольны час асветніцкай, інтэлектуальнай дзейнасці, ініцыяцыі і ажыццяўленню шэрага грамадска-прагрэсіўных праектаў у галіне палітыкі, эканомікі, адукацыі і г. д., набыла якасці прафесіянальных дзеячаў у шэрагу галін, што сведчыць аб прафесіяналізацыі дзейнасці ў вольны час. Усё гэта ўтварае досыць складаную карціну таго, што называецца шляхецкім бытам. Таму мы будзем разглядаць яго ў шматлікіх праявах — вылучыўшы спачатку яго асноўныя, сацыяльна-адметныя рысы, а потым — у кантэксце тыповых эпахальных праяў. Пры гэтым з паняцця быту будзе выключана дзейнасць шляхціца па кіраванні гаспадаркай, а таксама палітычная, ваенная (удзел у вайсковых аб'яднаннях ) сферы жыццядзейнасці.

Мадэльнай, узорнай групай у стылі жыцця, быце была заможная шляхта, на якую раўнялася шляхта сярэдняя, да якой па меры магчымасці цягнулася шарачковая. Прасторава-часавае адзінства і своеасаблівасць яго асноўных рыс грунтавалася на прававым і эканамічным становішчы шляхты як пануючага і прывілеяванага саслоўя Рэчы Паспалітай.

Складаючы падраздзяленне традыцыйна-бытавой сферы феадальнай культуры, бытавая вобласць мела ў межах Рэчы Паспалітай поліэтнічны характар — шляхта была польскай, беларускай (ліцвінскай), літоўскай, украінскай, іншай па паходжанні. Акрамя гэтага, распаўсюджанне шэрага яе характэрных рыс было звязана з экспансіяй польскай, французскай культур, развіццём мясцовых традыцый. Таксама як прадукт эпохі, шляхецкі бытавы тып уключаў шэраг рыс эпахальнага, мэтакультурнага маштабу, звязаных з культурай барока, Асветніцтва і эпохай у цэлым. Разам з тым для ўсёй шляхты былі ўласцівыя пэўныя агульныя рысы, дзякуючы чаму мы можам казаць пра шляхецкі бытавы тып, які грунтаваўся на ідэйным падмурку шляхецкага этасу, у дачыненні да якога сацыяльны, маёмасны, нават этнічны фактары былі другаснымі.

Семіятычнае значэнне быту, як і ўсёй шляхецкай культуры, мела яскрава выражаны прэстыжны характар, ідэйным афармленнем якога ў азначаную эпоху быў сарматызм: да першай паловы XVII ст.— строга-класічны, потым, як піша польскі гісторык Я. Тазбір, — той, што абапіраўся больш на свет фікцыі. Тым не менш грамадская свядомасць шляхты захоўвала шэраг грунтоўных пастулатаў сарматызму, якія адбіліся і ў бытавой культуры. Гэта перш-наперш ідэі асабістай годнасці, вольнасці, братэрства паміж «панамі-братамі». У кодэксе шляхецтва вялікая роля належала пастулату самаахвярнасці дзеля асноўнага абавязку — абароны радзімы. Асаблівы ўздым гэта ідэя атрымала пры каралі Стэфане Баторыі, які яе ўсяляк падтрымліваў, нават паэтызаваў.

У генетычна-гістарычным плане бытавыя нормы шляхты як вайскова-служылага саслоўя звязаныя са своеасаблівай культурай, якая мела еўра-амерыканскае распаўсюджванне і якую М. Асоўска назвала «рыцарскай». У разглядаемы перыяд шляхта, знаходзячыся ў асяроддзі асноўных светапоглядных прынцыпаў гэтай культуры, у значнай ступені

дэструктуравала і давяла да пэўнага адмаўлення пазітыўную сутнасць некаторых з іх, а таксама апалагізавала тыя, якія адпавядалі яе рэальнаму становішчу, у прыватнасці асноватворны прынцып «гонару».

Яшчэ адна архетыпічная рыса шляхецкай свядомасці і быту — пачцівыя адносіны да жанчыны, якія пасля таго, як шляхцянка ў другой палове XVIII ст. «выйшла ў свет», зрабілі яе культавай постаццю грамадскага жыцця.

Культурная свядомасць шляхты ўвасобілася ў этнанімічнай сітуацыі. Азначэнне «ліцвіны» (назвы з боку — літва, літоўцы, літоўшчыкі ), якое мела палітычнае (палітонім), этнакультурнае, сацыяльнае значэнне, зрабілася дамінуючым для шляхты Вялікага княства Літоўскага. Разам з тым гэтае азначэнне мела ў розных кантэкстах розную семантыку, што тлумачыцца шматслойнасцю тагачасных найменняў. Так, у якасці саманазвы азначэнне «ліцвін» ужывалася пераважна этнічнымі беларусамі і ўсходнімі літоўцамі (заходнія называліся жмуддзю, жмудзінамі, жамойтамі). Палякі, рускія, украінцы таксама ўжывалі для азначэння гэтых народаў назву ліцвіны, і гэта супадзенне энда- і экзаназвы сведчыць аб яе набліжэнні да этнаніма. Прычым мясцовая частка шляхты добра ўяўляла сваё ліцвінскае адрозненне ад іншага народа Рэчы Паспалітай — палякаў. Замежнікі з Заходняй Еўропы, кажучы аб жыхарах Рэчы Паспалітай увогуле, а таксама часам палякі называлі беларускую шляхту палякамі, але самі шляхціцы ўжывалі гэтую саманазву вельмі рэдка, што сведчыць аб трывалай мясцовай культурнай свядомасці і ставіць пад пытанне праблему паланізацыі на ўзроўні менталітэту старажытнай тутэйшай шляхты. Вельмі добра адрознівалі літву і палякаў і ў Маскоўскай дзяржаве, асабліва ў апісаннях ваенных дзеянняў. Як рэлікт для шляхты праваслаўнага веравызнання магло ўжывацца вызначэнне «русін». Назва «беларусец» выкарыстоўвалася малазаможнай шляхтай. Метасацыяльную, культурна-інтэграцыйную ролю для шляхты выконвала азначэнне «народ шляхецкі».

Характэрнай рысай шляхецкай культуры XVII—XVIII стст. было спалучэнне індывідуалістычнага самавольства з рэгламентаванымі нормамі паводзін у сямейнай, палітычна-публічнай сферах жыцця. Шляхціц павінен быў дасканала ведаць рытуал этыкету, валодаць культурай руху, і нават сама яго пастава, выпраўка, уменне хадзіць абавязаны былі адпавядаць уяўленню пра саслоўную перавагу. Як станоўчыя рысы гэтага стылю паводзін можна адзначыць арыентацыю на тактоўнасць і далікатнасць, валоданне аратарскім мастацтвам і інш. Увогуле тактоўнасць уваходзіла ў шляхецкі ідэал — яна падкрэсліваецца ў маральным кодэксе шляхецкай моладзі, складзеным у 1774 г. Адамам Чартарыйскім. Як станоўчыя нормы паводзін кодэкса адзначым забарону чытаць чужыя лісты, падглядаць, падслухоўваць. У кодэксе шляхецтва вялікая роля належала пастулату самаахвярнасці дзеля асноўнага абавязку — абароны радзімы.

З'яўляючыся параджэннем эпохі, дамінантай якой быў працэс паглыблення суб'ектывізацыі асобы, бытавы шляхецкі тып быў у сваёй аснове індывідуаліцкім — псіхалогія рыцара і яго нашчадка шляхціца грунтавалася на ідэі індывідуальнай моцы, асабістай незалежнасці, праве на індывідуальны выбар, што атаясамлівалася з гонарам. Аднак спецыфічныя ўмовы праўлення індывідуалістычных пачаткаў у Рэчы Паспалітай надалі яго якасцям стыхійны, гіпербалізаваны, гіпертрафіраваны характар. Паступовае разбурэнне цэнтралізаванага апарату дзяржавы, атмасфера феадальнай усёдазволенасці прывялі да надзвычайнага абвастрэння нічым не абмежаванага разгулу шляхецкага індывідууму. Таму бытавы тып шляхціца, які найбольш поўна акумуляваў рысы гэтага стылю, можна вызначыць як праяву стыхійнага індывідуалізму. Сістэма дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай абумовіла карэннае адрозненне гэтага ладу жыцця ад існуючага пры абсалютысцкай форме праўлення. Так, у прыватнасці, у Расіі першай паловы XVIII ст. дзяржава імкнулася перарабіць жыццё і быт, у тым ліку і дваран, дзеля сваіх патрэб.

Па сваіх глыбінных характарыстыках стыхійна-індывідуаліцкі тып звязаны з культурай барока, аднак ён у той ці іншай ступені быў уласцівы ўсёй тагачаснай шляхецкай культуры, нават яе плыням, што суадносіліся з культурамі Рэнесансу і Асветніцтва. Гэтых два культурных кірункі зрабілі істотны ўплыў на культуру шляхты, у тым ліку і яе быт, парадзіўшы адпаведны бытавы тып — асветніцкі, які сваёй пазітыўнай дзейнасцю адрозніваўся, нават стваралі альтэрнатыву стыхійнаму індывідуалізму асноўнай часткі шляхты. Таму мы разгледзім яго асобна.

Увогуле, пры ўсіх варыяцыях, бытавы тып шляхты быў даволі ўстойлівы і ўключаў шэраг стабільных заняткаў. Гэта — наведванне імшы, гаспадарчыя справы, паляванне — з ганчакамі, барзымі, лягавымі сабакамі пераважна замежных парод. Вынікі палявання былі галоўнай тэмай на абавязковай вячэрняй бяседзе. Шанаваліся хатнія гульні — ў косці, пытанні і адказы, пазней — у карты. Паступова распаўсюдзіўся звычай сістэматычна весці дзённік. Істотнай падзеяй хатняга быту зрабіліся прыбыцці гасцей, застоллі, танцы: дзігун, ліпка, выскачка, галубец, акруглы, Мацвея і Конрада, а таксама паланэз («вольны»).

Такім чынам, у дадзены перыяд можна вылучыць асноўны бытавы шляхецкі тып — стыхійна-індывідуалістычны (гіпертрафіравана-індывідуалістычны, барочна-індывідуалістычны — у залежнасці ад канкрэтнага кантэксту). Паралельна з ім існавалі познерэнесансны, асветніцкі бытавыя тыпы. Разам з тым спецыфіку гэтых бытавых тыпаў нельга разглядаць у адрыве ад асноўных ідыялагем галоўнага шляхецкага бытавога тыпу,— іх носьбіты не супрацьпастаўлялі сябе «шляхецкаму народу», яго мадэльным, сацыямадэльным параметрам — паняццям вольнасці, асабістай годнасці, шляхецкай роўнасці, адданасці Айчыне, а таксама хрысціянскай (пераважна каталіцкай) рэлігійнасці. Гэтыя тыпажы мелі вызначаную, хаця і досыць хісткую, храналагічную мяжу, накладаліся адзін на аднаго. На працягу XVII—XVIII стст. адной з асноўных рыс

шляхецкага бытавога тыпу была з'ява, якую мы назавём мілітарызм і якая адпавядала галоўнаму рыцарскаму падмурку шляхецкіх псіхалогіі і жыцця.

### *5.1.2. Мілітарысцкі аспект шляхецкага быту*

Асноўныя рысы шляхецкага быту на беларускіх землях асабліва выразна праявіліся праз свае жыццёва-актыўныя бакі, сярод якіх першараднае месца займаў культ узброенага дзеяння. У гэты перыяд відавочная тэндэнцыя да яго пераходу з абарончай да наступальнай, агрэсіўнай эманацыі, часта ўсёдазволенасці. Судовыя акты тае пары стракацяць справамі аб насіллі, забойствах, абрабаваннях, падпалах і разбурэннях, здзейсненых шляхтай, і часам нагадваюць зводкі з тэатра вайсковых дзеянняў. Частыя ў тую эпоху войны садзейнічалі ўмацаванню культу сілы як нормы ўзаемаадносін увогуле...

Ва ўзброеныя канфлікты ўцягваліся прадстаўнікі практычна ўсіх сацыяльных груп шляхты, прычым ад мужчын не адставалі і жанчыны. Прыкладам такога роду могуць служыць напады Соф'і Васілеўскай са сваімі двума сынамі і сялянамі на вёску Хоціцы Віцебскага ваяводства вялікага пісара Вялікага княства Літоўскага ў 1712 г. Тыя, што напалі, ледзь не да смерці забівалі сялян і панцырных баяраў, не шкадуючы і цяжарных жанчын, разграмілі карчму, ледзь не забілі ўпраўляючага. Умяшанне рэгулярных войскаў, што знаходзіліся паблізу, не астудзіла іх запалу, і хутка адзін з сыноў Васілеўскай са сваёй чэляддзю разграміў яшчэ адну вёску вялікага пісара — Васілёва.

У XVIII ст. у сувязі з узмацненнем эканамічнай магутнасці і палітычнага ўплыву буйной феадальнай знаці якасна змяніўся ўзровень шляхецкіх усобіц. Гэта быў час барацьбы магнацкіх партый, канфедэрацый, радоў, дзе лік удзельнікаў узброеных груповак вёўся на тысячы.

Узмацненне мілітарызму шляхты грунтавалася на росце яе матэрыяльнай баяздольнасці. Найбольшую выразнасць гэтая рыса набыла ў існаванні прыватнаўласніцкіх гарадоў—крэпасцей з іх умацаваннямі: валамі, равамі, крапаснымі мурамі, дазорнымі і баявымі вежамі і інш., а таксама замкамі і ўмацаванымі кляштарамі. Звычайна былі ўмацаваны нават невялікія гарады, якія належалі магнатам, не кажучы ўжо пра буйныя населеныя пункты і замкі, што ператварыліся ў XVII—XVIII стст. у значныя стратэгічныя адзінкі. Сярод найбольш моцных крэпасцей былі падуладныя князям Радзівілам Слуцкая і Нясвіжская, крэпасць Старога Быхава, якой валодалі літоўскі гетман Я. К. Хадкевіч, а потым Сапегі, Мірскі замак, гаспадарамі якога былі Ільінічы, а пасля Радзівілы, замак у Шклове, што знаходзіўся ва ўладаннях графаў Сіняўскіх. Крэпасці былі добра забяспечаны зброяй, — так, у Нясвіжскім замку ў 1753 г. знаходзілася 30 гармат,— што дазваляла ім не без поспеху трымаць абарону супраць рэгулярных войскаў.

Багатая на добра падрыхтаваных, узброеных людзей эпоха давала шмат прыкладаў яўна выражаных мілітарысцкіх бытавых тыпаў. Тыповым параджэннем эпохі мілітарысцкай усёдазволенасці былі асобы братоў Юзэфа і Міхаіла Валодкавічаў, кроўна звязаных з Радзівіламі, і лёс аднаго з іх — дэпутата Мінскага ваяводства, падскарбія трыбунальскага — Міхаіла. З аднаго боку, браты з'яўляюцца носьбітамі грубага стыхійна-індывідуалістычнага пачатку: абодва яны былі вядомыя сваім нястрыманым норавам і бесцырымоннымі ўчынкамі. Так, Юзэф загадаў даць сто адзін удар плёткаю не згоднаму падпарадкавацца дробнаму шляхціцу Яцынічу, а Міхаіл у той дзень, калі выносілі прысуд па справе брата, учыніў узброеную бойку ў Мінскім трыбунальным судзе, параніўшы аднаго з дэпутатаў. З другога боку, Міхаіл, нягледзячы на апеку магутнага Караля Радзівіла, сам стаў ахвярай шляхецкай змовы і быў расстраляны за гэтае не надта цяжкае для таго часу злачынства ў 1760 г. у Мінску згодна з прысудам трыбунала. Гэта справа і пакаранне дэманструюць непрадказальны, барочна-трагічны аспект шляхецкіх вольнасці і індывідуалізму.

Ужыванне сілы было універсальным шляхам вырашэння канфліктаў, у тым ліку і ў сферы палітычнай барацьбы, што дасягнула свайго апагею ў эпоху канфедэрацый. Паказальна, што ўзброеныя сутыкненні складалі тыповую рысу дзейнасці асноўнага заканадаўчага органа дзяржавы — сейма. Чэх Б. Танер у выдадзеным у 1678 г. апісанні «Польска-літоўскага пасольства ў Масковію...» зазначаў: «... пакуль сенатары і вяльможы каралеўства рэжуцца на словах у каралеўскай палацы, у гэты час натоўп узброеных чэлядзінцаў у бліжэйшым двары выхоплівае ў сваю чаргу зброю (асабліва на падпітку). Таму сеймы рэдка заканчваюцца без забойстваў і кровапраліцця. Мілітарызацыя закранула і судова-выканаўчую дзейнасць: пашырыліся наезды — г. зн. саматужныя ўзброеныя выкананні судовых прысудаў, калі шляхціцы нападалі на маёмасць адказчыка, што суправаджалася вынішчэннем матэрыяльных каштоўнасцей, забойствамі.

Заснаваны на прыярытэце сілы як нормы зносін, шляхецкі стыль жыцця культываваў рэлятывізм у адносінах да каштоўнасці чалавечай асобы і пры яе ацэньванні часта высоўваў на першае месца ступень чалавека ў сацыяльнай іерархіі і яго маёмаснае становішча. Паказальна, што гэтая светапоглядная рыса мела падобную ступень праяўлення як у адносінах да іншых сацыяльных груп грамадства, так і ўнутры феадальнага саслоўя, дэманструючы эфемернасць лозунгаў пра яго ўнутраную роўнасць. Тыповай постаццю, якая ўвасабляла іерархічную тыранію і жорсткасць, асабліва ў адносінах да сярэдняй і беднай шляхты, быў літоўскі харунжы, слуцкі і бельскі ардынат І. Ф. Радзівіл. Дастаткова жорстка абыходзіліся і з удзельнікамі ўзброеных хваляванняў. Так было, у прыватнасці, падчас падаўлення Крычаўскага паўстання 1740—1744 гг. і расправы з яго ўдзельнікамі, з выступіўшымі на баку казакоў жыхарамі Пінска, якіх пакарала войска Януша Радзівіла. Разам з тым трэба адзначыць,

што пакаранні, якія ладзіліся афіцыйнымі асобамі на беларускіх землях у дачыненні да іх карэнных жыхароў, мелі, калі можна так сказаць, цывілізаваны характар — шляхце рубілі галаву (гэта рабілася без сведак), астатніх чакала шыбеніца ці, зрэдку, чацвертаванне. Дзікунскія формы смяротнага пакарання, што ўключалі павольную смерць у пакутах ( саджанне на кол, здыманне скуры, гвалтаванні і інш.), ужываліся казакамі, а таксама ў дачыненні да іх — так, традыцыйным пакараннем казакоў было саджанне на кол.

Праявы шляхецкага мілітарызму пашыраліся, нягледзячы на тое, што адказнасць за гвалтоўныя дзеянні была ў тую эпоху дастаткова сур'ёзнай: вінаватых нярэдка прысуджалі да смяротнага пакарання і выплаты значнай грашовай сумы, нягледзячы на месца парушальніка ў сацыяльнай іерархіі. Так, выконваючы абавязкі трыбунальнага суддзі, дэпутат Брэсцкага ваяводства шляхціц Канстанцін Пшэздзецкі быў прысуджаны дэкрэтам ад 1664 г. да выплаты архіепіскапу Г. Календзе 1250 польскіх злотых і смяротнага пакарання за напад на яго дом у Мінску, збіццё і нанясенне пашкоджанняў машталеру і слузе-шляхціцу.

Безумоўна, у дадзены перыяд адбылася пэўная дэструкцыя галоўнага прынцыпу рыцарскага этасу — здабывання славы зброяй у абароне маральнасці — своеасаблівага сінтэзу, як піша італьянскі гісторык Франко Кардзіні, адвагі, мудрасці, фізічнай сілы і справядлівасці. Разам з тым можна сказаць, што пры наяўнасці істотных хібаў асноўны маналіт шляхецкага этасу захоўваўся: шляхта давала грамадству смелых, мужных, адданых ідэі вольнасці людзей, сярод якіх баязлівасць лічылася найвялікшай ганьбай. Шляхціц прафесійна валодаў зброяй (асабліва шабляй), быў бліскучым майстрам індывідуальнага паядынку, шляхецкая конніца, у прыватнасці крылатыя гусары,— мелі славу непераможных.

Выдатныя якасці шляхціца-вайскоўца яскрава праявіліся падчас войнаў 50—60-х гадоў XVII ст. Амаль заўсёды меншай колькасцю ў параўнанні з непрыяцелем, часта без належных боепрыпасаў, харчавання, з пустымі кішэнямі (грошы, як заўсёды, затрымлівалі) харугвы Вялікага княства Літоўскага, значную частку якіх складалі шляхціцы, здолелі ачысціць родную зямлю ад казакоў і маскоўскіх войскаў. Прычым колькасная перавага непрыяцеля была даволі значная: так у 1654 г. на беларускія землі ўварвалася маскоўскае войска і ўкраінскія казакі агульнай колькасцю 90—100 тысяч чалавек, а войска Вялікага княства Літоўскага налічвала 10—12 тыс. чалавек. Безумоўна, што ў перамозе над колькасна значна мацнейшым ворагам вялікую ролю адыгрывала тактыка. Разам з тым неабходна адзначыць высокі маральны дух шляхты, у аснове якога была ідэя вольнасці. Шляхта дала шэраг выдатных ваяроў: Льва Сапегу, Карла Хадкевіча, Януша Радзівіла, Паўла Сапегу, Міхаіла Паца, Тадэвуша Касцюшку і інш. Аднак ужо ў 50-я гады XVII ст. «паспалітыя рушэнні» збіраліся марудна, славуты шляхецкі індывідуалізм ствараў вялікія цяжкасці для згуртавання шляхецкага войска. «Рыцарскія колы», канфедэрацыі раз'ядноўвалі шляхту (адзначым, што літоўскія гетманы

былі менш схільныя апеляваць да «кола»). Дэструктыўны рэзананс для грамадства мела і вайсковае супрацьстаянне магнацкіх родаў (асабліва Радзівілаў і Сапегаў). Акрамя гэтага, у вайсковай справе з канца XVII ст. усё больш значнае месца пачынала займаць пяхота (пераважна наёмная). Усё гэта адмоўна ўплывала на значэнне шляхты як абаронцы бацькаўшчыны, усяго грамадства, а не толькі сваіх уласных груповак і індывідуальных правоў. У выніку шляхта не здолела згуртавацца ў адказны для краіны момант, і фактычна на ёй ляжыць цяжкая адказнасць за заваёўванне і падзел Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. У гэтай сувязі адзначым, што шляхта Вялікага княства Літоўскага (у першую чаргу заходніх і цэнтральных паветаў — Наваградчыны, Меншчыны), яго магнатэрыя (асабліва Радзівілы) праявілі большую актыўнасць, мужнасць, рашучасць у змаганні супраць падзелу краіны, чым шляхта Кароны.

Такім чынам, мілітарысцкі аспект шляхецкага быту быў адным з вызначальных у сістэме шляхецкага этасу, яго падзейнай сферы. Яго вялікая роля вызначалася сацыяльным, палітычным статусам шляхты як адзінага ваеннага саслоўя ў краіне. Гэта абумовіла высокі ўзровень ваеннай падрыхтоўкі шляхціца, яго высокія баявыя якасці. Разам з тым у мілітарысцкім аспекце шляхецкага быту яскрава праявіўся гіпертрафіраваны шляхецкі індывідуалізм як апалогія ўзброенага дзеяння, тэндэнцыя да сілавога вырашэння грамадскіх і асабістых праблем. З цягам часу мілітарысцкі аспект шляхецкага жыцця ўсё болей набываў індывідуальна-гіпертрафіраваны характар, што праявілася ў крызісе шляхецкага войска і перамяшчэнні мілітарысцкага патэнцыялу ў сферу двубояў, наездаў, радавых міжусобіц.

### *5.1.3. Асветніцкія, эпісталярныя плыні быту*

У шляхецкай культуры беларускіх зямель XVII ст. у процівагу дамінуючаму бытавому стэрэатыпу яшчэ захаваліся асобныя праявы быту папярэдняй эпохі Рэнесансу. Дастаткова акрэслена ідэйна і практычна адраджэнскія традыцыі выразіла дзейнасць выхадца з дробнапаместнага дваранскага роду, ураджэнца Брэсцкага павета Казіміра Лышчынскага. У 1666 годзе, на 32 годзе жыцця, пасяліўшыся ў радавым маёнтку, ён заняўся актыўнай гаспадарчай, грамадскай, педагагічнай дзейнасцю, якую спалучаў з працай над трактатам «Аб неіснаванні Бога», ідэі з якога рупліва прапагандаваў сярод акружэння. Шырокі дыяпазон дзейнасці К. Лышчынскага, які нагадваў па ахопе асоб Рэнесансу, яе гуманістычная скіраванасць, свабодны антрапацэнтрычны характар светапогляду з'яўляюцца адметнымі рысамі адраджэнскага чалавека. Суд над Лышчынскім і смяротная кара адлюстравалі сутыкненне двух тыпаў светапогляду і дзейнасці, у якім рэнесансны пацярпеў паражэнне. Разам з тым трэба адзначыць, што сваёй атэістычнай скіраванасцю дзейнасць К. Лышчынскага супярэчыла фундаментальнай светапогляднай эпістэме шляхецкага этасу, дзе шанаванне Бога займала месца побач

з культам служэння радзіме, вольнасцю і роўнасцю. Так што ў дадзеным выпадку мы маем справу з апазіцыйнай традыцыйнаму шляхецкаму светапогляду з'явай.

Прыкладам рэнесансных бытавых тыпаў з'яўляецца таксама дзейнасць выдаўцоў і пісьменнікаў Яна Карцана і Пятра Бластуса Кміты, шмат зрабіўшых для прапаганды твораў антычных аўтараў. Спецыфічнаму характару беларускага Рэнесансу адпавядала і дзейнасць пратэстанцкіх тэолагаў (актыўная да 1662 г). Пратэстанцкая плыня мела на беларускіх землях шэраг выдатных прыхільнікаў-шляхціцаў — ад Васіля Цяпінскага да Льва Сапегі. Іх дзейнасць мела істотнае значэнне для метакультурнай, гісторыка-тыпалагічнай ідэнтыфікацыі беларускага Рэнесансу як Адраджэння паўночнага тыпу — таго, дзе значная роля належала канфесіянальнаму, пратэстанцкаму фактару.

Бытавая плыня, блізкая сваім рацыяналізмам да культуры Рэнесансу, існавала на нашых землях у другой палове XVIII — пачатку XIX ст.— гэта культура Асветніцтва. Для эпохі Асветніцтва, што пачалася на беларускіх землях прыкладна з 50-х гадоў XVIII ст., характэрны якасна новы бытавы тып, галоўнымі рысамі якога былі пераўтваральная накіраванасць, рацыяналізм, скіраванасць да асветы шырокіх слаёў народа. Усе гэтыя прынцыпы бінарныя індывідуалістычнаму, стыхійна дэструктыўнаму пачатку барочнай шляхецкай філасофіі жыцця. Ідэалогія Асветніцтва насіла выразны дэмакратычны характар, што з асаблівай дакладнасцю адмяжоўвала яе ад традыцыйных сацыяльна-цэнтрычных светапоглядных канцэпцый шляхты. Увогуле апошняя чвэрць XVIII ст. праходзіла пад знакам актыўнага інтэлектуальнага, культурнага пад'ёму і ажыўлення практычна ўсіх бакоў жыцця нашага краю. Трэба адзначыць, што праявы беларускага Асветніцтва, яго спецыфіка ў значнай ступені звязаны з дзейнасцю шляхты. Інспіраваныя шляхтай наватарскія грамадска-палітычныя, эканамічныя акцыі — такія, як дзейнасць Камісіі народнай адукацыі («Эдукацыйнай камісіі»), гродзенскі прамысловы, адукацыйны праект А.Тызенгаўза, крытыка прыгонніцтва і захады па яго скасаванні (І. Храптовіч і інш.), прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1793 г.,— мелі па сутнасці асветніцкі характар. Увогуле спецыфіка гуманізму, у першую чаргу асветніцкага, была звязана ў Рэчы Паспалітай перш-наперш з тым, што ён быў звязаны са шляхецкім асяроддзем.

У сувязі з гаспадарчымі і грамадскімі зрухамі на беларускіх землях у 70—80 гг. XVIII ст., а таксама ў Рэчы Паспалітай у цэлым, знайшло шырокі водгук вучэнне фізіякратаў, падобнага якому не было нідзе ў Еўропе, у тым ліку на радзіме — у Францыі. Гэтая ідэйная плынь уяўляла сабой своеасаблівую філасофію грамадства, заснаваную на перадавых канцэпцыях заходнееўрапейскай навукі і рацыяналістычнай філасофіі, і распаўсюджвалася на Беларусі праз адукаваных магнатаў, асобных прадстаўнікоў заможнай шляхты.

Прыкладам эпахальна новых бытавых тыпаў з'яўляецца дзейнасць феадалаў І. Л. Храптовіча і А. Тызенгаўза. Ураджэнец Наваградчыны,

І. Л. Храптовіч — арганізатар «Эдукацыйнай камісіі», шмат зрабіў для яе паспяховай працы, з 1793 г. займаў пасаду канцлера Вялікага княства Літоўскага, правёў у маёнтках на сваёй радзіме — Шчорсах і Вішнёва — аграрную рэформу, якая рэалізавала прагрэсіўныя формы вядзення феадальнага памешчыцкага тыпу гаспадаркі ў новых эканамічных умовах. Адным з асноўных ідэйных прынцыпаў Храптовіча, выказаных ім у творах, з'яўляецца асветніцкі гуманізм, а яго дзейнасць ацэньвалася ў тую эпоху з пункту гледжання гуманістычнай накіраванасці.

Гарадзенскі стараста граф А. Тызенгаўз заснаваў у 70—80-я гады ў каралеўскіх эканоміях шэраг мануфактур, большая частка якіх знаходзілася ў прадмесці Гародні. Разнастайная эканамічная дзейнасць Тызенгаўза, будаўніцтва культурных устаноў, правядзенне грамадскіх акцый былі вынікам яго думак пра неабходнасць асветніцтва, а таксама пратэсту супраць павелічэння раскошы на адным грамадскім ускраі і збяднення на другім. Культ розуму, арыентацыя на гарманічна развітага чалавека нараджалі ў эпоху Асветніцтва шматбаковых асоб, якія рэалізоўвалі сябе ў разнастайных сферах жыццядзейнасці. Гэты бытавы тып увасабляе дзейнасць М. К. Агінскага — буйнога магната, з 1768 г. вялікага гетмана Вялікага княства Літоўскага, які заснаваў і зрабіў адным з вядучых у той час Слонімскі тэатр, займаўся жывапісам, музыкай, супрацоўнічаў з французскімі энцыклапедыстамі. Асобай аналагічнага плана быў М. Пачобут-Адляніцкі — навуковец, член-карэспандэнт Парыжскай акадэміі навук і Лонданскага астранамічнага таварыства, які выражаў свае погляды не толькі ў навуковых трактатах, але і ў паэтычных одах.

Як вынік эстэтычных запытаў новай эпохі і патрабаванняў палітычнай барацьбы з другой паловы XVIII ст. на беларускіх землях атрымала імклівае развіццё такая рыса ладу жыцця магнатаў, як мецэнацтва. Найбольш яскравае выражэнне яно атрымала ў росквіце магнацкіх тэатраў, чатырох буйнейшых у Рэчы Паспалітай — Беластоцкага, Нясвіжскага, Слонімскага, Гарадзенскага. Буйныя феадалы садзейнічалі таксама развіццю жывапісу, храмавай скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктуры, якая звязана з імёнамі Радзівілаў, Агінскіх, Сапегаў, Тышкевічаў, Тызенгаўза. Яркай прадстаўніцай новага жаночага творча-інтэлектуальнага тыпу была Уршуля Радзівіл, якая пісала і ставіла п'есы ў Нясвіжскім тэатры.

Шырока распаўсюджаным тыпам жыццядзейнасці, звязаным з разумовай працай, у эпоху Асветніцтва стала асоба, якая рацыяналістычна мысліць, выступае з пазіцый «прыроднай» роўнасці ўсіх людзей і актыўна праводзіць свае погляды ў жыццё. Яркім прадстаўніком філасофіі ранніх асветнікаў быў выхадзец з сям'і сярэдняга шляхціца Лідскага павета Казімір Нарбут (1738 — 1807 гг.). Навуковую працу К. Нарбут спалучаў з дзейнасцю на ніве роднай адукацыі і ў цэлым уяўляў перадавы тып шляхціца новай буржуазнай эпохі, зацікаўленага ў памяркоўных палітычных рэформах.

Такім чынам, у часы Асветніцтва шляхта вызначалася як культурнай, практычна-асветніцкай дзейнасцю, так і стварэннем мануфактур, спробамі эканамічных, палітычных рэформ.

У XVII — XVIII стст. акрамя тыповага шляхецкага быту з частымі вайсковымі ўсобіцамі, узброенымі авантурамі, прыгодніцтвам, бясконцым шэрагам забаў, шумнымі магнацкімі балямі з феерверкамі і ілюмінацыяй, на якія збіралася шляхта ледзь не з усяго Вялікага княства Літоўскага, паляваннямі і г. д., існавалі рысы і іншага стылю жыцця феадалаў. Асаблівасць дадзенага бытавога тыпу была звязана з занятасцю шляхціца разумовай працай, а таксама распаўсюджваннем ведаў, што набліжала яго да характэрных жыццёвых стыляў Рэнесансу і Асветніцтва. Разам з тым нярэдка інтэлектуалізм і святочна-разняволенае жыццё спалучаліся ў адной асобе, што адпавядае барочнаму прынцыпу апазіцыйнасці, дысгарманічнасці. Але калі ў эпоху Адраджэння «святочнае» жыццё было неабавязковым дадаткам да інтэлектуалізму дваран, дык у эпоху барока ў Рэчы Паспалітай было хутчэй наадварот. Тым не менш на працягу перыяду, што даследуецца, на нашых землях устойліва існавала тэндэнцыя шляхты да інтэлектуальнай, літаратурнай дзейнасці, эпісталярнага жанру. Працэс рэфлексіі «Я» адбіўся і ў гісторыка-мемуарнай прозе, якая пачала зараджацца ў шляхецкім асяроддзі з другой паловы XVI ст. і набыла форму «дыярыюшаў», успамінаў, якія досыць часта грунтаваліся на радавых дзённіках. Гэта былі творы досыць разнастайныя па змесце: яны маглі спалучаць летапісныя традыцыі, пагадавое выкладанне падзей, часта істотнага гістарычнага ахопу, з аўтабіяграфічнымі фактамі, маглі быць дзённікамі падарожжаў, апавяданнямі пра вядомыя аўтару падзеі, проста будзённымі сістэматычнымі запісамі. А. Мальдзіс, даючы характарыстыку старабеларускай мемуарнай прозе XVII ст., адзначае, што для яе галоўным аб'ектам увагі была падзея, прычым асоба аўтара, яе светаўспрыманне, унутраныя пачуцці паказваліся досыць рэдка. Сапраўды, у мемуарнай літаратуры таго часу мы не сустракаем падрабязнай рэфлексіі пачуццяў, працяглых роздумаў, падрабязных псіхалагічных характарыстык. Разам з тым у гэтых творах прысутнічаюць рысы, звязаныя з развіццём асабістай інтраспекцыі, якія знаходзяцца ў кантэксце культур Рэнесансу і барока. Тэндэнцыя да напісання дзённікаў, мемуараў, што мелася ў XVII ст., пераўтварылася ў наступным стагоддзі ў павальнае захапленне: пісалі ўсе — ад магнатэрыі да дробнай шляхты. У абсалютнай большасці гэта — дзённікавыя нататкі, сярод якіх усё часцей сустракаюцца мемуары, аўтабіяграфіі, дзе прысутнічае пачуццёвасць, рэфлексія, як у запісах М. Матушэвіча, С. Маскевіча, С. Пільштынавай. Ці не ў кожным шляхецкім доме меўся вялікі сшытак, куды запісвалі літаральна ўсё: падзеі палітычнага жыцця, вершы, асабістыя ўражанні,— гэтыя дыярыюшы, як іх першапачаткова называлі, фактычна замянялі газеты.

Некаторыя аматары эпісталярнай плыні выйшлі на прафесійны ўзровень. Найбольш прадуктыўнымі прадстаўнікамі таго ладу быту ў нашым

краі былі выхадцы з дробных і сярэдніх шляхецкіх сем'яў. Так, познебарочны паэт Д. Рудніцкі (1676—1739 гг.) паходзіў з дробнай літоўска-беларускай шляхты, буйны гісторык і правазнаўца М. Догель (1715—1760 гг.) быў родам з дробнашляхецкай сям'і Лідскага павета, бацька народжанага на Міншчыне аўтара чатырохтомных мемуараў шляхціца М. Матушэвіча (1714—1773), наколькі можна меркаваць, таксама не належаў да шляхецкай эліты і г. д. Магчыма, гэта, акрамя агульнаеўрапейскіх уплываў, звязана са зніжэннем інтэнсіўнасці друкарскай працы. Дзейнасць па распаўсюджванні ведаў, эфектыўным сродкам якой было кнігадрукарства, знаходзілася на вельмі нізкім узроўні, бо толькі Слуцкая друкарня Радзівілаў пад кіраўніцтвам К. Клакоцкага ў 70-я гады XVII ст. працавала са значнай нагрузкай і, магчыма, саматужная эпісталярнасць запаўняла ў пэўнай ступені недахоп друкаванай прадукцыі ў краі.

Паказальнікам інтэлектуальнага жыцця было існаванне магнацкіх бібліятэк, сярод якіх вылучалася Радзівілаўская ў Нясвіжы, дзе ў першай палове XVIII ст. знаходзілася мноства кніг па разнастайных галінах ведаў. У 1770 годзе яна налічвала да 20 тысяч тамоў.

Асноўная частка шляхты сістэматычна чытала. Як можна меркаваць па дзённікавых запісах, чыталі кожны дзень, няшмат, удумліва. Досыць папулярным масавым чытаннем былі календары. У калегіуме шляхціца вучылі класічным мовам — лацінскай і грэчаскай, таксама як і галоўнай інтэрнацыянальнай мове таго часу — французскай; ён быў абавязаны ведаць дзяржаўную мову — польскую, а таксама мову сялянства —старабеларускую. Такім чынам, шляхціц быў моўна дасведчаным чалавекам, а ў побытавай сферы — білінгвам.

### *5.1.4. Гістарычныя змены быту*

Шляхецкі лад жыцця па сваёй іманентнай сутнасці адмаўляў змены — ён быў арыентаваны на сярэдневяковыя нормы саслоўна-карпаратыўнай замкнёнасці, ідыялагему непахіснасці, адвечнасці рыцарскага ідэалу і яго асноўных кампанентаў. Разам з тым шляхецкі лад жыцця павольна мяняўся як пад уплывам унутраных дынамічных працэсаў, што вынікалі з яго асноўных канцэптаў, — такіх, як індывідуалізм, так і пад уздзеяннем знешніх фактараў, якія можна падзяліць на культурна-стылявыя ўплывы (барока, ракако, Асветніцтва, французскі, італьянскі ўплывы), а таксама ўздзеянні, звязаныя з новымі эканамічнымі, сацыяльна-палітычнымі рэаліямі.

Як праява агульнага працэсу развіцця барока і гіпербалізацыі адраджэнцкага індывідуалізму з ягонай схільнасцю да стракатасці і дэталізаваных адчуванняў, значнае месца сярод бытавых стыляў шляхты на беларускіх землях сталі займаць прыгодніцтва і авантурызм. Яскрава выявіўся гэты бытавы тып у аўтабіяграфічным рамане прыгод ураджэнкі Наваградчыны С. Пільштынавай ( 1718—пасля 1760 г.), прычым мемуары свядома

прызначаліся аўтаркай да выдання, што сведчыць аб тэндэнцыі да грамадскай «легалізацыі» прыгодніцкага жыцця.

Пачуццёвы характар стылю жыцця праявіўся ў баўленні вольнага часу і, у прыватнасці, у нястрымнай заўзятасці да такіх яго пацешных форм, як балі, паляванні і інш. Характэрныя прыклады баўлення вольнага часу шляхціцамі можна знайсці ў мемуарнай літаратуры таго часу. Так, нататкі мінскага ваяводы Крыстафа Завішы (1666 —1721 гг.) багатыя на згадкі пра «дні бахусавыя», на якіх заставаліся часта да ўсходу сонца і дзе «таньчылі танцы ўтрапёныя і пілі з задавальненнем шалёна». Усе найбольш буйныя святы царкоўнага календара шляхта адзначала банкетамі, танцамі, разнастайнымі пацехамі. Сярод новых для дадзенага перыяду свят, звязаных з каляндарнай абраднасцю, сваёй спецыфікай вылучаюцца «кулігі». Іх адзначала, у асноўным, шляхта сярэдняга дастатку з перадапошняга тыдня запустаў на працягу дзесяці дзён. Падчас куліг некалькі суседзяў з усёй сям'ёй і прыслугай (за выключэннем малых дзяцей і тых, хто глядзіць за імі) ездзілі ад аднаго шляхціца да другога, балюючы там і забіраючы ў сваю чаргу гаспадара з радзінай у другі дом. Кулігі суправаджаліся карнавальнымі пераапрананнямі.

Моднымі сталі грандыёзныя, часта спусташальныя для наладжвальнікаў «з'езды», на якія запрашалася вакольная шляхта (іншы раз запрашалася амаль уся шляхта княства). Нагодай былі самыя розныя падзеі: імяніны, каляндарныя святы, сустрэча знатных людзей. Апафеозам такіх «з'ездаў» была знакамітая сустрэча Каралем Радзівілам у Нясвіжы караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Аб вялікіх зменах быту ў канцы XVIII ст., звязанымі з замежнымі, пераважна французскімі ўплывамі, сведчыў сучаснік Е. Крашэўскі. Згодна з яго назіраннямі, змяніліся літаральна ўсе бакі жыцця: традыцыйны строй замяніўся фракам, камізэлькай, лёгкай тканінай, з'явіўся парфум, ларнеткі, сам стыль жыцця стаў іншым, больш гарэзлівым, — жанчыны кінуліся падарожнічаць, моладзь замест адукацыі і службы праводзіла час на кулігах, рэдутах, асамблеях ці па кавярнях, більярдных, тэатрах, ад чаго, як адзначаў Е. Крашэўскі, у яе здараліся мігрэні, спазмы, іншыя хваробы. Пахіснулася нават святая святых — шляхецкая саслоўная замкнёнасць. Ужо Канстытуцыя 1775 г. дазваляла набываць шляхецтва без грамадскага абвяшчэння, а ў канцы існавання Рэчы Паспалітай шлях да шляхецтва быў адчынены для заможнага і разумнага гараджаніна.

Актыўная пачуццёвая скіраванасць выразна дэманструе адрозненне шляхецкага стылю жыцця ад напоўненых дзейным пазнаннем бытавых тыпаў эпохі Адраджэння і Асветніцтва. Тэндэнцыі пашырэння пачуццёва-асалодавага боку жыцця ў сувязі з распаўсюджваннем замежных уплываў праглядаюцца яшчэ ў «Прамове Мялешкі» XVII ст., дзе аўтар падкрэслена адмоўна ставіцца да знешняй дэструкцыі мясцовага ладу жыцця. Нарастанне імкнення да раскошы, пачуццёвай дробязнасці бытавога жыцця звязана з дэвальвацыяй этыкі традыцыйнага, старажытнага сарматызму, ідэалам якога быў мужны, непераборлівы ў бытавых

адносінах, просты і шчыры, адданы ідэям рыцарства, Айчыны ваяр-шляхціц. Дэструкцыя гэтага ідэалу зрабілася відавочнай недзе з другой чвэрці XVIII ст., была выкліканая ў асноўным еўрапейскімі — французскім і італьянскім уплывамі і досыць дынамічна прагрэсіравала.

Сугучнай культуры барока была актыўная тэатралізацыя падзейнай грамадска-побытавай культуры, узнікненне разнатыпных паратэатральных дзеянняў. З другой паловы XVIII ст. у грамадскі быт шырока ўвайшла музыка, якая суправаджала наладжаныя па французскім узоры з другой паловы XVIII ст. балы. Як і ў Еўропе, XVIII ст. у Беларусі зрабілася стагоддзем музыкі — часам, калі гэты від мастацтва заняў пачэснае месца побач з жывапісам, архітэктурай, скульптурай. У гэты перыяд кожны магнат лічыў ледзь не абавязковым трымаць інструментальную ці вакальна-інструментальную капэлу. Капэлы старабеларускіх магнатаў не саступалі еўрапейскім — аркестры М. К. Агінскага, А. Тызенгаўза лічыліся аднымі з лепшых ва Усходняй Еўропе. Шляхціцы музыцыравалі, стваралі музыку самі, яна суправаджала іх у быце — гучала на імянінах, хаўтурах, балях, абедах, сесіях трыбуналаў.

Яшчэ адной папулярнай і агульнапрынятай пацехай было паляванне. Каралі і буйнейшыя магнаты ў XVII ст. палявалі з ручніцамі (парахавымі ружжамі) увесну, з сокаламі ўлетку, з іншымі каштоўнымі птушкамі ў астатнія поры года. Супраць звера ўжываліся пікі, сеткі, гроты. Параўнальна ў невялікай колькасці трымаліся ганчакі. У XVIII ст. прылады палявання засталіся ў асноўным тыя ж, аднак сакалінае паляванне было ўжо рэдкай справай, а ганчакі зрабіліся галоўнай дапамогай паляўнічых. Прыблізна з другой паловы XVIII ст. магнацкае паляванне, дзе дагэтуль вытрымліваўся высакародны прынцып адкрытага суперніцтва са зверам у сіле і спрытнасці, усё больш ператваралася ў загадзя падрыхтаваную і бяспечную для ўдзельнікаў разню жывёл, што было адной з праяў самаадмаўлення прынцыпаў рыцарскай культуры.

Сярэдняя і дробная шляхта прытрымлівалася, зразумела, значна больш сціплага ладу жыцця, аднак па агульнай скіраванасці ён супадаў з вышэйапісаным. Акрамя гэтага, дробныя шляхціцы нярэдка прысутнічалі на магнацкіх трапезах і паляваннях, і галоўнае — яны імкнуліся стылёва пераймаць, капіраваць стыль жыцця магнатэрыі. «Святочны» шляхецкі стыль жыцця спалучаўся з дэструкцыяй такога важнага прынцыпу рыцарскай культуры, як педантычныя адносіны да грашовых пытанняў. Патрэба ў раскошным жыцці, замешанае на славалюбстве жаданне не адстаць, раўняцца на магнатаў у размаху і бляску, што склалася ў своеасаблівы комплекс прэстыжнасці, патрабавалі значных грашовых сродкаў, якімі шляхціца часта не мог забяспечыць яго маёнтак. Прыходзілася здаваць яго ў арэнду, закладваць, браць бясконцыя пазыкі. Найвялікшай інтэнсіўнасці працэс збяднення сярэдняй шляхты дасягнуў у XVIII ст., калі рэзка павялічылася маёмасная дыферэнцыяцыя феадальнага саслоўя. Судовыя акты тае пары зафіксавалі мноства спраў пра няўплату пазык, за што прызначалася пакаранне ў выглядзе значнай грашовай

пені, выгнання, перадачы маёнткаў даўжнікоў у часовае карыстанне крэдытору, а таксама «сядзенні» (здаралася і на ланцугу) пры двары ці ў замку, прычым зняволенне часам працягвалася дастаткова доўга. Напрыклад, за няплату Кіеўскаму мітрапаліту Антонію Сяляве пазыкі ў 200000 польскіх злотых надворнага падскрабія Вялікага княства Літоўскага, старасту Рэчацкага Багуслава Юрыя Служку прысудзілі ў 1649 г. да выплаты значнай грашовай пені і да 12 тыдняў «сядзення» ў Мінскім замку. Разам з тым адзначым, што матэрыяльнае марнатраўства было ў большай ступені ўласцівае шляхціцам Кароны.

Памяркоўны, хаця і строга іерархічны, характар правіл грамадска-бытавых паводзін у XVII—XVIII стст. у сувязі з нарастаннем працэсу сацыяльна-эканамічнай залежнасці сярэдняй і дробнай шляхты ад буйных феадалаў набыў рысы зневажальнага пакланення. Знакі выражэння ўдзячнасці сталі больш шматлікімі і «нязмушанымі»: патронаў цалавалі не толькі ў руку, але і ў ступні, жывот, падалі плазам ім у ногі, кланяліся ім глыбокімі паклонамі, мялі шапкамі па зямлі, «шарачковы» шляхціц звычайна цалаваў далонь магната, што яшчэ ў XVI ст. здавалася немагчымым, і г. д.

Нормы палітыка-публічнага жыцця дасягнулі найвялікшай ступені свайго ўзаконенага скажэння ў дзейнасці сеймікаў і сеймаў. Разгул у XVIII ст. шляхецкай анархіі, празмернае ўладалюбства магнатаў зрабілі магчымым існаванне ў якасці абавязковых і непазбежных атрыбутаў працы гэтых органаў дзяржаўнай улады рэгулярныя застоллі са шчодрымі гасцяваннямі для патрэбных магнатам людзей, а таксама ўзброеныя сутычкі паміж варожымі групоўкамі. Як норма паводзін падчас праслухоўвання выступленняў успрымаліся ўжыванне спіртных напояў, перакусванне, бесперапынныя размовы, кіданне з галёркі ў непапулярных аўтараў яблыкамі і грушамі, звычайнай справай стала зрываць і самі сеймы, чаму спрыяла права Liberum veto.

Гіпербалізаваная экспрэсіўнасць, у аснове якой ляжаў шляхецкі стыхійны індывідуалізм, была адлюстравана і на канфесіянальнай сферы быту, закрануўшы такі дакладна рэгламентаваны яе бок, як рэлігійны рытуал. У XVII—XVIII стст. храм у Рэчы Паспалітай, як і ва ўсёй Еўропе, паступова ператварыўся ў тэатр, які шчодра быў насычаны барочнымі эфектамі і ў эмацыянальных дзеях якога актыўна бралі ўдзел як святары, так і прыхаджане. Нормы паводзін рэлігійнай культуры позняга Сярэднявечча, якія адрозніваліся глыбокай набожнасцю і добрасумленным выкананнем прадпісаных правіл, змяніліся афектаванай тэатральнасцю і нястрыманай экспансіўнасцю прысутных, што найбольш яскрава выяўлялася ў контррэфарматарскай каталічнай літургіі. Падчас імшы, як апісваў у XVIII ст. Феафан Пракаповіч, людзі ўсплёсквалі рукамі, скакалі, лілі слёзы, смяяліся.

Другім відам экзальтацыі паводзін быў рэлігійны фанатызм, праявы якога суправаджаліся самакатаваннямі. Яскравы прыклад аднаго з іх, удзельнікамі якога былі найбольш знакамітыя людзі Берасцейскага ваяводства і што

адбылося ў Берасцейскім касцёле, згадвае пісьменнік Ю. Нямцэвіч. Увогуле, самабічаванне да крыві, публічная прэзентацыя самапакутніцтва зрабілася ў часы позняга барока правілам добрага тону.

Разам з тым шляхта не заўсёды была носьбітам гіпертрафіраванай рэлігійнай апантанасці — больш таго, у першай палове XVII ст. менавіта пратэстанцкая шляхта — Крыштаф II Радзівіл, Багуслаў Радзівіл і інш.— спрыяла ўсталяванню талерантнасці ў Вялікім княстве Літоўскім. Як лічыць вядомы польскі навуковец Я. Тазбір, дзякуючы дзейнасці пратэстантаў, у першую чаргу з роду Радзівілаў, у княстве, у адрозненне ад Кароны, у гэты перыяд рэлігійная сітуацыя вызначалася талерантнасцю, якая мела тут сваю спецыфіку, што ўзыходзіла да папярэдніх эпох.

У кантэксце ўласцівага еўрапейскай культуры другой паловы XVIII ст. і яе сентыменталісцкім плыням імкнення да ўсяго натуральнага, прыроды, моцным каталізатарам чаго была канцэпцыя «прыроднага чалавека» Ж. Ж. Русо, былі гульні ў вясковасць ліцвінскай шляхты. Найбольш яскрава яны праявіліся ў размешчаным каля Нясвіжа паркава-палацавым комплексе Альба. Там мясцовыя шляхціцы і шляхцянкі мелі свае сялянскія домікі, вакол якіх займаліся агародніцтвам і садаводствам, апранутыя ў сялянскую вопратку, спявалі традыцыйныя песні; прычым традыцыйная архітэктура была прадстаўленая і іншаземнымі — фінскімі, нямецкімі і інш. хатамі. Захапленне традыцыйнай культурай праявілася і ў жаночай шляхецкай модзе, дзе досыць экзатычна спалучалася з модай на антычнае адзенне і звычаем фларыстычнага аздаблення вялікіх ракайльных прычосак.

У канцы нельга не спыніцца на актуальнай праблеме спецыфікі старабеларускага (ліцвінскага) быту ў дачыненні да быту шляхты Кароны. Гэтае пытанне досыць складанае, таму што, як адзначалася, у шляхты Рэчы Паспалітай саслоўнае дамінавала над палітычным і этнічным. Разам з тым адрозненні, безумоўна, існавалі — прычым на ўзроўні свядомасці, што праяўлялася ў палітоніме з моцным элементам этнакультурнага сэнсу — ліцвін, які вызначаў культурную канцэпцыю ліцвінскасці як усведамлення сваёй этна-культурнай адметнасці. На ўзроўні бытавых элементаў спецыфіка праяўлялася досыць шырока: гэта і спосаб ліцвінаў насіць шаблю, адсутнасць на пахаванні коннікаў з вынутымі шаблямі, магчымая адсутнасць у ежы славутага польскага бігаса і інш. На больш высокім таксанамічным узроўні гэта — большая ступень талерантнасці, дэмакратызму ў бытавых зносінах. Так, у XVII ст. на агульных застоллях разам сядзелі каталікі з кальвінісцкай магнатэрыяй; знакамітыя Радзівілы не надта звярталі ўвагу на радавітасць іншых. Бытавы дэмакратызм, а таксама стрыманасць традыцыйна вылучалі ліцвінскую шляхту.

## 5.2. Грамадскі быт сялян

У пачатку дадзенага перыяду беларускае сялянства ў сваёй асноўнай колькасці было прыгонным і падзялялася на тых, у павіннасцях каго пераважала паншчына ці грашовы чынш. На версе саслоўнай іерархіі знаходзіліся баяры і зямяне, гаспадаркі якіх мала чым адрозніваліся ад сялянскіх, але прававое становішча было іншым — па ступені асабістай свабоды, падатках (у асноўным чыншу) яны набліжаліся да дробнай шляхты. Ніжэй звычайнага селяніна знаходзіліся сябры ці здольнікі — тыя, што ў звязцы з гаспадаром вялі сумесную гаспадарчую працу. У сацыяльным нізе былі кутнікі (за выключэннем тых, хто жыве ў хаце на панскай зямлі), каморнікі — тыя, што не мелі ўласнай хаты і жылі ў гаспадара, а таксама парабкі, чаляднікі — тыя, што працуюць выключна на сялян. Асноўным грамадскім інстытутам, які інтэграваў, кантраляваў, кансерваваў жыццё вяскоўцаў, была абшчына (грамада). Дэвальвацыя яе эканамічнай функцыі склала адзін з сістэмаўтваральных стрыжняў дынамікі сялянскага быту XVI—XVIII стст. Дэструкцыя эканамічнай функцыі абшчыны (грамады) была звязана з правядзеннем валочнай памеры 1557 г. Пасля ажыццяўлення валочнай рэформы грамада распараджалася толькі зямлёй агульнага карыстання — сенажацямі і выганамі, прычым сенажаці таксама маглі знаходзіцца ў падворным карыстанні. У XVIII ст. абшчына ў Беларусі толькі ў некаторых мясцінах мела пазямельныя функцыі (гэта тычылася ў асноўным не ўсёй сялянскай пахаты, а толькі невялікай яе часткі) і іграла пераважна падатковую, адміністрацыйную, інтэграцыйна-ахоўную ролю. Разам з тым грамада не страціла цалкам свайго гаспадарча-эканамічнага значэння. Так, «вся громада» вёскі Лукі Берасцейскага ваяводства, «ручаясь друг за друга» (г. зн. кругавой парукай), вырашыла перадаць надзел з царквой, атрыманы пры абмене зямель, у царкоўнае карыстанне (1717 г.). Асноўная падатная адзінка пасляррэформеннага часу —дым, двор, які валодаў у сярэднім ад адной чвэрці да паловы валокі (адна валока — 21,36 га зямлі). Аднак, асабліва на ўсходзе, дзе валочная памера не была ажыццёўлена цалкам, сяляне вялі гаспадарку службамі, якія складаліся з некалькіх двароў, там жа было распаўсюджана здольніцтва і сябрынства, што спрыяла кансервацыі традыцыйных форм гаспадаркі і быту.

### *5.2.1. Характэрныя рысы грамадскага быту*

Стыль паводзін сялян вызначаўся традыцыйнымі стэрэатыпамі абшчыны, сацыянарматыўная функцыя якой у азначаны перыяд была вельмі істотнай. У сямейных бытавых паводзінах селянін выяўляў сябе як сацыялагізаваную асобу, чые адносіны з абшчынай вызначаліся прынцыпам арганічнага канфармізму. Досыць істотна гэты прынцып праяўляўся пры разглядзе спорных спраў, які праводзіўся па нормах пісанага і, што мае асабістае значэнне для вывучэння характару існавання традыцыі, звычаёвага права. Адной з такіх форм архаічнага грамад-

скага быту быў удзел у копным судзе. Гэта старажытная форма саматужнага вясковага суда існавала да пачатку XVIII ст. на Палессі. Копны суд, капа (у XVII ст. ён мог называцца грамадой) — суд сельскай, досыць рэдка — гарадской, абшчыны дзейнічаў на аснове звычаёвага права. Часта ён быў абмежаваны пэўнаю адміністрацыйнаю адзінкаю. Пад яго юрысдыкцыю траплялі сяляне, зрэдку гараджане, таксама баяры, зямяне, дробныя шляхціцы. У ім удзельнічалі выбраныя паважаныя сяляне, часам баяры, гараджане, прадстаўнікі адміністрацыі — копныя мужы. У судзе звычайна прымаў удзел прадстаўнік вышэйшага суда, які назіраў за ходам працэсу. Суд разглядаў часцей за ўсё справы аб крадзяжах, патравах, забойствах, ён мог вынесці і смяротны прысуд. Сярод відаў суда можна вызначыць гарачую капу, калі злачынцу судзілі па свежых слядах, завітую — канчатковую. Копны суд звычайна збіраўся на вызначаным месцы : «...месяца сакавіка 9 дня сабралі на капу тых жа мужоў з сёл ваколічных...там, дзе здаўна капу збіралі...на сцяне паміж зямель яго каралеўскай міласці вёскі Каменья і іншай Каменья, вёскі шляхецкай» (Берасцейшчына, 1664 г.). Можна вылучыць таксама «вялікую капу», якая вызначалася істотнай прадстаўнічасцю. Так, вялікая «сабралася капа на 2 мілі ў акружнасці» (Берасцейшчына, 1665г.). На капу для разгляду асабліва важных спраў магло збірацца досыць прадстаўнічае кола. Так, з нагоды падпальвання гумна ў шляхецкім маёнтку ў Пінскім павеце на капу, што адбывалася ў царкве, сабраліся людзі з 17 населеных пунктаў (1664 г.).

Галоўнымі цэнтрамі грамадскай камунікацыі былі карчма і царква. Разам з тым гэтыя ўстановы размяшчаліся пераважна ў сёлах ці мястэчках. У якасці ўніверсальнага шматфункцыянальнага цэнтра грамадскіх камунікацый можна вылучыць карчму — месца правядзення вольнага часу, адзначэння рэлігійных, сямейных свят, гэта быў своеасаблівы цэнтр лучнасці сямейнага і грамадскага. Таксама ў карчме праходзілі дзелавыя сходы, заключаліся здзелкі. Гэтыя два цэнтры камунікацыі — царква і карчма — меліся таксама ў горадзе і мястэчку, але там існаваў яшчэ адзін істотны цэнтр грамадскіх камунікацый, якога была пазбаўлена вёска, — плошча.

Адрозненні сацыяльна-эканамічных характарыстык рэгіёнаў беларускіх зямель, іх гісторыка-культурная, канфесіянальная своеасаблівасць абумовілі існаванне рэгіянальных адметнасцей беларускай сялянскай сям'і даследуемага перыяду.

Трэба адзначыць, што адсутнасць ва Усходняй Беларусі развітой фальваркова-паншчыннай сістэмы стымулявала рынкавую скіраванасць сялянскай гаспадаркі гэтага рэгіёну, што надавала ладу жыцця сялян, а значыць, і іх сямейнаму ўкладу адносную мабільнасць, схільнасць да абмену культурнай інфармацыяй. Разам з тым кансервацыя старажытных форм землекарыстання, пры якіх грамада, абшчына працягвала выконваць эканамічную функцыю, лагічна павінна была стрымліваць працэс сепарацыі асобных сем'яў, індывідуалізацыі іх быту.

Рэгіянальнай спецыфікай, заснаванай як на прыродных, так і на этнакультурных асаблівасцях, вылучалася ў гэты час і вясковае жыццё Палесся. Яго аснову складаў замкнёны, унутры-лакальна і рэгіянальна адасоблены лад жыцця, у сістэме якога кансерваваліся рысы палескага этнаграфічнага рэгіёну, што паступова набывалі элементы субэтнасу. На геаграфічных картах, дакументах XVI—XVIII стст. Палессе дастаткова часта фіксуецца ў сваіх цяперашніх межах, прычым падзяляецца на заходняе і ўсходняе, што адпавядае яго сучаснаму рэгіянальна-этнаграфічнаму падзелу. Можна меркаваць, што менавіта ў дадзены перыяд склалася на ўзроўні лакальна-этнаграфічнай ці, магчыма, субэтнічнай самасвядомасці ўяўленне палешукоў аб уласнай своеасаблівасці, якая адрознівала культуру Палесся ў наступную гістарычную эпоху.

Рэгіянальная своеасаблівасць беларускай сялянскай сям'і ў даследуемы перыяд у немалой ступені была абумоўлена і такім фактарам, як войны. За перыяд вайсковых дзеянняў з 1648 па 1667 гг. найвялікшыя людскія страты ў Вялікім княстве Літоўскім назіраліся ў Віцебскім, Мсціслаўскім, Полацкім, Менскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Аршанскім ваяводствах — 60—70% насельніцтва. Як можна заўважыць, тэрыторыі гэтых ваяводстваў ахоплівалі, у асноўным, усходнюю палову беларускіх зямель, што не магло не адбіцца на маёмасным становішчы, полаўзроставай структуры сялянскіх сем'яў гэтага рэгіёну. Фактычна асновы сялянскай жыццядзейнасці, у тым ліку і бытавой, гэтых рэгіёнаў былі зруйнаваныя.

На звычаі і абрады сялянства аказала ўплыў і канфесіянальная сітуацыя ў Беларусі. У другой палове XVII — XVIII ст. найвялікшая колькасць каталіцкіх і уніяцкіх прыходаў знаходзілася ў цэнтральных і заходніх раёнах беларускіх зямель. Як сведчаць даныя першай паловы XIX ст., сямейная абраднасць сялян праваслаўнага веравызнання адрознівалася ад абраднасці каталікоў і уніятаў. Можна меркаваць, што менавіта з дадзенага перыяду пачалася істотная дыферэнцыяцыя беларускіх зямель на ўсходнія і заходнія вобласці па канфесіянальнай прыкмеце, за якой стаяць больш глыбокія ментальныя, этнакультурныя працэсы.

Адрознівалася і вонкавае аблічча вяскоўцаў розных рэгіёнаў — так, зыходзячы з фрагментарных апісанняў канца XVIII ст. (нататкі Ф. Шульца, І. Мюнца), жыхары Піншчыны, Гарадзеншчыны былі моцнага целаскладу, высокія, шыракаплечыя, здатныя на працу, барадатыя, у той час як насельніцтва паўночнага ўсходу (жыхары Крычаўскага графства) характарызавалася А. Мейерам як людзі сярэдняга росту і «сильного вида тела», але слабыя сілай. Характэрна, што гэтыя адрозненні маюць аналагі ў антрапалагічным матэрыяле XVIII—XIX стст. У дадзеным выпадку ізноў назіраецца дыхатамія ўсход/захад, на гэты раз у вонкавым абліччы, нават тым, што мы называем модай — у прыватнасці, звычаі насіць бараду ў жыхароў заходніх абласцей. Характэрна, што жыхары Старажытнай Беларусі адрозніваліся па знешнім абліччы не толькі па рэгіянальных, але і па этнічных прыкметах. Так, А. Мейер адрознівае па вонкавым

выглядзе латышоў, што кампактна жылі ў Крычаўскім графстве, ад беларусаў.

Перыяд, што даследуецца, вызначаўся эпахальнымі зменамі ў этнічнай самасвядомасці старажытных беларусаў, актыўнымі этнанімічнымі, анамастычнымі працэсамі наогул. У гэты час распаўсюдзіліся, усталяваліся асноўныя найменні — этнанімы, субэтнічныя найменні, палітонімы, урбанонімы, лакальна-этнаграфічныя азначэнні, што атрымалі працяг у наступную гістарычную эпоху. Палітонім «ліцвіны» (літва, літоўскія людзі) паступова пазбаўляўся сваёй палітычнай афарбоўкі як азначэнне жыхароў Вялікага княства Літоўскага і набываў для беларусаў этнанімічны змест у якасці эндаэтнаніма і экзаэтнаніма. Гэтаму спрыялі працэсы этнанімічнага самавызначэння іншых народаў, што жылі ў княстве і Рэчы Паспалітай. Этнічныя літоўцы пачалі называцца ў асноўным жмуддзю, жмудзінамі, жамойтамі ( ліцвінамі называліся толькі жыхары ўсходнелітоўскіх зямель — Аўкштайцыі), украінскія казакі, з якімі як прадстаўнікамі украінскага этнасу мелі актыўныя кантакты старажытныя беларусы, зваліся чаркесамі, досыць рана вызначылася этнічнае найменне латышоў. Такім чынам, аб'ектыўна найменне ліцвін пачало лакалізавацца на беларускіх землях княства і выкарыстоўвацца ў якасці назвы з боку і саманазвы прадстаўнікоў разнастайных сацыяльных слаёў беларускага этнасу.

Яшчэ адна істотная з'ява — шырокае распаўсюджванне з пачатку XVII ст. назвы «беларусец» (пазней — беларус) для вызначэння старабеларускіх гараджан, шляхты, сялян. Так зваліся і называлі сябе жыхары ў асноўным усходніх і паўночна-ўсходніх беларускіх зямель — рэгіёну, за якім у XVII ст. замацавалася назва Белая Русь. Зыходзячы з лакальнага распаўсюджвання гэтай назвы, яе можна кваліфікаваць як рэгіянальна-этнаграфічнае азначэнне, этнакультурны тапонім з высокай ступенню этнакультурнай насычанасці — г. зн. з канцэнтраваным культурным, канфесіянальным, ментальным зместам. Для дадзенай эпохі была ўласціва адсутнасць вызначаных, акрэсленых этнічных найменняў у сучасным сэнсе. Тады панаваў этнакультурна, канфесіянальна, дзяржаўна, тапанімістычна, урбаністычна абумоўлены этнанімічны палімарфізм. Таму і вяскоўцы досыць часта называлі сябе некалькімі назвамі адначасова. Так, распаўсюджанымі азначэннямі той пары былі ліцвін беларусец, ліцвін, беларусец, было нават «ліцвін латыш беларусец». Для сялянства было ўласцівае адносна частае спалучэнне назваў ліцвін і беларусец,— больш таго, менавіта сяляне складаюць асноўны кантынгент тых, каго называлі беларусцамі, што падкрэсліваецца спалучэннем у назве сацыяльнай прыналежнасці і этнанімічнага азначэння: «пашенные мужики беларусцы».

Можна казаць і пра рэгіянальныя адрозненні ў этнічнай самасвядомасці жыхароў розных абласцей беларускіх зямель. Як ужо адзначалася, для ўсходніх і паўночна-ўсходніх рэгіёнаў было ўласціва ў XVII ст. шырокае ўжыванне азначэнняў «беларусы», «беларусцы» для самаідэн-

тыфікацыі шырокіх колаў насельніцтва, у тым ліку і вяскоўцаў. Жыхары цэнтральных і заходніх рэгіёнаў, — тых, дзе размяшчалася Старажытная Літва, часцей называліся ліцвінамі. Вельмі рэдка для жыхароў Панямоння і Гародзеншчыны ўжывалася найменне «чарнарусы». І, як можна меркаваць па фрагментарных матэрыялах, у дадзены перыяд ужо існавала саманазва палешукоў. Гэтыя рэгіянальныя асаблівасці звязаны з рэгіянальным падзелам старабеларускіх зямель на Белую Русь, Палессе, Чорную Русь, а таксама Літву (гістарычную, якая лакалізавалася ў цэнтральнай і заходняй Беларусі).

У цэлым для сялянскага быту быў характэрны дастаткова высокі ўзровень лакальна-этнаграфічнай варыянтнасці, што было ўласціва ўсёй традыцыйна-бытавой культуры беларускага этнасу эпохі феадалізму.

### *5.2.2. Абрадавыя формы грамадскага быту*

Падзеямі грамадскага жыцця рабіліся этапныя сямейныя падзеі, звязаныя з адпаведнымі абрадамі, сярод якіх галоўныя — радзіны, вяселле і пахаванне. Адметны грамадскі характар мелі абрады шанавання продкаў — дзяды, а таксама памінанне нябожчыкаў— адны з самых шаноўных абрадавых падзей на Беларусі. Як можна меркаваць па тагачасных вопісах, яны былі насычаныя архаічнымі элементамі. Так, у сялян Палявога і Мілаславіцкага войтаўстваў Крычаўскага графства (апісанне 1786 г.) «от славян занятое воспоминовение своих мёртвых» уключала звычай ставіць «чрез целой год» на стол за абедам і вячэрай лішні прыбор і прымацца за ежу «по громогласном» запрашэнні нядаўна памерлага сваяка да стала. Названыя элементы, у асаблівасці запрашэнне памерлага да трапезы, з’яўляюцца тыповымі для традыцыйнай пахавальнай, памінальнай абраднасці беларусаў. Акрамя гэтага, у традыцыйна-бытавой духоўнай культуры беларусаў мелі месца асаблівыя па сацыяльнай значнасці і адметнасці дні, звязаныя з культам памерлых продкаў. Спецыяльныя памінкі па бацьках — бацьку ці маці — бывалі ў беларускіх сялян вельмі рэдка і, у асноўным, у заможных гаспадароў. Традыцыйнымі былі памінанні продкаў, якія мелі пастаянныя тэрміны (у залежнасці ад мясцовасці яны маглі некалькі змяняцца), адбываліся чатыры разы ў год і зваліся «дзяды». Гэты абрад уключаў комплекс культавых дзеянняў, цэнтрам якіх была рытуальная трапеза; яны праводзіліся без прысутнасці чужых людзей у хаце ці на могілках.

Звычаі, звязаныя з «дзядамі», у прыватнасці з такім характэрным элементам гэтага рытуалу, як наведванне месц пахаванняў, меліся ў сялян Крычаўскага графства. Паводле апісання канца XVIII ст., «...на первой неделе после святой седмицы» сяляне кожнай вёскі асобна збіраліся на свае могілкі і «разные на оных делая тризны», абкатвалі вакол магіл сваякоў пафарбаваныя ў розныя колеры (асабліва ў жоўты) курыныя яйкі, якія потым раздавалі жабракам. Перыяд правядзення абраду трызны

на могілках, прысутнасць пафарбаваных яек, звычай раздаваць рэшткі трапезы жабракам сведчаць аб тым, што перад намі — радаўніца ці радаўніцкія дзяды. Даследчыкамі культуры беларускіх сялян апошняга этапа развіцця феадалізму радаўніца часта ўключалася ў цыкл «дзядоў» (хаця часам і згадвалася асобна). Досыць цікавым у сваёй архаіцы падаецца звычай абкатвання яек вакол магіл. Можна меркаваць, што тут мы маем справу з колам—абярэгам — старажытным язычніцкім забабонам супраць злых сіл. Ролю функцыянальнага абярэга выконвае, акрамя кола, яйка — велікодны сімвал уваскрашэння і вечнага жыцця, з чаго можна зрабіць выснову аб стымуляцыі рытуалам менавіта гэтых інтэнцый. Блізкай па сваіх элементах да «дзядоў» уяўляецца памінальная абраднасць сялян Палявога і Мілаславіцкага войтаўстваў, у прыватнасці «прарадзіцельская субота», падчас якой на могілкі выносілі вялізныя талеркі «испеченнаго разными подобиями, как то: трапециодическими и треугольными видами хлеба». «Бацькоўская субота» — так да гэтага часу завецца ва ўсходніх славян абрад ушанавання памерлых продкаў, аналагічны «дзядам».

Найбольш ранняе з наяўных і дастаткова падрабязнае апісанне беларускай радаўніцы было зроблена М. Чарноўскай на пачатку XIX ст. Паводле апісання радаўніца была найбольш значным памінаннем з чатырох, што праводзіліся на працягу года. У аўторак на паслявелікодны тыдзень паміж 2 і 3 гадзінамі папоўдні сяляне адпраўляліся на могілкі і размяшчаліся вакол прамавугольнай, зробленай з дошак і прысыпанай зверху зямлёй «грабніцы» сваякоў. Там яны выконвалі абрад катання пафарбаваных курыных яек, якія потым аддавалі жабракам, што збіраліся вакол і спявалі набожныя песні. Пасля гэтага рассцілалі на «грабніцы» абрус, выстаўлялі стравы і, адліваючы на магілу гарэлку і мядовую сыту, запрашалі памерлых пакаштаваць, гаворачы: «Святыя радзіцелі! Хадзіце к нам хлеба і солі кушаць, старыя і малыя». Потым самі пачыналі есці. Колькасць страў была няпарнай — звычайна 5,7,9 — і без поліўкі. Абавязковымі з'яўляліся мёд, тварог, бліны (грубыя налісніκі з грэцкай мукі), яйкі, вэнджаныя каўбаса і свініна. Той, хто не мог забяспечыць сябе неабходнай стравай, далучаўся да трапезы больш заможных гаспадароў, якія з ахвотай яго прымалі. Перад адыходам звярталіся да памерлых: «Мае радзіцелі! Выбачайце, не дзівіце! Чым хата багата, тым і рада!» Потым усе накіроўваліся ў карчму, дзе спявалі і таньчылі. У адных месцах гэты абрад выконвалі толькі жанчыны, у іншых — да іх далучаліся і мужчыны. У апісанні гаворыцца, што падобныя «абыходы» рабіліся чатыры разы ў год, што сведчыць пра параўнальна частае правядзенне рытуалу на могілках і паказвае ягоную архаічнасць. М. Чарноўская адзначае, што на месцы пахавання сваяка найбольш блізкі яму чалавек павінен быў пасадзіць дрэва, у выніку чаго над магіламі з цягам часу вырастаў ладны лес.

Дадзены абрад у сваіх асноўных кампанентах адпавядае добра вядомай радуніцкай абраднасці другой паловы XIX — пачатку XX ст. Разам

з тым у ім мы бачым характэрны для беларусаў сінкрэтызм радаўніцы і дзядоў: на трапезу запрашаюцца бацькі, старыя і малыя, што ў большай ступені ўласціва святу дзядоў, дзе шануюцца ўсе продкі. Можна зрабіць выснову, што гэта спалучэнне мае даўнія карані, магчыма прадстаўляла сабой у старажытнасці сінтэтычны памінальны звычай непасрэдна блізкіх сваякоў і продкаў увогуле.

Як бачна з прыведзеных фрагментаў, аснову абрадаў складала язычніцкая светапоглядная сістэма. Хрысціянскі і язычніцкі рытуалы былі нават дыстанцыяваныя тэрытарыяльна: месцам правядзення хрысціянскіх рытуалаў была царква, традыцыйныя абрады выконваліся ў хаце, на могілках. Толькі ў наступную гістарычную эпоху хрысціянскія святары перайшлі мяжу язычніцкай рытуалістыцы — пачалі з'яўляцца на могілках. Разам з тым сяляне звярталі ўвагу на неабходнасць прысутнасці ў сямейнай абраднасці царкоўных рытуалаў,— несвоечасовае, неахайнае іх выкананне выклікала незадаволенасць. Так, скарга сялян вёскі Бясовіцкай Крычаўскага староства на святара мясцовай царквы сведчыць, што ў 1744 г. святар не згадзіўся адпець сялянскага сына Андрэя Вораня з вёскі Горны, бо не атрымаў за гэта добрага каня. У выніку нябожчык ляжаў у хаце тры дні, быў пахаваны без споведзі, і толькі пасля пахавання святар зрабіў на магіле адпяванне, за што ўзяў васьмушку пшаніцы. У скарзе адзначаецца, што святар адмаўляўся служыць малебны, не атрымаўшы ад сялян плату.

Сацыяльнае расслаенне сялянства адбілася на характары засваення рэлігійнай абраднасці: больш заможныя гаспадары мелі магчымасць часцей карыстацца паслугамі святара. Так, як сведчаць матэрыялы пазнейшага часу, заможныя сяляне Віленскай губерніі адзначалі ўгодкі смерці свайго блізкага памінкамі ў царкве і абедам, у той час як больш бедныя хадзілі на могілкі, дзе спявалі і спраўлялі трапезу.

Акрамя вышэйназваных, у тагачасных вопісах прыгадваецца купальскі абрад, які ўтрымліваў рытуалы, звязаныя з агнём, а таксама пусканне вянкоў на ваду, што адпавядае асноўнай семантыцы абраду, звязанага з шанаваннем вады і агню. Адзначаліся і калядкі — з традыцыйным пераапрананнем калядоўшчыкаў у казу, бусла, старога. На Вялікдзень выконваўся адметны для беларускай традыцыйнай духоўнай культуры валачобны абрад, які тыпалагічна нагадваў абходы калядоўшчыкаў. У вялікія грамадскія падзеі пераўтваралася святкаванне Вялікадня, Троіцы (Сёмухі), Ражства, якія ўваходзілі ў традыцыйны народны каляндар. Абавязковым кампанентам свят былі традыцыйныя гульні — такія старажытныя, як «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчур», а таксама абрады — «Пахаванне стралы», «Куст», гуканне вясны. Святы суправаджаліся выступленнямі народнага тэатра — батлейкі, паказам інтэрмедый, народных драм (найбольш пашыраная — «Цар Максіміліян»).

У цэлым, у XVII—XVIII стст. у асноўным меўся характэрны для беларускай традыцыйнай духоўнай культуры абрадавы комплекс, аснову якога складала язычніцкая светапоглядная, рытуальная сістэма, звяза-

ная з культам агню, вады, продкаў. У цэлым, нягледзячы на значныя высілкі і пэўныя поспехі, царкве не ўдалося зрабіць хрысціянскія светапоглядныя канстанты дамінуючымі ў асяроддзі беларускага сялянства даследуемага перыяду. Бурныя рэлігійныя катаклізмы на беларускіх землях амаль не закранулі глыбока архаічнай сутнасці сялянскага светаўспрымання, якое бярэ пачатак у паганстве. Як адзначаў А. Мейер, сяляне Крычаўскага графства «не имея об законе большого понятия… в нём и не суеверны; а суеверие их простирается более до окружающих их предметов».

Разам з тым у абрадах суіснавала язычніцкае і хрысціянскае, рытуалістыка гэтых рэлігійных сістэм была запатрабавана ў абраднасці, мела істотную вагу ў яе сацыяльнай рэпрэзентацыі. Спецыфічнай рысай дадзенага этапа з'яўлялася іх рытуальная раз'яднанасць, пэўная адсутнасць абрадава-рытуальнага сінкрэтызму, уласцівая наступнай эпосе. Язычніцкае і хрысціянскае суіснавала, але яшчэ ў сваіх абрадавых анклавах, не пранікаючы глыбока адно ў адно.

Такім чынам, грамадскі і сямейны быт беларускіх сялян характарызаваўся паступовымі зменамі, звязанымі, у першую чаргу, з паступальнай дынамікай гісторыка-культурных навацый. У грамадскім быце гэта звязана са знікненнем інстытута копнага суда, дэвальвацыяй эканамічнай ролі грамады. Сістэмаўтваральныя асновы сялянскага быту грунтаваліся на практычна-рацыяналістычных асновах неабходнасці фізічнай працы і падтрымання жыццёвых патэнцый. Гэтаму было падпарадкавана выхаванне дзяцей у сялянскай сям'і, гэтым вымяралася сялянская этыка и аксіялогія. Дынаміка сялянскага быту шмат у чым вызначалася ростам індывідуальнай варыянтнасці ментальнасці і паводзін, што знайшло ўвасабленне ў дэструкцыі эканамічных функцый абшчыны, пашырэнні малой сям'і, узнікненні прозвішчаў.

## 5.3. Грамадскі быт гараджан

Этнакультурнае жыццё горада дадзенага перыяду знаходзілася ў кантэксце агульных тэндэнцый працякання гістарычных працэсаў у Беларусі і адрознівалася такім жа складаным, супярэчлівым характарам. Прычым у гарадах — шматфункцыянальных палітычных, эканамічных, культурных цэнтрах гэтыя з'явы былі выяўлены больш выпукла і канцэнтравана. Галоўнай бядой для гарадоў Беларусі з'явіліся войны, розныя па паходжанні ўзброеныя канфлікты, якія літаральна захліснулі беларускія землі ў тую эпоху. Можна сказаць, што абарончыя ўмацаванні, якія зацвердзілі горад як тып пасялення, стымулявалі і яго станаўленне ў якасці галоўнай тактыка-стратэгічнай ваеннай мішэні. Беларускім гарадам было суджана знаходзіцца ў эпіцэнтры бітваў шэрага войнаў: 1648—1654 гг., Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654—1667 гг., Паўночнай, сутыкненняў у час канфедэрацый, іншых збройных канфрантацый. Гэтыя ваенныя

дзеянні, якія адрозніваліся па ідэйна-палітычных перадумовах, рухаючых сілах, непасрэдных і перспектыўных выніках, мелі для гарадоў адзіны канкрэтны вынік: убыль (смерць, уцёкі) насельніцтва, знішчэнне культурнага фонду, падрыў функцыянальнай асновы — эканомікі. У той або іншай ступені панеслі страты ўсе гарады, але ў большай меры ў другой палове XVII ст. пацярпелі разарэнне ўсходнебеларускія землі з гарадскімі пасяленнямі, якія страцілі да 70% насельніцтва. У выніку трох войнаў і эпідэмій многія беларускія гарады былі амаль цалкам зруйнаваныя, абязлюдзелі: Магілёў, Віцебск, Гародня, Мінск, Барысаў, Слуцк, Брэст, Наваградак, Пінск, Нясвіж; панеслі вялікія страты Полацк, Орша, Шклоў і іншыя гарады і мястэчкі.

Істотныя хістанні колькасці і складу насельніцтва, дэстабілізацыя гарадскога асяроддзя затрымлівалі працэс крышталізацыі форм грамадскага быту і духоўнага жыцця, іх дыяхронную пераймальнасць, тармазілі ўзнікненне соцыуму гараджан, гарадскога тыпу культуры. Фактычна культурная дэструкцыя беларускага горада XIX ст. не ў апошнюю чаргу была выклікана тым, што ў выніку сістэматычных разбурэнняў другой паловы XVII ст. і цяжкай эканамічнай сітуацыі пачатку XVIII ст. старабеларускі горад не паспеў да канца XVIII ст. выпрацаваць новыя ўстойлівыя тыпы гарадской культуры, быту.

Агульную карціну адмоўных фактараў дапоўніла ўпартае наступленне феадалаў на гарадскія ўладанні — стварэнне сваіх юрысдык, якія не падпарадкоўваліся магістрату (у прыватнаўласніцкіх гарадах і магнату), што дэстабілізіруючы ўплывала на розныя сферы гарадскога жыцця, у тым ліку, у значнай ступені, на грамадскі быт, руйнуючы сістэму гарадскога самакіравання.

Прычыны, якія былі пералічаны вышэй, былі асноўнымі з тых, што затрымалі развіццё беларускіх гарадоў. У выніку пастанаўленнем сейма 1776 г.— часу, калі гарады зноў назапашвалі істотны эканамічны, дэмаграфічны, культурны патэнцыял,— толькі ў васьмі з іх было захавана самакіраванне, што гаворыць аб агульным крызісе гарадскога грамадскага жыцця.

Разам з тым гарады працягвалі заставацца буйнейшымі цэнтрамі захавання і выпрацоўкі культурных каштоўнасцей, у гарадскім асяроддзі дынамічна функцыянавалі разнастайныя формы грамадскага, духоўнага жыцця, што стала асабліва заўважна ў другой палове XVIII ст. Увогуле, гараджане складалі прыблізна 10% насельніцтва Беларусі і па колькасным складзе не саступалі шляхце.

Гарады Беларусі вылучаліся паміж сабой па шэрагу параметраў, што накладвала адбітак на іх адрозненні ў духоўнай культуры і грамадскім быце. Перш за ўсё гэта тычыцца памеру гарадскога пасялення — у буйных гарадах культура і быт характарызаваліся часцей за ўсё большай змястоўнай разнастайнасцю, хаця прынцып: вялікі горад — вялікая культура — не быў вызначальным для старабеларускай культурнай сітуацыі —

невялікія гарады, мястэчкі нярэдка вызначаліся высокім узроўнем культурнага развіцця, былі культурнымі цэнтрамі (Нясвіж, Ружаны, Налібокі, Урэчча і інш.). У параўнанні з канцом папярэдняга перыяду колькасць гарадоў на беларускіх землях не змянілася: да сярэдзіны XVII ст. і ў канцы XVIII тут налічвалася 39 гарадоў. Паводле іншых даных, якія тычацца 1786 г., у Беларусі было 42 гарады, прычым 38% гараджан жылі ў населеных пунктах з колькасцю жыхароў да 2 тысяч чалавек (усяго такіх гарадоў — 31, з іх 17 — з насельніцтвам да 1 тысячы чалавек); найбольш значныя гарады — гэта Віцебск (звыш 10 тысяч насельніцтва), Магілёў, Мінск (звыш 6 тысяч), Полацк, Гародня, Слуцк, Пінск і некаторыя іншыя.

Гарады Беларусі, як і раней, падзяляліся на каралеўскія і прыватнаўласніцкія, што таксама накладвала адбітак на ўсе бакі гарадскай жыццядзейнасці. У сярэдзіне XVII ст. і ў канцы XVIII ст. прыватнаўласніцкіх гарадоў было адпаведна 14—12; А. П. Грыцкевіч лічыць магчымым павялічыць лічбу гарадскіх пасяленняў: сярэдзіна XVII ст.— 17 прыватнаўласніцкіх з 42 гарадоў (40%) і другая палова XVII—XVIII ст.— 25 прыватнаўласніцкіх з 51 (49%). Прыватнаўласніцкія гарады, нягледзячы на параўнальна невялікія памеры, нярэдка адрозніваліся актыўным, арыгінальным культурным, грамадскім жыццём, бытам (Нясвіж, Слуцк, Слонім), што здымала вызначаную манапольнасць буйных гарадоў і разнастаіла палітру культурнага жыцця.

Палітычнае, сацыяльнае жыццё гараджан кіравалася нормамі магдэбургскага права, якое дэкларавала судовую, маёмасную асабістую незалежнасць мяшчан, уводзіла гарадское самакіраванне — магістрат на чале з бурмістрам, а таксама войтам. Пад магдэбургскае права не падпадалі жыхары юрыдык — маёмасці феадала, якія знаходзіліся ў яго судова-адміністрацыйнай уладзе.

Як і шляхта, гараджане, якія ў тагачасных дакументах зваліся мяшчанамі, не былі сацыяльна і культурна аднародным кангламератам. Перш-наперш яны падзяляліся па юрыдычнай прыналежнасці на жыхароў, якія падпарадкоўваюцца магістрату, а таксама юрыдыцы — знаходзіцца ў межах феадальнай прыватнай уласнасці, якая мелася ў кожным беларускім горадзе. Адзначым, што гэта адрозненне не накладала істотнага адбітку на быт і культуру гараджан. Само паняцце гараджанін таксама было досыць шырокім. У першую чаргу — гэта ўласна мяшчане — тыя, хто меў у горадзе ўласную маёмасць, — зямлю і дом на ёй, іншыя гаспадарчыя, вытворчыя сродкі, карыстаўся гарадскімі прывілеямі і выконваў адпаведныя абавязкі. У сваю чаргу мяшчане падзяляліся па маёмасным крытэрыі на патрыцыят — заможных купцоў, рамеснікаў, што ўзначальвалі цэхі, сярэднюю праслойку і адносна бедных мяшчан, сярод якіх вылучаюцца тыя, якія ў інвентарах адзначаліся як бедныя і не мелі нічога, акрамя надзела. З. Ю. Капыскі лічыць, што гарадская вярхушка ў гарадах складала 8—10 % усіх гараджан, а сярэдні слой — 40—50 %. Па даных А. М. Лютага, у канцы XVIII ст. мяшчан у беларускіх гарадах было каля 80 тыс. чалавек і яны складалі 80 % усіх гараджан.

Акрамя мяшчан, у горадзе жыла значная колькасць так званых «люзных» людзей, «маладцоў», «парабкаў» — тых, хто прыйшоў у горад, не маючы жылля і пэўнай спецыяльнасці, а таксама рамеснікаў, якія вымушаны былі жыць у чужых дамах — «каморнікаў». Гэтыя людзі маглі легалізавацца, увайсці ў склад гарадской сістэмы і плаціць самы нізкі падатак, але часта гэтага не рабілі, што і выклікала шматлікія судовыя справы. Акрамя гэтага, у гарадах жылі шляхта, баяры, служыцелі разнастайных рэлігійных канфесій, якія захоўвалі сваю культурную, бытавую спецыфіку. Гэтая сацыяльна-культурная неаднароднасць, накладзеная на прафесійную спецыфіку (тут сваім характэрна-замкнёным жыццём вылучаліся цэхавыя арганізацыі), стварала пэўныя адрозненні ў быце гараджан, якія, аднак, не нівеліруюць існавання тыпалагічна адметных рыс быту беларускага горада, у падмурку якога знаходзілася бытавая культура мяшчан, асабліва іх сярэдняй праслойкі.

### *5.3.1. Характэрныя формы грамадскага быту*

Горад уяўляў сабой закрытую сацыяльную сістэму, якая існавала ў значнай ступені па сваіх прававых, судовых, эканамічных, культурных нормах. Таму ў падмурку разгляду і тыпалогіі гарадскога быту знаходзяцца пераважна тыпы ўнутрыгарадской камунікацыі і звязаныя з імі формы культуры. Пры гэтым можна выдзеліць тры асноўныя камунікацыйныя цэнтры горада: агульнакамунікацыйны — рынкавая плошча, лакальна-камунікацыйныя — прыход і карчма. Адным з цэнтраў агульнагарадской камунікацыі была плошча перад прыходскім храмам. Таксама грамадскі быт магчыма падраздзяліць на полісацыяльны, які ахоплівае прадстаўнікоў розных класавых, этнічных, канфесіянальных, прафесійных і іншых груп, і субсацыяльны — характэрны для вузкавызначанага сацыяльнага асяроддзя. У сваю чаргу змястоўны бок гэтых двух тыпаў грамадска-бытавой камунікацыі складалі падзейны, каляндарна-святочны і будзённы пласты. Падзейны пласт абдымае кола пераважна паратэатральных відовішчаў, звязаных у асноўным з пазакаляндарнымі падзеямі агульнагарадскога характару — прыбыццём значных асоб, вехамі сямейнага, асабістага жыцця магнатаў — вяселлямі, імянінамі, пахаваннямі, а таксама іншымі падзеямі гарадскога жыцця — сеймікамі і сеймамі, грамадскімі пакараннямі і інш. Гэты тып грамадскага быту меў у большай ступені асобасны, рэгулярны, свецкі характар. Разам з тым у пэўных выпадках ён мог сумяшчацца з каляндарна-святочным тыпам — калі яго падзеі прымяркоўваліся да рэлігійных каляндарных свят. Таксама падзейны пласт уключаў і рэгулярныя полісацыяльныя акцыі, такія, як кірмашы.

Каляндарна-святочны пласт полісацыяльнага грамадскага быту звязаны з хрысціянскімі каляндарнымі святамі, якія рабіліся падзеямі агульнагарадскога маштабу. Гэта, зыходзячы з дамінавання ў тагачасных гарадах каталіцкай канфесіі, у першаю чаргу — святы па новым календары,

сярод якіх вылучаліся Ражство, Вялікдзень, свята Божага Цела, святы ў гонар шматлікіх святых. Разам з тым шматканфесіянальны склад гарадскога насельніцтва беларускіх зямель XVII—XVIII стст. надаваў каляндарна-святочнаму тыпу быту субсацыяльны характар: прадстаўнікі пратэстантызму, праваслаў'я, іудаізму, ісламу адзначалі свае рэлігійныя святы асобна.

Бурныя палітычныя, сацыяльныя канфлікты эпохі спецыфічна адбіліся на грамадскім быце гараджан, актывізуючы яго мілітарысцкі бок. Увогуле, тагачасныя беларускія гарады ўяўлялі сабой істотныя ўмацаваныя пункты з дзвюма асноўнымі абарончымі фартэцыямі — сістэмай забудоў вакол горада і замкамі, акрамя гэтага, абарончы характар мела і планіроўка горада з культавымі будынкамі ў вузлавых месцах. У гарадах налічваліся значныя абарончыя арсеналы — так, у Слуцку паводле вопісу 1620 г. было 26 гармат, 130 пішчалей, больш за 200 мушкетаў; у Нясвіжы ў 1753 г. было 30 гармат. Названыя гарады, а таксама Магілёў, Стары Быхаў былі значнымі абарончымі пунктамі, што адыгрывалі істотную ролю ў ваенных дзеяннях. Параўнальна вялікія, пераважна прыватнаўласніцкія гарады мелі апалчэнне, якое дзялілася на палкі, сотні, дзесяткі, магло ўключаць усё здаровае мужчынскае насельніцтва, як гэта было ў Слуцку; прычым у апалчэнне ўваходзілі ўсе групы гараджан: рамеснікі, «люзныя» людзі, яўрэйскае насельніцтва. Абарона горада ад знешняга ворага, унутрыгарадскія сутычкі — усё гэта вымушала дзейнічаць сумесна прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў гараджан, садзейнічала нівеліроўцы гарадскога быту. У гарады зыходзілася насельніцтва ў час войнаў, паўстанняў, гарадская рыначная плошча была месцам збору паспалітага рушэння, тут адбываліся з'езды часоў канфедэрацый, што ўвогуле рабіла гэты тып пасялення цэнтрам маштабных падзейна-бытавых камунікацый. Экстрэмальныя ўмовы спрыялі росту значэння гандлёвай плошчы ў грамадскім быце гараджан: сюды збягаліся жыхары ў час небяспекі, аб якой абвяшчаў, напрыклад у Магілёве, звон.

Полісацыяльнаму бытавому тыпу супрацьпастаўляўся субсацыяльны. Ён абапіраўся на выразную сацыяльна-іерархічную, рэлігійную, этнічную дыферэнцыяцыю гараджан. Структурна субсацыяльны быт падзяляўся на сацыяльна-класавы (патрыцыяту, шляхты, мяшчан, нізоў і г. д.), этнічны (быт і культура жывучых адносна кампактна і этнічна адасобленa дысперсных груп — яўрэяў, татар, рускіх стараабрадцаў і інш.), вузкапрафесійны (лад жыцця кліру, цэха), сацыяльна-тапаграфічны (прадмесці, часткова насельніцтва прыхода). Усе гэтыя соцыумы, нягледзячы на ўзаемапранікненне адзін у аднаго, тым не менш былі дастаткова стабільнымі, мелі свае вузкалакальныя цэнтры камунікацыі, валодалі пэўным сацыяльным эгацэнтрызмам. Гэтыя асноўныя тыпы субсацыяльнага быту наогул адрозніваліся значным кансерватызмам, аднак і сярод іх сваёю карпаратыўнасцю вылучаўся быт патрыцыяту — заможнай шляхты (элітарна-рэферэнтнай групы гараджан), да якой прымыкаў слой найбольш забяспечаных рамеснікаў, купцоў. Свае нормы паводзін дыктавала і шляхта —

так, напрыклад, у Мінску мяшчане першы раз былі дапушчаны на баль у 1791 г. Досыць спецыфічным і замкнёным быў быт аб'яднаных у кагалы яўрэяў, лічба якіх у гарадах павялічылася да 20—40 % усіх жыхароў. Па-ранейшаму ўнутранае жыццё абшчын было строга рэгламентавана, але яны звычайна прымалі актыўны ўдзел у полісацыяльным грамадскім быце. Што датычыцца цэхаў, дык іх традыцыйна-кансерватыўны лад жыцця пачаў дэфармавацца недзе з другой паловы XVIII ст.— часу агульнага заняпаду гэтай формы аб'яднання рамеснікаў. Сярод новых з'яў субсацыяльнага прафесійнага быту трэба адзначыць першапачатковую крышталізацыю ладу жыцця тых, хто працаваў на мануфактурах, аднак яго спецыфіка была звязана пакуль што амаль толькі з асаблівасцямі працы.

Разам з тым буржуазна-дэмакратычныя плыні новай гістарычнай эпохі ў першую чаргу захапілі гарады. У апошнія дзесяцігоддзі XVIII ст. агульнадаступнымі зрабіліся тэатральныя пастаноўкі (тут сваю ролю адыграў перасоўны тэатр), балі, іншыя з'явы культурнага жыцця, узніклі рэдуты (агульнадаступныя балі, уваход на якія быў па білетах). Размыванне саслоўнай замкнёнасці адбывалася ў першаю чаргу пад уплывам буржуазнага ладу жыцця — саслоўна дыферэнцыраваны феадальны горад паступова саступаў месца больш дэмакратычнаму гораду раннебуржуазнаму.

З шырока зразумелым субсацыяльным бытавым тыпам звязана функцыянаванне трэцяга асноўнага (у сістэме горада — лакальнага) цэнтра ўнутрыгарадской камунікацыі — карчмы. Гэта было месца, дзе грамадская падзея рабілася фактам асабістага жыцця і наадварот. Карчма з'яўлялася адначасова субсацыяльным і тапаграфічным лакальным цэнтрам — яе наведвалі ў асноўным гараджане нізкага і сярэдняга дастатку, якія жылі недалёка ад піцейнага дома. З карчмой былі звязаны будзённы і святочны быт, тут вырашаліся дзелавыя справы. XVII—XVIII стст. былі часам развіцця піцейных дамоў. Так, у Нясвіжы за 107 год колькасць карчмоў павялічылася амаль у тры разы — з 17 у 1654 г. да 47 у 1761 г. З'явіліся і новыя дыферэнцыраваныя віды — аўстэрыі, шынкі і інш.

Адным з найбольш важных фактараў духоўнага жыцця гарадоў той эпохі была рэлігійная прыналежнасць. Своеасаблівасць існавання канфесіі ў XVI —-XVIII стст. складалася з таго, што яна адначасова з этнічным адценнем несла яшчэ і палітычнае. Экспансія каталіцкай царквы нанесла моцны ўдар канфесіянальнаму плюралізму, які ў добры бок адрозніваў Беларусь у бліжэйшым мінулым, і зрабіла пытанне аб веравызнанні крытэрыем палітычнай надзейнасці. Элементы дыскрымінацыі праваслаўных і пратэстанцкіх мяшчан, прадстаўнікоў іншых вер і культур, акрамя каталіцкай і, у пэўнай ступені, уніяцкай — усё гэта істотна дэстабілізавала гарадское жыццё, надавала яму рысы жорсткасці. Разам з тым нельга меркаваць, што беларускія гарады пераўтварыліся ў арганізуючыя цэнтры канфрантацыі. На плошчах захоўвалася суіснаванне розных па належнасці культавых устаноў, рэлігійная палеміка

не абавязкова выклікала ўзброеныя сутычкі. Акты міжканфесіянальнай агрэсіі адбываліся ў асноўным паміж прафесійнымі носьбітамі той ці іншай рэлігіі, тымі, хто належаў да пэўных рэлігійных устаноў: манахамі, навучэнцамі царкоўных, манастырскіх школ, калегіумаў. Шырокія грамадскія хваляванні на рэлігійнай, этнічнай глебе былі справай экстраардынарнай. У час, калі не было войнаў, узброеныя супрацьстаянні гараджан былі выключэннем — забойства І. Кунцэвіча мела вялікі рэзананс як раз дзякуючы свайму выключнаму характару. Традыцыя верацярпімасці аказвалася досыць трывалай і здольнай да супраціўлення. Што тычыцца канфесіянальнага складу гарадскога насельніцтва, дык ён адлюстроўваў спецыфіку беларускай сітуацыі — у гарадах панавалі каталікі, меліся праваслаўныя, уніяцкія рэлігійныя ўстановы, а таксама вернікі яўрэі, што спавядалі іудаізм (асабліва трэба адзначыць рэфармацыйны рух хасідаў), мусульмане — татары, невялікая колькасць пратэстантаў.

Субсацыяльная функцыя праявілася ў моўнай сферы. Складана назваць перыяд у гісторыі беларусаў, калі б шматмоўе было так распаўсюджана сярод гараджан. Разам з тым агульны моўны прынцып дзяржавы меў месца і там: асноўнай мовай была дзяржаўная польская. А. М. Лунін у 1792 г. пісаў, што беларусы ўсіх гарадоў Полацкага намесніцтва (Полацка, Віцебска і інш.) гавораць «мовай польскай», якую ён адрозніваў ад «испорченного польского языка» сельскага насельніцтва. Гэта трэба разумець як канстатацыю польскамоўнасці гараджан, у адрозненне ад беларускамоўнасці вяскоўцаў. Безумоўна, пасля Варшаўскага сейма 1696 г., на якім старабеларуская мова ў якасці афіцыйнай у Вялікім княстве Літоўскім была заменена польскай, апошняя паступова стала дамінуючай у розных сферах ужывання. На польскай мове, разам з лацінскай, адбывалася навучанне ў асноўных вучэбных установах, на гэтых мовах выдавалася амаль уся надрукаваная прадукцыя таго часу. Па-польску пісаўся асноўны тэкст актаў, у тым ліку і гарадскіх, ужо з пачатку XVII ст. Разам з тым польская мова наўрад ці можа прэтэндаваць на ролю адзінай дамінуючай мовы камунікацыі гараджан. Напэўна, гэта быў час субсацыяльных моў, сярод якіх польская адыгрывала сацыякамунікатыўную ролю. Большасць гараджан была, відавочна, білінгвамі, прычым другой мовай, як у простых мяшчан, так і ў часткі заможнай, была беларуская. У актавых кнігах магістратаў уступная і заключная часткі нярэдка пісаліся па-беларуску, зрэдку сустракаліся і дакументы цалкам на гэтай мове, на старажытнабеларускай мове іншы раз падпісваліся члены магістрата (праваслаўныя), на ёй працягвалі ствараццa асобныя літаратурныя, публіцыстычныя творы. Беларуская мова выкарыстоўвалася ў традыцыйным сілабічным вершаскладанні ў беларускай любоўнай лірыцы другой паловы XVII — першай паловы XVIII ст., якая ўзнікла і развівалася ў асяроддзі мяшчан і збяднелай шляхты. Беларуская мова гучала з канца XVI ст. у інтэрмедыях, прычым яна магла быць цалкам звязана з жывой народнай мовай. Яе чулі ва уніяцкіх цэрквах у час казанняў, яна вывучалася ў школах пры кляштарах базыліян.

Акрамя вызначаных, мовай навукі была лацінская, аматараў прыгожага пісьменства, сучаснай філасофіі — французская. У вузкім, пераважна канфесіянальным асяроддзі карысталіся мовамі царкоўнаславянскай, грэчаскай. Моўную палітру горада дапаўняла гаворка на родных мовах прадстаўнікоў іншаэтнічных па адносінах да беларусаў этнасаў.

Увогуле, шматмоўнасць беларускага горада была звязана з яго роляй данатара духоўных каштоўнасцей, якія традыцыйна ствараліся на розных мовах і ўвайшлі ў бытавую культуру гараджан. У гарадах былі размешчаны друкарні, якія выдавалі прадукцыю на польскай, лацінскай, старабеларускай, стараславянскай, іншых мовах — пры манастырах, брацтвах, ці свецкія — каралеўскія. Тут можна вылучыць Магілёў, Мінск, Нясвіж, Гродна. Шырока папулярнымі ў XVIII ст. сярод шляхты і гараджан зрабіліся своеасаблівыя энцыклапедыі сучаснага жыцця — календары, а таксама газета — «Вядомасці літэрацкі», якая выдавалася ў Вільні — першыя сучасныя сродкі мас-медыя. У гарадах канцэнтраваліся асяродкі адукацыі — калегіумы, манастырскія школы. Да канца XVIII ст. горад пастулова завалодаў інтэлектуальнай манаполіяй, прыцягнуў да сябе лепшыя навуковыя, літаратурныя, мастацкія сілы і пачаў атрымліваць перамогу ў гэтым сэнсе над сельскімі шляхецкімі маёнткамі.

Складаную карціну ўяўляла сабой і іерархічная структура этнічнай самасвядомасці гараджан-беларусаў. Найбольш высокую ступень у ёй займаў палітонім — дзяржаўны вызначальнік, якім часцей за ўсё была назва «ліцвіны». Акрамя гэтага, беларусаў — гараджан той эпохі называлі (экзаэтнанім) літвой, літоўскімі людзьмі, беларусамі (беларусцамі), палякамі, рускімі, русінамі. Самі ж сябе яны звалі (эндаэтнанім) ліцвінамі, беларусцамі, літоўскімі людзьмі. Прычым спецыфіку самасвядомасці гараджаніна складала тое, што прозванне ад назвы горада, адкуль ён родам,— магілёвец, быхавец, мсціславец і г. д.— займала амаль адну ступень у таксанамічным шэрагу з вызначальнікам, напрыклад, дзяржаўнай прыналежнасці. У эпоху, якая даследуецца, ішоў працэс стабілізацыі этнічнага азначэння беларусец (яно нярэдка ўжывалася побач з назвай ліцвін), напаўнення яго этнічным зместам у якасці экза- і эндаэтнаніма. Так, у пытальнай гаворцы ў Пасольскім прыказе ў Маскве ігумен Полацкага Уваскрасенскага кляштара Афінаген Крыжаноўскі казаў, што яго паслалі «з Полацку ўсе беларусцы». Як ужо адзначалася вышэй, назва беларусец была ўласцівая ў XVII ст. выключна прадстаўнікам паўночна-ўсходніх, усходніх рэгіёнаў беларускіх зямель — тых, што называліся Белай Руссю. Тым больш каштоўнымі з'яўляюцца звесткі аб рэгіянальным пашырэнні гэтага самавызначэння, што сведчыць аб пачатку складанага працэсу напаўнення гэтага тапоніма этнічным зместам. Так, беларусцам на распытных гаворках у Маскве назваў сябе ўраджэнец Гародні Асташка Троінскі (1672 г.) . Акрамя таго, што так вызначыў сябе беларус самай заходняй часткі этнічнай тэрыторыі, якая ніколі не называлася ў гэты перыяд Белай Руссю, аб этнічным адценні гэтага

наймення сведчыць яго вялікая ўстойлівасць — А. Троінскі знаходзіўся на чужыне 17 гадоў. Доўгае захаванне саманазвы ва ўмовах значнай адлегласці ад радзімы сведчыць, што гэтая саманазва мае рысы этноніма.

### *5.3.2. Падзейны від грамадскага быту*

Гандлёвая плошча, а таксама галоўныя вуліцы горада, якія выходзілі на яе, былі асноўным месцам, дзе разгортвалася дзейства полісацыяльнага пласта грамадскага жыцця і, у прыватнасці, самага значнага яго віду — падзейнага. Камунікатыўная цэласнасць гараджан рэальна ажыццяўлялася ў грамадскай прасторы горада, цэнтрам якога з'яўлялася плошча — асноўны камунікатыўны вузел. Для беларускіх гарадоў XVII—XVIII стст. тыповым было існаванне двух цэнтраў — рэзідэнцыі феадала і гандлёвай плошчы (нярэдка адзінай у горадзе), дзе размяшчаліся ратуша, гандлёвыя рады, культавыя будынкі, жылыя дамы і г. д. Рыначная плошча з'яўлялася асноўным цэнтрам гандлёвага, адміністрацыйнага, дзелавога, вучэбнага жыцця гарадоў і мела адпаведныя яе значэнню памеры: у канцы XVIII ст. у Мінску яна займала 2,75 га, Магілёве — 2,72 га, Полацку — 1,93 га, Старым Быхаве — 1,88 га. Акрамя гандлёвай, у некаторых гарадах мелася яшчэ адна (Віцебск, Слуцк, Мінск і інш.) або некалькі плошчаў (Нясвіж, Крычаў і інш.), якія ігралі ролю лакальных цэнтраў грамадскай прасторы. Нягледзячы на агульнаеўрапейскі працэс адціскання на другі план функцыянальнага пачатку рыначнай плошчы ў эпоху барока, у беларускіх гарадах яна захавала значэнне цэнтра грамадскага жыцця.

Падзейны від грамадскага быту, побач з каляндарна-святочным, ахоплівае найбольш буйныя сацыяльна-інтэгруючыя з'явы ў жыцці гараджан. З падзейнай разнастайнасці сваім грамадскім рэзанансам і рытуальнай насычанасцю вылучаецца прыбыццё ў горад розных каранаваных высокапастаўленых асоб, прыём якіх суправаджаўся ўсім комплексам існуючых сродкаў, арганізаваных у вызначаную сістэму барочных паратэатральных відовішчаў з урачыстымі брамамі, шэсцямі, тэатралізаваным афармленнем, музыкай, гарматнымі стрэламі, феерверкамі. Так, у 1699 г. у Магілёве біскупа Беларускага С. Палахоўскага сустракалі працэсія духавенства, увесь магістрат, шматлікая купецкая і мяшчанская моладзь, якая ехала вярхом з харугваю купецкай ізбы, розныя цэхі, якія ішлі ў падабаючым моманту адзенні, пры зброі, усё шэсце суправаджалася гарматнай пальбой. Не менш пышна прывіталі прыбыццё ў гэты горад у 1775 г. біскупа Беларускага, Мсціслаўскага, Аршанскага і Магілёўскага І. Валчанскага. Барабаны сігналізавалі аб зборы цэхаў, літаўры — купецкай і ротмістравай харугваў. Магістрат сустракаў біскупа ў спецыяльна пабудаванай на мосце за горадам «Трыумфальнай браме» — багата аздобленай, з гербамі і надпісамі. Па дарозе да брамы госця суправаджала працэсія, на чале якой ехала купецкая харугва, затым ішоў кравецкі цэх з царкоўнымі атрыбутамі,

духавенства і — сярод яго — сам І. Валчанскі. У горадзе біскуп выконваў урачыстыя службы, прысутнічаў на абедзе «пры музыцы брацкай». Надоўга засталіся ў вусных паданнях, захаваліся ў разнастайнай літаратуры сустрэча і знаходжанне караля Станіслава Аўгуста па дарозе на сейм 1775 г. у рэзідэнцыі Караля Радзівіла — Нясвіжы. Буйнейшы беларускі магнат, які багаццем перасягнуў караля, не пашкадаваў сіл і сродкаў для дэманстрацыі сваёй магутнасці. Перад уездам у горад былі пабудаваны дзве брамы з надпісамі па латыні, у першай з якіх Станіслава Аўгуста вітаў бургамістр і даў яму ключы ад горада. На цэнтральнай, рыначнай плошчы ў ратушы стаяла пяхота асобнага войска Радзівіла, святкаванне праходзіла ў іезуіцкім касцёле, замку, горад быў багата ілюмінаваны. На сустрэчу сабралася ў горад вялізная колькасць людзей — толькі прыезджых налічвалася каля 30 тысяч. Канцэрты, балеты, оперы, паляванне, грандыёзная тэатралізаваная пастаноўка «Аб авалоданні Гібралтарам» у прыгарадзе Альба, уражальны феерверк і яшчэ многія іншыя забавы суправаджалі прыём караля, які каштаваў Пану Каханку 1 млн. 600 тысяч польскіх злотых. Падзейны пласт уключаў шэраг грамадска-бытавых акцый полісацыяльнага характару, сярод якіх вылучаецца слой рэгулярных, аднесеных да вызначанага прамежку часу мерапрыемстваў. Гэта, па-першае, кірмашы, якія адбываліся ў сярэднім 2—4 разы ў год, а таксама штотыднёвы гандаль. Прычым для ўдзелу ў іх прыбывалі не толькі жыхары вызначанага рэгіёну — лакальнага рынку з цэнтрам у буйным горадзе ці мястэчку. У разглядаемую эпоху межы лакальных рынкаў рэгулярна пашыраліся, узрастала інтэнсіўнасць гандлёвых кантактаў як ва ўнутрыбеларускім, так і ў міжэтнічным, міждзяржаўным маштабах. Такім чынам, рыначная плошча беларускіх гарадоў і мястэчак (тут у першую чаргу трэба назваць Магілёў) з'яўлялася камунікацыйным асяроддзем, дзе ішоў абмен сінхроннай этнакультурнай інфармацыяй разнастайных інтэграцыйных узроўняў: кансалідацыйнага; лакальна-этнаграфічнага (горад — сяло) і этнічнага; інтэграцыйна-міжэтнічнага.

Акрамя вышэй адзначаных, да падзей агульнагарадскога маштабу, пры ўсёй іх карпаратыўнасці, можна аднесці сеймы (кожны трэці з іх павінен быў праводзіцца ў Беларусі — у Гародні), а таксама павятовыя сеймікі. Прыбыццё значнай колькасці шляхціцаў, іх прадстаўнічай світы, асаблівасці сеймавай дзейнасці той эпохі — усё гэта прыносіла ў грамадскае жыццё гараджан налёт гіпертрафіраванага стыхійнага індывідуалізму, уласцівага шляхецкаму ладу жыцця таго часу. Спрэчкі палітычных груповак, што нярэдка пераходзілі ў скандалы і заканчваліся кровапраліццём, пышныя гулянкі, звязаныя з прыбыццём гасцей весяленні,— усе гэтыя тыповыя атрыбуты сеймаў і сеймікаў Рэчы Паспалітай, безумоўна, мянялі грамадскі быт гараджан.

Характар агульнагарадской падзеі маглі набываць і вехі жыццёвага шляху чалавека — вядома, знатнага. Разам з сеймамі, трыбуналамі, іншымі дзяржаўнымі мерапрыемствамі вяселле і пахаванне магнатаў

адносіліся да асноўных падстаў для сходаў — «з'ездаў» прадстаўнікоў пануючых класаў. Абраднасць гэтых двух дзействаў уключала шэраг грамадска-сігніфікацыйных рытуалаў. Так, пахаванне суправаджала шэсце цэхаў — са скручанымі, пакрытымі жалобным крэпам харугвамі, чорнымі барабанамі, тэатралізаванымі выявамі смерці і нябожчыка. Эмацыянальна супрацьлеглае, аднак таксама псіхалагічна моцнае ўражанне павінна было рабіць і шлюбнае святкаванне. Характэрным узорам вясельнай цырымоніі знаці можа служыць шлюб дачок князя Каэтана Выхоўскага ў Нясвіжскім замку — насычаны рытуаламі, выклікаўшы вялікі грамадскі рэзананс у горадзе. У падзею гарадскога значэння пераўтвараліся і імяніны высакародных асоб. Чатырохдзённае святкаванне, з'езд шматлікіх гасцей — усё гэта ўключалі імяніны маці князя Сангушкі ў Гародні. Балі, канцэрты, рэдуты, тэатральнае прадстаўленне, гарматная пальба і іншыя весяленні рабілі гэтую падзею святам гарадскога маштабу. Агульнадзяржаўнае значэнне набывала святкаванне каралеўскіх імянін, як, напрыклад, 3 мая 1791 г., калі яны ўрачыста, з ілюмінацыяй, другой пышнай атрыбутыкай адзначаліся ў гарадах Рэчы Паспалітай, у тым ліку ў Гародні, Брэсце, Мінску, Пінску.

Да ліку грамадска значных з'яў гарадскога жыцця, пастаянным месцам дзеяння якіх была рынычная плошча, належаць разнастайныя пакаранні. Так, у 1707 г. на гарадскім рынку Магілёва «казнілі» чатырох маскоўскіх афіцэраў, двух з іх — смяротнай карай. У эпоху актыўнага «палявання за вядзьмаркамі» на гандлёвай плошчы прыводзіліся ў выкананне смяротныя прыгаворы абвінавачаным (пазбаўленне жыцця за чарадзейства практыкавалася ў Рэчы Паспалітай да апошняй чвэрці XVIII ст.). У Быхаве, напрыклад, у 1688 г. было «калдуноў каля дзесятка спалена».

Увогуле падзейны полісацыяльны тып грамадскага жыцця вылучаўся значнай разнастайнасцю і ўключаў, акрамя вышэйадзначаных — адносна рэгулярных і характэрных, — багатую гаму з'яў гарадской жыццядзейнасці. Тут і святкаванне ў гонар адкрыцця ў Мсціслаўі і Клімавічах у 1778 г. службовых месц, што праходзілі, як адзначаў сведка, пры ўдзеле цахоў, штатных каманд пры гараднічых, суправаджаліся малебнам і г. д. У 1671 г. у Полацку ў сувязі з кананізацыяй св. Францішка Боргія адбылося трыумфальнае шэсце, пасля якога паказвалася драма. Спецыфічны, як і шмат што з жыцця Нясвіжа той эпохі, быў загад 1735 г., згодна з якім усё гарадское насельніцтва было абавязана ўдзельнічаць штогод у спецыяльных спаборніцтвах па стральбе — «кароль курка»,— адчынялі якія сам Радзівіл, яго жонка, камендант замка і г. д.

### *5.3.3. Каляндарна-святочны пласт грамадскага быту*

У параўнанні з падзейным каляндарна-святочны пласт полісацыяльнага грамадскага жыцця валодаў шэрагам асаблівасцей, што набліжалі яго на таксанамічнай шкале да субсацыяльнага. Сваёй семантыкай гэты слой звязаны з рэлігійнай сімволікай, і ў сацыяльным плане для яго

характэрны канфесіянальны сепаратызм,— прадстаўнікі розных веравызнанняў адзначалі свае святы ў розны час і неаднолькава. Каляндарна-святочны пласт больш дуалістычны — ён ахоплівае падзеі ў значнай ступені хатняга, сямейнага быту. І, нарэшце, гэты грамадскі камунікацыйны стыль быту ў большай ступені звязаны з вызначаным для кожнай групы веруючых культавым будынкам — камунікацыйным цэнтрам параўнальна нізкага ўзроўню і лакальнай грамадскай прасторай — плошчай перад ім. Пры гэтым нельга не заўважыць істотную ролю царкоўнага прыходу ў сацыяльна-тапаграфічнай ідэнтыфікацыі гараджан. З часоў сярэднявечча ён ажыццяўляў функцыю ідэалагічнага і маральнага кантролю над мясцовым насельніцтвам, з прыходам былі звязаны асноўныя жыццёвыя вехі чалавека, рэалізацыя яго рэлігійных патрэб, баўленне часу ў выхадныя і святочныя дні.

У сістэме дадзенага пласта вылучаюцца буйныя царкоўныя каляндарныя святы, якія асабліва пышна праводзіла каталіцкая царква. Святочны рытуал быў выверны да дробязі, вялікае значэнне надавалася тэатральным пастаноўкам і эфектам, што з'яўлялася вынікам дзейнасці езуітаў. Амаль усе касцёлы праводзілі шмат агульных і мясцовых свят; каб прыцягнуць веруючых, устанаўлівалі спецыяльныя святы, на якіх раздавалі індульгенцыі (адпусты), павялічвалі колькасць свят у гонар разнастайных святых, праводзілі старанна падрыхтаваныя буйныя акцыі — юбілеі. Асабліва дбайна каталіцкая царква ставілася да святкавання Цела Гасподня — сваёй буйнейшай каляндарнай урачыстасці. Пункт аб абавязковым удзеле цэха ў гэтай святочнай працэсіі ўпісваўся ў цэхавы статут. У прыватнаўласніцкіх гарадах Слуцку, Нясвіжы ўрачыстае шэсце суправаджалася ваеннай музыкай магнацкай пяхоты, гарматнымі залпамі. Таксама пышна, але ў больш традыцыйна-кананічным стылі адзначала свае святы і праваслаўная царква.

Нягледзячы на свой фармальна-канфесіянальны характар, каляндарна-святочны пласт, як ніякі іншы, захаваў сувязь з традыцыйна-бытавой культурай. Гэтая сувязь праяўлялася ў падабенстве асобных элементаў, а таксама ў агульным духу каляндарных святкаванняў з іх падарункамі і шчодрай ежай, які ўзыходзіць да народнай культуры. Так у 1671 г. магістрат Магілёва выдзеліў у якасці падарунка шэрагу знатных паноў «валачобнае» з грошай, рэдкіх вострых прыпраў, цукру і іншых прадуктаў. Паднашэнне было зроблена ў снежні, што адпавядае традыцыйнаму часу, калі ходзяць валачобнікі,— першаму велікоднаму вечару. Як вядома, валачобны абрад — адзін з найстаражытных і яго захаванасць у традыцыйнай культуры беларусаў уяўляе этнічную спецыфіку. Іншае абавязковае прынашэнне — «каляда» таксама звязана з шырока распаўсюджаным абрадам калядавання. У тым жа 1671 г. магістрат Магілёва выдаў грошы на «коляды пад час Рождества Христова, подлуг давного звычаю». Аналагічныя падарункі рабіліся ў 1697, 1709 гг., прычым яны, як і папярэднія, прыходзіліся на снежань, што супадае з традыцыйным перыядам калядавання, якое было досыць трывалым і

падтрымлівалася афіцыйна. Так, у каралеўскім прывілеі 1695 г. гараджанам Пінска і Турава прадпісвалася аднавіць стары, але трапіўшы ў забыццё звычай: на святы Ражства, Уваскрэсення, а таксама пры буйных шэсцях у кафедральны сабор — даваць уніяцкім епіскапам гэтых гарадоў «волочобнае» альбо «коляду». Абрад гарадскога калядавання, мабыць, адлюстраваны на гравюры славутага А. Тарасевіча (Глускі цыкл для кнігі «Разарыум...», гравюра «Студзень», 1672 г.).

Сувязь сялянскай і гарадской культур пацвярджаецца святкаваннем у Магілёве яшчэ аднаго старажытнага свята — Сёміка, Троіцы, Духа. У расходнай кнізе горада за май 1680 г. запісана: «купили маю о духу святому». Гэта вясенне-летняе блукаючае свята звязана з сашэсцем св. Духа на вучняў Хрыста, а таксама ў розных, у тым ліку і славянскіх народаў, з культам расліннасці. А цэнтрам абрадавага пакланення з'яўлялася Майскае дрэва — Май, як яго называлі ўсюды (у беларусаў часцей за ўсё гэта была бярозка).

Што да карнавалу, які ў гарадах Еўропы ў дадзены перыяд у асноўным сышоў, дык яго элементы ў беларускіх гарадах перайшлі ў маладзёжна-дзіцячую гульнявую сферу, што сведчыць аб дэструкцыі гэтага кампанента культуры.

Можна паспрабаваць вызначыць спецыфіку культурна-бытавога жыцця беларускага горада. У параўнанні з расійскім, дзе сістэма гарадской культуры была пабудавана па імперска-іерархічным прынцыпе (Масква і Санкт-Пецярбург — гарады—донары), старабеларускія гарады адрозніваліся больш разнастайнай, паліфанічнай формай арганізацыі урбаністычнай прасторы, ухілам у стракатасць і індывідуальную выразнасць бытавой урбаністыкі. Гэтаксама можна сказаць і пра ўзровень рэгламентацыі гарадскога жыцця, які быў вышэйшы ў Расійскай імперыі.

Такім чынам, духоўная культура і грамадскі быт беларускага горада другой паловы XVII — канца XVIII ст., нягледзячы на адмоўны ўплыў шэрага палітычных, сацыяльна-эканамічных, гісторыка-культурных фактараў, у цэлым захавалі паступовую дынаміку, лагічная лінія якой адпавядала эпахальным тэндэнцыям развіцця гарадской культуры Еўропы. Падаецца, што спецыфіка беларускага горада (у тым ліку яго грамадскага быту) вызначалася яго прамежкавым становішчам паміж істотна еўрапеізаванымі па французскім і, менш, нямецкім узорах гарадамі Рэчы Паспалітай — Варшавай, Кракавам, Вільняй і рускім горадам, які будаваўся на іншых, чым магдэбургскае права, пачатках.

### *5.3.4. Быт мястэчка*

Характэрнымі рысамі вылучаўся быт мястэчка — памежнай формы пасялення паміж горадам і вёскай. Пасяленні гэтага тыпу пачалі з'яўляцца на нашых землях у першай палове XV ст. Шляхі ўзнікнення мястэчка былі досыць разнастайныя. Гэтыя пасяленні ўзнікалі з таргоў і згуртавання рамеснага люду побач з каралеўскім ці прыватнаўласніцкім дваром

(такім чынам узнікла каля 100 мястэчак); з людзей, якія сяліліся побач з замкам дзеля атрымання аховы; у ходзе правядзення валочнай памеры; на ажыўленых трактах — для іх абслугоўвання; з прадмесцяў каля невялікіх гарадоў; у сістэме храмавага комплексу — для забеспячэння культу; з вялікай вёскі — дзякуючы каралеўскаму прывілею ці самазвана. XVII ст. і асабліва яго першая палова былі часам інтэнсіўнага ўзнікнення мястэчак: у першай палове ў Вялікім княстве Літоўскім іх узнікла 86, у другой палове — 46. Разам з тым досыць праблемным з'яўляецца крытэрый вылучэння непасрэдна мястэчка. Хаця працэс узнікнення мястэчка кантраляваўся каралеўскай уладай і абавязковымі былі прывілеі на ўтварэнне пасялення, гандаль, карчму, радзей — будаўніцтва замка, адрозніць мястэчка ад невялікага горада было складана. Сейм 1775 г. вызначыў мястэчка як пасяленне, дзе меней за 300 дамоў, сейм 1793 г.— менш за 400, аднак найбольш вялікая ўвага надавалася прававому стану — наяўнасці магдэбургскага права. Гісторык С. Александровіч лічыць мяжу мястэчка для XVI — першай паловы XVII ст. у 200—250 дамоў і 300 — 1625 чалавек. А. П. Грыцкевіч, згаджаючыся з Ю. Капыскім, лічыць, што крытэрыем розніцы паміж горадам і мястэчкам з'яўляецца лічба ў 300 дамоў. Усяго ж па яго падліках, паводле карты, выдадзенай М. К. Любаўскім, у XVI ст. на беларускіх землях было 265 мястэчак. Паводле даных А. М. Лютага, у канцы XVIII — пачатку XIX ст. на нашых землях было 287 мястэчак. Такім чынам, як бачна, іх колькасць на працягу больш за дзвесце гадоў хісталася адносна нязначна.

Размяшчэнне мястэчак на землях княства было нераўнамерным — у заходняй частцы ў параўнанні з усходняй (Мінскае, Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводства, княства Слуцкае) шчыльнасць мястэчак была амаль удвая большая — адно на 261 кв. км супраць аднаго на 586 кв. км — С. Александровіч тлумачыць гэта наяўнасцю на ўсходзе вялікай колькасці пушчаў і балот. Адсюль можна зрабіць выснову аб большай уцягнутасці жыхароў захаду нашых зямель у местачковы быт з усімі яго характэрнымі рысамі.

Спецыфіка быту мястэчка ў значнай ступені вызначалася яго «спецыялізацыяй» — г. зн. тыпам існавання, звязаным з генезісам. Побач са сваімі профільнымі — гандлёвымі заняткамі — жыхары мястэчка былі ўцягнуты ў пэўную спецыфічную дзейнасць. Сярод такіх спецыфікацый адзначым канфесіянальную, звязаную з суседствам, сімбіёзам мястэчка і канфесіянальнай установы. Так, у мястэчку Бялынічы гаспадар Леў Сапега пабудаваў вялізны кляштар ордэна кармелітаў, яго сын Казімір у 1624 г. упрыгожыў абраз Цудадзейнай Божай Маці ў Бялыніцкім касцёле, куды сыходзілася шмат вернікаў, пры кляштары былі вялізны сад, друкарня; у мястэчку Любешава на Піншчыне размяшчаўся піярскі касцёл і касцёл капуцынаў; у мястэчку Картуз-Бяроза быў у XVII ст. адзіны ў Рэчы Паспалітай кляштар картузаў; у мястэчку Глыбокае на Мядзельшчыне былі парафіяльны і кармеліцкі касцёлы; у касцёле мястэчка Будслаў быў цудадзейны абраз Панны Марыі. Яшчэ некаторыя

мястэчкі былі спадарожнікамі гарадоў і іх канкурэнтамі — Сапежын (каля Друі), Новы Койданаў,— іх быт вылучаўся урбаністычным характарам. Таксама былі мястэчкі-абслугоўцы буйных шляхоў — Воля Радзівілаўская (Нача), мястэчкі — транспартныя вузлы — Крупкі, Зембін, Беразіно, Койданава. Іх быт вылучаўся дастаткова насычанымі камунікацыямі, інфармацыйным абменам. У шэрагу мястэчак былі буйныя мануфактуры, што капіталізавала быт іх жыхароў (Налібокі, Урэчча).

Разам з тым галоўная жыццядзейнасць мястэчак была звязаная з гандлем, таргамі і кірмашамі, тавараваротам паміж горадам і вёскай, вёскай і мястэчкам. Адсюль спецыфічны гандлярска-рамесніцкі склад насельніцтва і лад жыцця і самога знешняга аблічча мястэчка, дзе істотнае месца займалі крамы, колькасць якіх магла быць даволі значнай: так, у мястэчку Багуслампалі ў 1667 г. было 92 крамы. Акрамя схільнасці да гандлю і рамесніцтва, былі яшчэ рысы, што стваралі паняццe местачковага быту, местачковасці. Яго сутнасцю з'яўляецца становішча сацыякультурнага маргіналізму, прамежкавасці пры імкненні максімальнага набліжэння да шляхты і гараджан. Магчыма, гэтаму маргіналізму спрыяла і такая рыса, як значная прысутнасць, на думку С. Александровіча, у прыватнаўласніцкіх пасяленнях прышлых людзей, якія заахвочваліся, вербаваліся мясцовымі гаспадарамі абяцаннем абароны, патранажу. Местачкоўцы імкнуліся рознымі шляхамі падкрэсліць сваю адметнасць ад вяскоўцаў. Іх хатнія і гаспадарчыя пабудовы былі больш зграбныя, дабротныя, адзенне набліжалася да шляхецкага, капіравала яго — мужчыны насілі кунтушы, жупаны, жанчыны — камізэлькі, кабаткі, шубкі, падбітыя баранавым, лісіным, заечым футрам, высокія боты на жалезных падковах; хаця летам сярэднезаможныя мужчыны хадзілі босыя. З характэрнага жаночага адзення жыхарак мястэчка можна адзначыць арыгінальныя рагатыя галаўныя ўборы.

Спецыфіку местачковага быту дыктавала сама архітэктура мястэчка з плошчай у цэнтры, да якой ішлі зрэдку брукаваныя вуліцы, з вялікай колькасцю крам, карчмой, храмамі розных канфесій, зрэдку сядзібай шляхціца ці ратушай. Цэнтрам грамадскага быту была карчма, дзе адбываліся сходы, суды, а таксама бавіўся вольны час — ладзіліся танцы, з другой паловы XVIII ст.— гульня ў карты. Пасля з'яўлення ў XV ст. у карчме, акрамя піва і мёду, гарэлкі, падзеі карчомнага жыцця часцей пачалі заканчвацца бойкай, судом.

Увогуле, жыццё і быт мястэчка залежалі ад яго памераў, значнасці — былі мястэчкі з магдэбургскім правам, ратушай і вежаю ( Краслаўка), а былі звычайныя вялікія вёскі з правам на торг і кірмашы, жыццё якіх не надта адрознівалася ад вясковага.

Галоўная роля мястэчак — лакальна-камунікацыйная як гандлёва-рамесніцкіх, адміністрацыйных, рэлігійных цэнтраў, прычым іх спецыялізацыя, што ўсталявалася ў час узнікнення і першаснага перыяду жыццядзейнасці, праіснавала да XIX ст. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай мястэчкі зрабіліся пераважна яўрэйскімі пасяленнямі, аднак да

пачатку XX ст. былыя мястэчкі захавалі спецыялізацыю, у тым ліку і этнічную, працоўнай дзейнасці.

Такім чынам, у дадзены перыяд старабеларускія гарады і мястэчкі прайшлі складаны гістарычны шлях. Культурнае, у тым ліку і бытавое жыццё горада двойчы істотна было дэструктуравана ваеннымі катаклізмамі, гарады і мястэчкі з канца XVIII ст. пачалі мяняць этнакультурную прыналежнасць. Разам з тым мы можам казаць аб існаванні канцэптуальна акрэсленых паняццяў бытавой культуры старабеларускага горада. Больш таго, як ужо адзначалася, дадзены перыяд быў апошнім на працягу доўгага гістарычнага часу (амаль да сярэдзіны XX ст.), калі мы можам ідэнтыфікаваць адносна якасную, тыпалагічна выразную бытавую культуру менавіта беларускага горада як часткі еўрапейскай гарадской цывілізацыі. Яе дынаміка знаходзілася ў кантэксце еўрапейскіх эпахальна-стылявых плыней,— у першую чаргу культуры барока, а таксама дэмакратычных буржуазных адносін. У далейшым гістарычным часе беларускі горад, мястэчка пазбавіліся адметных рыс, у першую чаргу магдэбургскага права, самастойнага статусу, пачалі засяляцца чыноўнікамі з Расіі, яўрэйскімі перасяленцамі.

# ЛІТАРАТУРА


1. Археалогія Беларусі. Помнікі XIV—XVIII стст. Мн., 2001. Т. 4.
2. Белы Алесь. In iaudem cerevisiae (На хвалу піва) // Спадчына. 2000. № 1.
3. Быт белорусских крестьян // Этнографический сборник. СПб., 1854. Вып. 2.
4. Вуглік І. Р. Сялянская сям'я ў XVII—XVIII стст. // Маладосць. 2004. № 4.
5. Вуглік І. Р. Шляхецкая бяседа // Маладосць. 2004. № 8.
6. БНТ. Вяселле. Абрад. Мн., 1978.
7. Геранім Фларыян Радзівіл. Мэмуары. Прадм. і пер. Вацлава Арэшкі // Спадчына. 2000. № 3.
8. Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1.
9. Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI—XVIII стст. Мн., 1992.
10. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. Мн., 1990.
11. Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVII—XVII вв. (социально-экономическое исследование развития городов). Мн., 1975.
12. Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь: Нарыс. Мн., 1980.
13. Дадиомова О. В. Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII в. Мн., 1992.
14. Дорошевич Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971.
15. Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии. М., 1954.
16. Живописная Россия. СПб., 1901. Т. 4. Ч. 1.
17. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. Мн., 1977.
18. Идеи материализма и диалектики в Белоруссии. Мн., 1980.
19. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв. Владение Сморгонь. Мн., 1977.
20. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII—XVIII вв. Владение Тимковичи. Мн., 1982.
21. Касмылёў В. Двубой // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 2.
22. Козловский П. Г. Землевладение и землепользование Белоруссии в XVIII — первой половине XIX в. Мн., 1982.
23. Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII—XVIII в. Мн., 1969.
24. Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1966.
25. Кулагин А. Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Мн., 1981.
26. Кулагин А. Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии. Мн., 1989.
27. Локотко А. И. Белорусское народное зодчество. Мн., 1991.

28. Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. Мн., 1987.
29. Мальдзіс А. І. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. Мн., 2001.
30. Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. М., 1980.
31. Мараш Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии. Мн., 1971.
32. Мейер А. Описание Кричевского графства. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі НАН Беларусі. МФ 72.
33. Мелешко В. И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII—XVIII в. Мн., 1982.
34. Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII—XVIII в.). Мн., 1975.
35. Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры белорусов XVI—XVIII вв. Мн., 1981.
36. Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. Мн., 1968.
37. Оссовская М. Рыцарь и буржуа. Исследование по истории морали. М., 1987.
38. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии. Мн., 1973.
39. Падокшын С. А. Роля антычных традыцый у развіцці культуры і грамадскай думкі на Беларусі ў XVI—XVII стст. // Беларуская літаратура. 1977. Вып. 5.
40. Пільштынава С. А. Авантуры майго жыцця. Мн., 1993.
41. Пичета В. И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии. М., 1928.
42. Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы XVI—XVIII вв. Львов, 1957.
43. Сагановіч Г. Невядомая вайна 1654—1667. Мн., 1995.
44. Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV—XVI вв.). Мн., 1993.
45. Ткачев М. А. Замки Белоруссии. Мн., 1987.
46. Трэпет Л. В. Там, дзе гучалі паланэзы. Мн., 1990.
47. Трусаў А. А. Матэрыяльная культура беларускага горада ў часы ВКЛ // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 3.
48. Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мн., 1990.
49. Федорук А. Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989.
50. Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мн., 1996.
51. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мн., 1985.
52. Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Мн., 1985. Т. 1.
53. Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст. Мн., 1978.
54. Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло: XIX — пачатак XX ст. Мн., 1984.

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ . . . 3

**МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА . . . 5**

1. ЖЫЛЛЁ . . . 5

1.1. Шляхецкае жыллё . . . 5

*1.1.1. Замкі . . . 6*

*1.1.2. Палацы і вялікія сядзібы . . . 7*

*1.1.3. Сядзібы . . . 11*

*1.1.4. Садова-паркавае мастацтва . . . 12*

1.2. Сялянскае жыллё . . . 14

*1.2.1. Генезіс характэрных рыс традыцыйнага жылля . . . 14*

*1.2.2. Пасяленні і сядзібы . . . 15*

*1.2.3. Хата . . . 18*

1.3. Жыллё гараджан . . . 22

2. АДЗЕННЕ . . . 24

2.1. Адзенне шляхты . . . 24

*2.1.1. Мужчынскае адзенне . . . 25*

*2.1.2. Шляхецкая шабля . . . 27*

*2.1.3. Жаночае адзенне . . . 30*

2.2. Сялянскае адзенне . . . 31

*2.2.1. Жаночае адзенне . . . 32*

*2.2.2. Мужчынскае адзенне . . . 35*

2.3. Адзенне гараджан . . . 36

3. ЕЖА . . . 38

3.1. Шляхецкая ежа . . . 38

*3.1.1 Аздабленне стала . . . 39*

*3.1.2. Рытуал . . . 41*

*3.1.3. Ежа . . . 43*

3.2. Ежа сялян . . . 46

*3.2.1. Сельскагаспадарчая тэхніка . . . 46*

*3.2.2. Ежа сялян . . . 48*

3.3. Ежа гараджан . . . 50

**СЯМЕЙНЫ І ГРАМАДСКІ БЫТ . . . 52**

4. СЯМ'Я І СЯМЕЙНЫ БЫТ . . . 52

4.1. Шляхецкая сям'я . . . 52

*4.1.1. Выхаванне дзяцей . . . 52*

*4.1.2. Шлюб . . . 55*

*4.1.3. Сямейныя адносіны . . . 56*

4.2. Сялянская сям'я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
*4.2.1. Структура сям'і.* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . *59*
*4.2.2. Выхаванне дзяцей* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . *61*
*4.2.3. Шлюб* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . *62*
*4.2.4. Сямейныя адносіны* . . . . . . . . . . . . . . . . . . *67*
4.3. Гарадская сям'я . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
5. ГРАМАДСКІ БЫТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
5.1. Грамадскі быт шляхты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
*5.1.1. Характэрныя формы грамадскага быту* . . . . . . . . *72*
*5.1.2. Мілітарысцкі аспект шляхецкага быту* . . . . . . . . *76*
*5.1.3. Асветніцкія, эпісталярныя плыні быту* . . . . . . . . *79*
*5.1.4. Гістарычныя змены быту* . . . . . . . . . . . . . . . *83*
5.2. Грамадскі быт сялян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
*5.2.1. Характэрныя рысы грамадскага быту* . . . . . . . . *88*
*5.2.2. Абрадавыя формы грамадскага быту* . . . . . . . . . *92*
5.3. Грамадскі быт гараджан . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
*5.3.1. Характэрныя формы грамадскага быту* . . . . . . . . *98*
*5.3.2. Падзейны від грамадскага быту* . . . . . . . . . . . *103*
*5.3.3. Каляндарна-святочны пласт грамадскага быту* . . . *105*
*5.3.4. Быт мястэчка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . *107*
ЛІТАРАТУРА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111

Вучэбнае выданне

**Вуглік** Ігар Рыгоравіч

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА І БЫТ БЕЛАРУСАЎ XVII—XVIII стст.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

*Рэдактар* В. М. Захарэвіч
*Тэхнічнае рэдагаванне*
*і камп'ютэрная вёрстка* В. І. Малашэвіча

Падпісана ў друк 05.05.05. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура *Арыял*.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 6,6. Ул.-выд. арк. 8,5. Тыраж 350 экз. Заказ 5.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
ЛИ № 02330/0133496 ад 01.04.04.
ЛП № 02330/0131508 ад 30.04.04.
220050, Мінск, Савецкая, 18.



ISBN 985-435-955-7

9 789854 359557